Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

30 ЛІПЕНЯ 2016 г. СУБОТА № 145 (28255)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Як падманваюць пенсіянераў?

СТАР. 6

Віртуальны лекар

СТАР. 12

Усё, што трэба ведаць пра плёткі

СТАР. 21

ТРЭБА ШЫРЭЙ ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ ФЕРМЕРАЎ

Прэзідэнт лічыць, што з прыватнікам часам нават прасцей працаваць, чым з дзяржаўным упраўленцам

Фота БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка ажыццявіў учора рабочую паездку ў Мінскую вобласць, у ходзе якой азнаёміўся з развіццём у краіне фермерскіх гаспадарак. Як паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара, у Лагойскім раёне кіраўнік дзяржавы наведаў сялянскую фермерскую гаспадарку «Цнянскія экапрадукты», якая спецыялізуецца на вырошчванні бульбы і збожжавых. У гаспадарцы выкарыстоўваюцца сучасныя тэхналогіі захоўвання і перапрацоўкі бульбы, што дазваляе ўпэўнена рэалізоўваць прадукцыю на ўнутраным і знешнім рынках.

Прэзідэнту таксама ў час паездкі расказалі аб практыцы рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі па развіцці фермерскіх гаспадарак і ўказа ад 4 ліпеня 2016 года №253 «Аб мерах па фінансаваму аздараўленню сельскагаспадарчых арганізацый».

Размова таксама ішла аб ходзе ўборачнай кампаніі ў Беларусі ў цэлым і Мінскай вобласці ў прыватнасці, кіраўніку дзяржавы прадэманстравалі перспектыўную сельскагаспадарчую тэхніку.

Падчас наведвання фермерскай гаспадаркі «Цнянскія экапрадукты», кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў справе аднаўлення нерэнтабельных або нізкарэнтабельных сельгаспрадпрыемстваў трэба ў тым ліку арыентавацца на фермераў.

СТАР. 2

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ЦЕРАХАЎ, міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі:

«У краіне цяпер актыўна вядуцца работы па развіцці сістэмы раздзельнага збору адходаў. І хоць, згодна з вынікамі маніторынгаў, многія грамадзяне пакуль не гатовыя адмовіцца ад смеццеправодаў і ўзвядзення дамоў без гэтых традыцыйных збудаванняў, з людзьмі трэба весці тлумачальную работу. Адмова ад смеццеправодаў і раздзельны збор другасных рэсурсаў — гэта змяншэнне тарыфаў на вываз і ўтылізацыю адходаў».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 30.07.2016 г.

Долар ЗША		1,9958 ▲
Еўра		2,2141 ▲
Рас. руб.		0,0297 ▼
Укр. грыўня		0,0804 ▲

ISSN 1990 - 763X

16145

9 771990 763008

■ Вучнёўскі дрэс-код

ШАКАЛАДНЫ ПІНЖАК І БЛУЗА З ЖАБО

Разам з бацькамі ацэньваем асартымент школьнай формы

Фота Надзеі БУЖАН.

У шосты клас Ангеліна МАЗІЦКАЯ пойдзе ў новай форме. Вызначыцца з выбарам ёй дапамагаюць мама Вольга і сястра Каця.

Да навучальнага года застаўся месяц. Некаторыя бацькі, каб не бегаць у спешцы ў апошнія дні перад лінейкай, пачалі ўжо падбіраць дзецям школьную форму. Ці задавальняе іх сёлетні асартымент? У колькі абыдзецца апрануць вучня на заняткі? І якой бачаць школьную форму самі дзеці?

СТАР. 9

■ Сацыяльны клопат

СА ЖНІЎНЯ ВЫРАСТУЦЬ ВЫПЛАТЫ НА ДЗЯЦЕЙ

З наступнага месяца дапамога па доглядзе за дзецьмі да трох гадоў стане большай на 7-9,5 рубля. Мамы, якія выхоўваюць першынца, будуць атрымліваць у месяц 252,4 рубля, тыя, хто сядзіць дома з другім ці трэцім малым, — па 288,4 рубля. На дзіця з інваліднасцю будуць выдаткоўваць 324,5 рубля.

Такія сумы выплат устанаўліваюцца да пачатку лістапада.

Памер дапамогі па доглядзе за дзецьмі да трох гадоў залежыць ад сярэдняга заробку па краіне. Паколькі ў мінулыя тры месяцы зарплата беларусаў падрасла (сярэднестатыстычны работнік атрымліваў 721 рубель), то і выплаты павысілі. Штомесячная дапамога на першае дзіця разлічваецца ў памеры 35 працэнтаў ад заробку па краіне за квартал, на другога і наступных складае 40 працэнтаў, на сына ці дачку з інваліднасцю — 45 працэнтаў.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ. *lubneuskaya@zviazda.by*

ТРЭБА ШЫРЭЙ ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ ФЕРМЕРАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«У нас трэць ці чвэрць гаспадарак, з якімі вы, дзяржаўныя ўласнікі, не спраўляецеся. Ну дык трэба шырэй выкарыстоўваць фермераў. Але гэта не павінна быць бяздумна. У дзяржавы заўсёды павінна быць жорсткая падушка бяспекі, — заявіў Прэзідэнт. — У нас ёсць добрыя фермеры, якія сябе зарэкамендавалі. Хочуць — аддайце лепш ім. І не спяшайцеся аддаваць замежнікам. А калі аддаяце, то жалезабетонна — пад умовы. Сяло у нас выходзіць на нармальны ўзровень развіцця. Нельга страціць кіраванне ў сельскай гаспадарцы».

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што з прыватнікам часам нават прасцей працаваць, чым з дзяржаўным кіраўніком. «Але трэба бачыць эфектыўнасць, харчовую бяспеку дзяржавы. Хіба прыватнікі выцягнулі б сяло 10 гадоў таму, калі мы стваралі праграму?» — адзначыў беларускі лідар.

Ацэньваючы дасягнутыя ў фермерскай гаспадарцы вынікі, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў выключную важнасць наяўнасці граматнага кіраўніка, які можа належным чынам арганізаваць працоўны працэс. Прэзідэнт у сувязі з гэтым патрабуе больш актыўна выкарыстоўваць вопыт такіх людзей для падрыхтоўкі перспектыўных кіруючых кадраў. «Калі няма кіраўніка — ніколі не будзе гаспадаркі, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Ёсць нармальныя людзі, і ім трэба аддаваць зямлю. Няхай працуюць».

«Трэба падумаць аб нейкім холдынгу, некалькіх гаспадарках. Думаю, адсюль ужо 2-3 чалавекі кіраўнікоў знойдзецца. Калі гатовы паўтарыць у іншых гаспадарках тое, што маецца, — скажы», — адзначыў Прэзідэнт, звяртаючыся да кіраўніка фермерскай гаспадаркі Уладзіміра Адамовіча.

«Не трэба гэтага баяцца. Ён можа ўзяць тры-чатыры, можа, пяць гаспадарак. Нават у розных галінах. Калі ў яго ёсць жаданне і грошы. Галоўнае, каб былі такія кіраўнікі, якія ведаюць і мінулае, і сучаснасць», — упэўнены беларускі лідар.

Асаблівы акцэнт кіраўнік дзяржавы зрабіў на неабходнасці падтрымкі мясцовага насельніцтва з боку кіраўніцтва сельгаспрадпрыемстваў, незалежна ад формы ўласнасці. У перспектыве дзяржава будзе падтрымліваць як прыватнікаў, так і дзяржаўнікаў выключна зыходзячы з гэтага фактару. «Бізнес бізнесам. Працуйце. Не будзем перашкаджаць, дашліфуем заканадаўства. Але вы іх павінны бачыць, гэта вашы людзі. Тады мы будзем вас падтрымліваць. Мы ў гэтым плане возьмем потым ухіл. Зараз мы падтрымліваем нават вытворчасць, каб вы ўсталі на ногі, — сказаў Прэзідэнт. — А потым мы, дзяржава, будзем займацца сацыяльнымі пытаннямі, пытаннямі інфраструктуры, а вы — вытворчасцю. Але вас будзем падтрымліваць за тое, што вы па-чалавечы ставіцеся да людзей, якія жывуць у вёсках на вашай тэрыторыі».

Прэзідэнту далажылі аб рэалізацыі інвестпраекта па пашырэнні сельгасвытворчасці і інвесціраванню ў развіццё ААТ «Косіна». У 2015 годзе са згоды кіраўніка дзяржавы акцыі ААТ «Косіна» былі бязвыплатна перададзены з уласнасці Лагойскага раёна ва ўласнасць КФГ «Цнянскія экапрадукты», заключаны адпаведны інвестыцыйны дагавор. Усе дамоўленасці паспяхова выконваюцца, гаспадарка ўстойліва працуе, развіваецца, ствараюцца новыя працоўныя месцы.

Аляксандр Лукашэнка таксама азнаёміўся з арганізацыяй захоўвання, перапрацоўкі агародніны, бульбы і падрыхтоўкі камбікармоў, выставай прадукцыі, што вырабляецца на прадпрыемстве, і сучаснай тэхнікі, якая выкарыстоўваецца ў гаспадарцы.

Аляксандр Лукашэнка даручыў нарасціць тэмпы ўборачнай. «Час выходзіць на намалот пад 500 тысяч тон у дзень. Каб за два — два з паловай дні мы мільён малацілі», — сказаў Прэзідэнт.

«Ужо пайшла масавая ўборка. На сённяшні дзень убрана больш за 30% збажыны. Намалочана 2 млн 330 тыс. т, — далажыў віцэ-прэм'ер Міхаіл Русы. — За ўчарашні дзень намалацілі прыкладна 340 тысяч тон».

Падчас рабочай паездкі таксама абмяркоўваліся закупачныя цэны на сельгаспрадукцыю, вытворчасць асобных відаў сельскагаспадарчых культур, нарыхтоўка кармоў, выкананне даручэнняў кіраўніка дзяржавы па развіцці вытворчасцей цукру і шэраг іншых пытанняў у сферы эфектыўнага гаспадарання на зямлі.

Аляксандр Лукашэнка, у прыватнасці, нагадаў аб патрабаванні больш актыўна выкарыстоўваць арганічныя ўгнаенні. «Не разлічвайце, што мы будзем купляць за валюту ўгнаенні. Трэба ўносіць больш арганікі», — адзначыў Прэзідэнт.

■ Выбары-2016

ВАЖНАЯ НЕ АПАЗІЦЫЙНАСЦЬ, ВАЖНЫ АЎТАРЫТЭТ

Участковыя камісіі сфарміраваны, завяршаецца працэс вылучэння кандыдатаў

27 ліпеня завяршыўся працэс утварэння ўчастковых выбарчых камісій, у іх увайшло 65 857 прадстаўнікоў розных палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў, грамадзян, працоўных калектываў. Пры гэтым 71,2% з ліку членаў камісій — жанчыны, прадстаўнікоў палітычных партый у камісіях 5,2%.

Ацэньвалі асобу ў цэлым

Лідзія ЯРМОШЫНА на прэс-канферэнцыі ў пятніцу паведаміла, што пры ўключэнні кандыдатур у склад камісій ацэньвалася характарыстыка асобы ў цэлым: палітычныя і маральныя якасці, месца чалавека ў грамадстве, сацыяльны аўтарытэт.

— Чаму ў дачыненні да тых ці іншых прадстаўнікоў апазіцыйных партый прымаюцца рашэнні, якія не задавальняюць іх? — задалася пытаннем старшыня Цэнтрвыбаркама. — Гэта ўсё залежыць ад людзей, якія ўваходзяць у тыя ці іншыя партыі. Часцей за ўсё задавальняюцца заяўкі беларускай партыі левых «Справядлівы свет», таму што гэта, як правіла, людзі, якія даўно і добра «ўманціраваны» ў грамадства і карыстаюцца аўтарытэтам. Калі чалавек не працуе, калі ён не валодае нейкай станоўчай характарыстыкай у рэгіёне, то ўсё гэта разглядаецца не з улікам яго апазіцыйнасці, а з улікам асобы, яго асобасных характарыстык.

Назіральнікі едуць

— Як заўсёды ў нашай краіне выбары праходзяць галосна і пры шырокім назіранні, — канстатавала старшыня Цэнтрвыбаркама. — У Цэнтральнай камісіі акрэдытавана 8 прадстаўнікоў палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў у якасці нацыянальных назіральнікаў. Прычым пяцёра з гэтых васьмі прадстаўляюць беларускія апазіцыйныя партыі і рухі. Сёння апошні пратакол, які я бачыла і падпісала, — гэта пратакол вылучэння прадстаўніка беларускай партыі левых «Справядлівы свет». Акрамя гэтага, у Цэнтральнай камісіі акрэдытавана 193 міжнародныя назіральнікі.

Акрэдытавана 142 назіральнікі ад Садружнасці Незалежных Дзяржаў і 51 назіральнік ад Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (БДІПЧ АБСЕ). Місія БДІПЧ АБСЕ, дарэчы, прыязджае ў краіну 31 ліпеня, гэта значыць ужо ў гэтую нядзелю, і на 2 жніўня ў Цэнтральнай камісіі прызначана сустрэча з кіраўніцтвам місіі.

Фота БЕЛТА.

Конкурс будзе расці

Старшыня ЦВК нагадала, што 1 жніўня — апошні дзень здачы дакументаў аб вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты.

— Па стане на 28 ліпеня вылучана 263 кандыдаты. Калі казаць пра конкурс, то ў сярэднім па краіне ён складае зараз больш за 2 чалавекі на месца. З вылучаных кандыдатаў 70 чалавек —жанчыны. Грамадзян ва ўзросце да 30 гадоў, гэта значыць моладзі — 28 чалавек. 16 чалавек з'яўляюцца дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў цяперашняга склікання, дэпутатаў мясцовых саветаў сярод вылучаных 31.

Кіраўнік ЦВК выказала меркаванне, што ў бліжэйшыя дні будзе паступаць вялікая колькасць дакументаў аб вылучэнні, паколькі набліжаецца крайні тэрмін іх падачы.

***

Вольга КЛІМЯНКОВА, старшыня акруговай выбарчай камісіі Магілёўскай — Цэнтральнай выбарчай акругі №85, удзельнічае ў выбарчых кампаніях не першы год.

— Назіраецца вялікая актыўнасць парламенцкай кампаніі, — кажа яна. — У нашай акрузе зарэгістравана 7 ініцыятыўных груп. Іншымі словамі, на 1 месца можа прэтэндаваць 7 кандыдатаў. З іх 5 беспартыйныя і 2 члены партыі. На 28 ліпеня ў камісіі паступілі дакументы на вылучэнне трох кандыдатаў: двух ад працоўных калектываў і аднаго ад беларускай партыі левых «Справядлівы свет». Але да 1 жніўня яшчэ ёсць час вылучыцца ў кандыдаты. Мы прымаем дакументы да разгляду да 19 гадзін.

Столькі ж ініцыятыўных груп зарэгістравана ў Магілёўскай — Кастрычніцкай акрузе №86. Акрамя гэтага на разглядзе ў камісіі знаходзяцца дакументы яшчэ на дзвюх асоб, якія збіраюцца балатавацца ў якасці кандыдатаў ад палітычных партый — Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці і БНФ.

Агульная колькасць выбаршчыкаў як па 85-й выбарчай акрузе, так і па 86-й складае прыкладна 66 тысяч. На тэрыторыі выбарчай акругі № 85 створана 39 участковых камісій. У акружной камісіі зарэгістравана 6 назіральнікаў з Магілёва, і яе ўжо наведалі 2 міжнародныя.

Сёлета будучым кандыдатам у дэпутаты прадстаўлены вялікі выбар месцаў для правядзення агітацыі, за выключэннем найбольш стратэгічных пляцовак. Яны пералічваюцца на сайтах рай- і гарвыканкамаў. Зараз паўсюдна вядзецца збор подпісаў у падтрымку вылучэння кандыдатаў.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі Горацкай выбарчай акругі №82 Леанід ЯГОРАНКА паведаміў, што на 28 ліпеня на тэрыторыі акругі адбылося 12 пікетаў. Неабходную колькасць галасоў пажадалі сабраць 5 чалавек.

— Усе пікеты праводзіліся ў адпаведнасці з заканадаўствам, ніякіх парушэнняў выяўлена не было, — паведаміў Леанід Ягоранка.

Ён таксама нагадаў, што ў Горках забаронена збіраць подпісы ў раёне аўта- і чыгуначнага вакзалаў, паліклінікі і цэнтральнай плошчы перад райвыканкамам.

У Магілёве падлік пікетаў не вядзецца, але члены акруговых камісій могуць у любы момант праверыць, ці ёсць там нейкія парушэнні.

— Асабіста бачыў пікеты каля гандлёвых цэнтраў «Прэстан», «Е-Сіці», на вуліцы Астроўскага — было цікава падысці, паглядзець, як яны працуюць, — кажа **старшыня акруговай выбарчай камісіі Магілёўскай — Кастрычніцкай акругі №86 Аляксандр КАЖАМЯКІН.** — Асобы, якія знаходзіліся на пікетах, мелі пры сабе дакументы, якія пацвярджаюць, што яны сапраўды з'яўляюцца членамі ініцыятыўных груп.

— Мы, як і любыя выбаршчыкі, цікавімся, падыходзім — дадае Вольга Клімянкова. — Агітацыя за канкрэтных кандыдатаў пачнецца пасля рэгістрацыі, пакуль прэтэндэнты на ўдзел у выбарах маюць магчымасць паведамляць толькі свае біяграфічныя звесткі. Выбаршчык можа падпісацца за ўсіх прэтэндэнтаў, каб у тых была магчымасць вылучыцца, а вось голас аддасць толькі за аднаго.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
zigulya@zviazda.by
Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

■ Моладзь без межаў

Дыялог Бе-La-Русаў

Днямі ў лагеры «Бе-La-Русь», што ўжо 25-ы раз працуе на мяжы Беларусі, Латвіі і Расіі, прайшлі дэбаты ў фармаце «Адкрытага дыялогу».

Лідары Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, маладзёжных арганізацый суседніх краін абмеркавалі тэму «Моладзь і палітыка». Сярод іншага закраналіся пытанні палітычнай актыўнасці маладога пакалення, найбольш запатрабаванай моладдзю ідэалогіі, недапушчэння росту папулярнасці радыкальных і экстрэмісцкіх груп і рухаў, прадстаўлення інтарэсаў маладых у органах улады, у тым ліку парламенце, праблема «бацькоў і дзяцей» у палітыцы і многія іншыя.

Як адзначаюць арганізатары, тэмы, пытанні, праблемы і прапановы, агучаныя падчас адкрытага дыялогу, могуць сфарміраваць новы вектар міжнароднага маладзёжнага супрацоўніцтва як з боку грамадскіх фарміраванняў, так і органаў дзяржаўнай улады, прыдаць новы імпульс у рабоце з моладдзю.

Праект БРСМ «Адкрыты дыялог» стартаваў як дыскусійная пляцоўка, якая дае маладым магчымасць уздымаць самыя вострыя праблемы і задаваць хвалюючыя пытанні прадстаўнікам органаў улады, палітыкам, прадпрымальнікам, грамадскім дзеячам. З цягам часу праект набыў маштаб сапраўднага грамадскага руху. Дэбаты праходзілі ва ўсіх рэгіёнах Беларусі і сталі формай прамога кантакту ўлады і грамадзян, інструментам развіцця грамадзянскай супольнасці ў краіне.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

Фота БЕЛТА.

■ Грошы

Якія выплаты зменяцца з наступнага месяца?

З 1 жніўня па 31 кастрычніка дзейнічае новы бюджэт пражыткавага мінімуму — 175 рублёў 50 капеек (на 6 рублёў больш, чым у мінулым квартале). Для працаздольнага насельніцтва БПМ складзе 193,6 рубля, для пенсіянераў — 134,4, для студэнтаў — 170,5. Памер бюджэту для дзяцей да трох гадоў вырасце да 112 рублёў, для малых ад трох да шасці гадоў — амаль да 156 рублёў, для ўзросту 6-18 гадоў — да 191,5 рубля. Адпаведна змяняюцца і некаторыя выплаты, якія залежаць ад памеру гэтага нарматыву.

Дапамогі на дзяцей

Дапамога пры нараджэнні першынца павялічыцца да 1755 рублёў (гэта 17,5 мільёна недэнамінаваных). Пры з'яўленні другога і наступнага дзіцяці бацькі атрымаюць амаль 2,5 тысячы — на 79 рублёў (ці 790 «старых» тысяч) больш, чым было дагэтуль. Жанчынам, якія сталі на ўлік у дзяржаўныя арганізацыі аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці, будуць плаціць 175,5 рубля. Крыху павялічацца таксама выплаты для сем'яў, якія адначасова выхоўваюць малога да трох гадоў і дзіця ва ўзросце ад 3 да 18. Ім штомесяц будуць налічваць амаль па 88 рублёў.

Пенсіі і надбаўкі за ўзрост

Мінімальная працоўная пенсія і надбаўкі за ўзрост павялічацца на 3,3 працэнта. Пажылым, якім споўнілася 75 гадоў, будуць даплачваць да пенсіі амаль па 33 рублі, тым, каму за 80, — па 44 рублі. Вырастуць сацыяльныя пенсіі. Сума штомесячных выплат для інвалідаў 3-й групы складзе 131,6 рубля, для 2-й групы — 149 рублёў (для інвалідаў з дзяцінства на 9 рублёў больш), для 1-й групы — 193 рублі. Сацыяльная пенсія па страце карміцеля на кожнае дзіця са жніўня будзе раўняцца 149 рублям.

Выплаты на бізнес

Беларусы, якія хочуць адкрыць сваю справу, могуць разлічваць на субсідыю ў 1930 рублёў (19,3 мільёна да дэнамінацыі). Тым, хто збіраецца ладзіць бізнес у сельскай мясцовасці, будуць выдаткоўваць па 2,6 тысячы. А пры арганізацыі прадпрымальніцтва з укараненнем навукова-тэхнічных распрацовак вас падтрымаюць на 3,5 тысячы рублёў.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

■ Спорт-тайм

ПРЫГОЖЫМІ БЫЛІ ТОЛЬКІ НУЛІ?

Нашы клубы згулялі ўнічыю ў матчах 3-га кваліфікацыйнага раўнда Лігі Еўропы

У Жодзіне футбалісты «Тарпеда-БелАЗ» прымалі адзін з самых вядомых аўстрыйскіх клубаў — венскі «Рапід» і завяршылі сустрэчу ўнічыю 0:0. Госці дамінавалі на працягу ўсяго матча і нанеслі 14 удараў па варотах, але ўсе яны аказаліся не выніковымі.

— У цэлым, для двухраўндавай барацьбы атрымаўся добры вынік. Наш сапернік — гэта хуткая, тэхнічная каманда. У аўстрыйцаў добры кантроль мяча, але за яго не даюць тры ачкі. У завяршальнай фазе мы не далі вынікова згуляць гасцям, — адзначыў **настаўнік жодзінскага клуба Ігар КРЫВУШЭНКА.**

Футбалісты мінскага «Дынама» таксама згулялі ўнічыю ў гасцявой сустрэчы 3-га кваліфікацыйнага раўнда Лігі Еўропы. У Нові-Садзе яны сустрэліся з сербскай «Вайводзінай». Госці прапусцілі гол на 29-й хвіліне і доўга не маглі зраўняць лік. Толькі ў канцы паядынку Яўген Буднік, які выйшаў на замену, аднавіў раўнавагу ў ліку — 1:1.Сустрэчы ў адказ адбудуцца 4 жніўня.

Нагадаем, раней барысаўскі БАТЭ ў стартавым паядынку 3-га круга кваліфікацыі адолеў на сваім полі футбалістаў з ірландскага «Дандолка» з мінімальным лікам 1:0. Паядынак барысаўчан у адказ адбудзецца 2 жніўня ў Дандолку.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.
lobazhevich@zviazda.by

АРТ-ФУТБОЛ У ЧАВУСАХ

Кожнаму, каму стала цікава, што можа быць агульнага паміж музыкай і футболам, трэба пабываць у гэтую суботу ў Чавусах. На гарадскім стадыёне магілёўскія артысты «Днепр-STARS» спачатку згуляюць у «Арт-футбол» з прадстаўнікамі мясцовай улады, а потым дадуць вялікі канцэрт. Гледачоў гэтага захапляльнага спартыўна-музычнага шоу чакае сустрэча з зоркамі магілёўскай эстрады Пашам Любчанкам, Алекшам Чорным, шоу-дуэтам «Про-баян», фіналісткай адборачнага тура міжнароднага дзіцячага конкурсу «Еўрабачанне» Вольгай Канавалавай.

Як паведамілі ў аддзеле па ідэалагічнай рабоце, культуры і па справах моладзі Чавускага райвыканкама, мерапрыемства прысвячаецца Году культуры і прапагандуе спорт.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

■ Шпацыр па Камароўцы

АБРЫКОСЫ ПА ЦАНЕ ЧАРНІЦ, ГАРБУЗЫ — ПА РУБЛЮ ЗА КГ

Якія ягады на рынку самыя дарагія і самыя танныя?

Лета ў самым разгары. У такую спёку хочацца харчавацца толькі ягадамі і садавінай. Наколькі жывыя вітаміны аблегчаць кашалёк?

Нектарыны, персікі ды абрыкосы — гэта, бадай, «героі» сезона. Якія хочаш: і па памерах, і па колеры, і па «кандыцыі». Вядома ж, яны адрозніваюцца і па цане. Напрыклад, персікі з Македоніі аддаюць па 3 рублі 80 капеек, грэчаскія — за 4 рублі, а кілаграм крымскіх каштуе ажно 4 рублі і 50 капеек. Нектарыны з Іспаніі і Грузіі больш «дружныя», ідуць прыкладна ў адной цанавой планцы, якая не перавышае 4 рублі. Сярэдні кошт абрыкосаў складае 3 рублі 50 капеек.

Што цікава, куды даражэйшым выходзяць апельсіны: іх прапануюць па 4 рублі 50 капеек. Але хто шукае, той знойдзе неблагія плады па цане 1 рубель 80 капеек. Добра, што мы не бяром лімоны кілаграмамі: «кісляціна» ідзе ад 5 да 6 рублёў (дарэчы, для прахаладжальных напояў лімоны — сапраўдная знаходка). Але вернемся да ягад. На самую вялікую салодкую ягаду — кавун — устанавілася адна цана: рубель за кілаграм. За дыні давядзецца раскашэліцца. Паўсюль на прылаўках пазнакі «2 рублі» альбо «2 рублі 50 капеек» (за кілаграм, вядома ж).

Буякі — самая дарагая ягада на прылаўку. Ягады з лесу каштуюць 7 рублёў, з саду — 10-12 рублёў. Беларускія вішні каштуюць 4 рублі 50 капеек, а ўзбекскія чарэшні на рубель даражэйшыя. Паўлітровы слоік агрэсту каштуе 2 рублі 50 капеек. Лясныя чарніцы амаль утрымалі кошт з мінулага месяца — 3 рублі 20 капеек. Парэчкі ідуць па той жа цане. Кілаграм лясных малін стане вашым усяго за 9 рублёў. Слівы можна адшукаць за рубель і 30 капеек, хоць сярэдні кошт большы на 20 капеек.

Стаяць чэргі і па яблыкі — кіло польскіх грушавых каштуе 2 рублі 50 капеек. Чакаюць свайго пакупніка ківі — бяруць іх не вельмі ахвотна (кілаграм за 6 рублёў 50 капеек — цана аднаго плода авакада). Дадаўшы да гэтай сумы яшчэ два рублі, можна набыць кіло журавін альбо лісічак. Альбо паўлітра прыгожых, вялізных баравічкоў, якія так і просяцца на патэльню. У якасці альтэрнатывы заўжды ёсць вешанкі (5 рублёў за кіло) і шампіньёны (4 рублі за кіло).

Агуркі да летняй салаты знайшліся за рубель. А памідоры яшчэ давядзецца пашукаць, каб не пераплочваць. Сярэдні кошт на ўкраінскія і беларускія памідоры складае 2 рублі 30 капеек. Але ёсць і неверагодна дарагія таматы (дарэчы, беларускія): за кіло прадавец просіць не менш за 5 рублёў! Жоўтыя памідоры аддаюць па 4 рублі.

Баклажаны прадаюць па цане 1 рубель і 50 капеек. Прапануюць мясістыя балгарскія перцы па 2 рублі 50 капеек, але можна адшукаць і танней. Кіло маладой бульбы аблегчыць ваш кашалёк прыкладна на рубель. Буракі каштуюць 70 капеек, морква — рубель і 20 капеек, каляровая капуста — 2 рублі, пекінская — 2 рублі 50 капеек. Пучкі кропу, пятрушкі, зялёнай цыбулі, адзін перац чылі каштуюць 50 капеек, галоўка часнаку — 75 капеек.

Кацярына РАДЗЮК.
radziuk@zviazda.by

ЛІЧЫЛЬНІК «ЗВЯЗДЫ»

(цана за кілаграм, калі не пазначана іншае)

Сала салёнае — 10-12 р.
Свініна (кумпяк) — 7 р. 5 кап. — 10 р.
Свініна (рэбры) — 4 р. 24 кап.
Ялавічына (кумпяк) — 14 р.
Ялавічына (печань) — 5 р.
Цыляціна (кумпяк) — 18 р.
Кураня бройлернае — 3 р. 40 кап.
Індычка (фарш) — 7 р. 80 кап.
Бастурма — 20 р. 80 кап.
Паляндвіца — 20 р.
Кіндзюк — 23-26 р.
Каўбаса курыная — 7 р.
Бекон — 12 р.
Скумбрыя х/в — 15 р.
Селядзец слабасалёны — 5 р. 80 кап.
Яйка курынае Д-В (дзясятак) — 1 р. 60 кап.
Алей сланечнікавы рафінаваны (800 гр) — 2 р. 20 кап. — 2 р. 60 кап.
Грэчка (800 г) — 2 р. 24 кап. — 2 р. 70 кап.
Рыс доўгі (700 г) — 1 р. 10 кап.
Гарох колаты (700 г) — 1 р. 10 кап.
Фасоля чырвоная (800 г) — 3 р. 20 кап.
Грэцкі арэх ачышчаны — 15 р.
Арахіс смажаны — 8 р.
Курага — 20 р. — 24 р.

■ Весткі з Кітая

ПРЫЦЯГНЕННЕ ПАДНЯБЕСНАЙ

Напрыканцы першага асенняга месяца ў Кітаі адбудзецца сапраўды знакавая падзея. 20 верасня ў горадзе Дуньхуане, што ў правінцыі Ганьсу, адкрыецца міжнародная культурная выстава-кірмаш «Шаўковы шлях».

Як паведаміў удзельнікам Еўразійскага медыясемінара (журналісты з многіх краін свету зараз наведваюць шэраг рэгіёнаў Паднябеснай) сакратар КПК правінцыі Ганьсу Ван Саньюнь, свой удзел у мерапрыемстве ўжо пацвердзілі 58 краін.

Падчас правядзення выставы адбудзецца маштабная прэзентацыя ўнікальнай культуры старажытнай кітайскай цывілізацыі. Як вядома, з 6 тысяч кіламетраў Шаўковага шляху на тэрыторыю правінцыі Ганьсу прыпадае значная частка — 1,6 тыс. км. А цудоўны Дуньхуан, куды штогод прыязджаюць тысячы турыстаў, нездарма лічыцца жамчужынай на легендарным транспартным маршруце. Так што месца правядзення выставы было перадвызначана.

«Гэта мерапрыемства павінна з цягам часу стаць нацыянальным брэндам Кітая, — заўважыў Ван Саньюнь. — Яно мяркуецца як маштабная платформа для актыўнага ўзаемавыгаднага культурнага абмену. Транснацыянальны праект «Адзін пояс, адзін шлях» павінен злучыць транспартна-лагістычнымі сувязямі многія дзясяткі краін. Пры гэтым не менш важна, што будзе адбывацца культурны, гуманітарны абмен паміж краінамі і народамі. У гэтым кантэксце форум у Дуньхуане набывае асаблівае значэнне».

Мікалай ЛІТВІНАЎ. *litvinov@zviazda.by*

ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в дер. Напалки, дер. Белая Лужа, дер. Крутая Гора и дер. Глинище Жодинского сельсовета Смолевичского района Минской области

1.	**Форма проведения аукциона**	Открытый
2.	**Дата, время и место проведения аукциона**	**30 августа 2016 года в 10.00 г. Жодино, пер. Молодежный, 3 Жодинский сельисполком, кабинет №1**
3.	**Продавец и его адрес**	Жодинский сельский исполнительный комитет, г. Жодино, пер. Молодежный, 3
4.	**Земельный участок, его кадастровый номер и адрес**	**Лот № 1** – земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881708801000094 в деревне Напалки, участок № 2 **Лот № 2** – земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881701601000120 в деревне Белая Лужа, ул. Магистральная **Лот № 3** – земельный участок площадью 0,1478 га с кадастровым номером 624881708101000031 в деревне Крутая Гора, участок № 1 **Лот № 4** – земельный участок площадью 0,1497 га с кадастровым номером 624881708101000032 в деревне Крутая Гора, участок № 2 **Лот № 5** – земельный участок площадью 0,1499 га с кадастровым номером 624881708101000034 в деревне Крутая Гора, участок № 3 **Лот № 6** – земельный участок площадью 0,1499 га с кадастровым номером 624881708101000033 в деревне Крутая Гора, участок № 4 **Лот № 7** – земельный участок площадью 0,1206 га с кадастровым номером 624881704101000051 в деревне Глинище **Лот № 8** – земельный участок площадью 0,1298 га с кадастровым номером 624881704101000049 в деревне Глинище, участок № 1 **Лот № 9** – земельный участок площадью 0,1305 га с кадастровым номером 624881704101000050 в деревне Глинище, участок № 2
5.	**Условия продажи**	Без изменения целевого назначения
6.	**Целевое назначение земельного участка**	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома
7.	**Начальная цена продажи**	**Лот № 1** – 2500 рублей **Лот № 2** – 4000 рублей **Лот № 3** – 2500 рублей **Лот № 4** – 2500 рублей **Лот № 5** – 2500рублей **Лот № 6** – 2500 рублей **Лот № 7** – 5000 рублей **Лот № 8** – 5000 рублей **Лот № 9** – 5000 рублей
8.	**Условия проведения аукциона**	Участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Аукцион считается состоявшимся при наличии не менее двух участников
9.	**Наличие инженерной инфраструктуры**	**Лот № 2 (возможность электроснабжения)** **Лоты № 7, № 8, № 9 (возможность электроснабжения, газоснабжения)**
10.	**Сумма задатка и реквизиты продавца**	10% от начальной цены земельного участка, р/с 3641000000263 в филиале №616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, ул. 50 лет Октября, 25 «А», код 812, УНП 600023532 (с пометкой «Задаток за земельный аукцион»)
11.	**Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками**	каждую среду в 15.00
12.	**Окончательный срок приема заявлений**	**24 августа 2016 года** до 17.00
13.	**Контактные телефоны**	8-01775 35-449, 8-01775 37-174, 8-01775 37-189

Расходы по организации и проведению аукциона и затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Документ (копию), удостоверяющий личность (паспорт) покупателя, или его доверенного лица.
4. Доверенность, заверенную нотариально (в случае, если на аукционе интересы покупателя представляет это лицо).

ВАЙНА ПАД ГРЫФАМ «САКРЭТНА»

Афганская старонка савецкага перыяду дагэтуль багатая на «белыя плямы»

Два дзесяцігоддзі таму ў самым цэнтры старога Мінска, на штучным астраўку ракі Свіслач, з'явіўся Востраў мужнасці і смутку, больш вядомы ў народзе як «Востраў слёз». І сёння каля мемарыяла, прысвечанаму беларускім воінам-інтэрнацыяналістам, якія загінулі ў Афганістане, нярэдка ўбачыш заплаканыя вочы жанчын — для маці і ўдоў, якія не дачакаліся з той вайны сваіх сыноў і мужоў, афганскія падзеі не маюць тэрміну даўнасці...

У вайне, якая цягнулася амаль дзесяць гадоў, удзельнічалі больш як 30 тысяч грамадзян Беларусі. 771 воін-інтэрнацыяналіст загінуў у Афганістане. Больш як 700 удзельнікаў баявых дзеянняў, вярнуўшыся на радзіму, заўчасна пайшлі з жыцця — нагадалі аб сабе незагойныя раны і хваробы. 870 сталі інвалідамі, 12 зніклі без вестак, але іх пошукі працягваюцца.

У чым маюць патрэбу ветэраны афганскай вайны сёння і чаму многія падзеі больш як 25-гадовай даўнасці, хутчэй за ўсё, так і застануцца «белымі плямамі»? Пра гэта мы распыталі ў **старшыні савета Мінскай гарадской арганізацыі «Памяць» Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане Уладзіміра ШОКАВА**.

— Уладзімір Ільіч, Востраў мужнасці і смутку ўжо даўно стаў не толькі святым месцам для воінаў-інтэрнацыяналістаў і родных палеглых салдат. Сёння «Востраў слёз» — гэта на ўсіх узроўнях эпіцэнтр памяці аб вайне ў Афганістане...

— Рашэнне аб стварэнні помніка ў Мінску было прынята ў 1987 годзе. Яшчэ ішла вайна, але ўжо тады вырашылі ўвекавечыць памяць тых, хто не вярнуўся дадому. Ідэя належала кавалеру ордэна Чырвонай Зоркі і будучаму народнаму дэпутату СССР Паўлу Шацько. Сам воін-інтэрнацыяналіст, інвалід вайны, ён добра разумеў, што пра гэтую вайну павінна ведаць моладзь. Шмат жа што ў той час замоўчвалася, інфармацыя аб тых падзеях была практычна нулявая. Многія думалі, што ў Афганістане нашы воіны ледзь не саджаюць сады. Пра тое, што там гінуць людзі, доўгі час — ні слова. Многія салдаты пісалі сваім родным, што служаць у Манголіі ці дзесьці яшчэ. Калі з'явіліся першыя цынкавыя труны, схаваць шыла ў мяшку стала складаней. Воіны-інтэрнацыяналісты, вяртаючыся з Афганістана, пачалі ствараць гурткі: «Юны сапёр», «Юны дэсантнік», «Юны кіроўца», на якіх 15—16-гадовых хлопцаў навучалі таму, што можа ім спатрэбіцца на вайне. Магчыма, дзякуючы гэтым гурткам многія з іх засталіся жывымі і здаровымі. У навучальных установах і на прадпрыемствах сталі ствараць секцыі воінаў-інтэрнацыяналістаў, якія неўзабаве аб'ядналіся ў Мінскую гарадскую арганізацыю воінаў запасу «Памяць». Ужо тады ішоў пошук маці загінулых, аказвалася пасільная дапамога воінам, якія знаходзіліся ў шпіталях на лячэнні. Настала неабходнасць у будаўніцтве помніка. Добраахвотныя ахвяраванні ішлі з усяго Савецкага Саюза. Хто дзвесце рублёў дашле, хто тысячу. У 1990 годзе ў Мінску пачаў курсіраваць аўтобус пад назвай «Памяць», дзе замест касавых апаратаў стаялі стрэляныя гільзы. Людзі, хто колькі мог, кідалі туды грошы на будаўніцтва помніка. Потым з'явіўся аналагічны тралейбусны маршрут пад назвай «Боль». Помнік будаваўся як за кошт добраахвотных ахвяраванняў, так і дзяржаўных сродкаў.

— Але з'явіўся ён толькі ў 1996-м...

— Доўга не маглі выбраць варты варыянт, які адлюстраваў бы ўсю горыч салдацкіх маці і смутак усяго народа па палеглых воінах. Падчас двух конкурсных тураў пераможцу так і не вызначылі. У 1989 годзе беларуская дэлегацыя прысутнічала на адкрыцці помніка воінам, якія загінулі ў Афганістане, у Днепрапятроўску. Яны былі ўражаны работай украінскага скульптара Юрыя Паўлава і прапанавалі звярнуцца да яго з просьбай стварыць падобны помнік у Беларусі. Юрый Паўлавіч пагадзіўся, яго эскіз помніка быў зацверджаны мастацкай радай. Пасля працяглых пошукаў месца для будаўніцтва менавіта Паўлаў спыніўся на штучным востраве ракі Свіслач каля Траецкага прадмесця. Прызнацца, за яго прыйшлося паваяваць, але маці загінулых воінаў сказалі, што іншага месца ім не трэба. Падчас адкрыцця помніка воінам-інтэрнацыяналістам 3 жніўня 1996 года Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка паабяцаў, што ніводзін салдат нашай краіны не будзе ваяваць у чужых краях. Дзякуй Богу, ужо прайшло 20 гадоў, і нашы салдаты не ваююць на тэрыторыі іншых краін.

Нам вельмі важна, каб, напрыклад, такія праблемы, як забеспячэнне жыллём і працай воінаў-інтэрнацыяналістаў, аказанне дапамогі маці і ўдовам загінулых, інвалідам, вырашаліся яшчэ пры нашым жыцці.

— З той пары, калі з Афганістана былі выведзены апошнія савецкія воінскія падраздзяленні, прайшло яшчэ больш часу. Тым не менш тыя падзеі па-ранейшаму ахутаны мноствам таямніц. Якія «белыя плямы» яшчэ давядзецца «зафарбаваць»?

— Невядомага застаецца вельмі шмат, і наўрад ці нам калісьці стане ўсё зразумелым. Вы самі ведаеце, што ў розны час мы то героі, то ворагі народа; то акупанты, то марадзёры. Не адразу была дадзена ацэнка нашым дзеянням у Афганістане. Толькі пасля прызналі, што савецкія войскі былі першымі, хто стрымаў наркатрафік, які хлынуў праз 10 гадоў пасля нашага вываду. Пра тое, што мы ўдзельнікі антытэрарыстычнай аперацыі, ніхто не казаў. Мы абаранялі паўднёвыя межы нашай Радзімы. Нам не ставілі задачы перамагчы. Нам сказалі ўвайсці — мы ўвайшлі, загадалі выйсці — выйшлі. Вельмі цягне туды. Там жа шмат і добрага было. Мы абаранялі мірныя кішлакі, будавалі заводы, дарогі, дапамагалі мясцовым жыхарам, забяспечвалі іх гуманітарнай дапамогай, навучалі армію... Праз 10—15 гадоў афганцы, супраць якіх мы ваявалі, зусім па-іншаму сталі ацэньваць наша знаходжанне ў Афганістане. І ім ёсць з кім параўноўваць. Як бачым, наркатрафік хлынуў сёння не толькі на тэрыторыю постсавецкіх краін, а і дайшоў ужо да Еўропы.

— Вы кажаце, што многія пісалі, што служаць у іншых краінах. А дзе, на думку вашых родных, у той час праходзілі службу вы?

— Пісаў, што знаходжуся ў сонечным Кандагары. Дзесьці ваююць, а ў нас, маўляў, цішыня. Каб хоць крыху паверылі, расказваў пра кандагарскія гранаты: адзін плод выціснеш — атрымаеш цэлую шклянку соку. У Афганістане я быў начальнікам палітычнага аддзела — намеснікам камандзіра 70-й асобнай гвардзейскай мотастралковай брыгады. Прыехаў у Кандагар, а там спёка пад 60 градусаў. Думаю, як народ тут жыве? Праз некаторы час прывык. У сакавіку 1987 года была аб'яўлена палітыка нацыянальнага прымірэння. Быццам бы павінна была наступіць цішыня. А ў нас як ваявалі, так і працягвалі ваяваць. Баявыя дзеянні нават узмацніліся. Удзельнічаў практычна ва ўсіх баявых аперацыях. У канцы кастрычніка 1987 года на Гільмендзе падарваўся на фугасе. Паўгода лячыўся ў шпіталях. Даслужваў у Мінскім вышэйшым ваенна-палітычным вучылішчы.

— Больш як 20 гадоў вы ўзначальваеце Мінскую гарадскую арганізацыю ветэранаў вайны ў Афганістане. Ці змяніліся за гэты час задачы, у вырашэнні якіх вы прымаеце непасрэдны ўдзел?

— Задачы самыя простыя. Па магчымасці аказаць дапамогу тым, хто мае ў гэтым патрэбу. У першую чаргу гэта тычыцца маці і членаў сем'яў тых, хто загінуў у Афганістане, інвалідаў. Асноўныя пытанні, якія хвалююць воінаў-інтэрнацыяналістаў, — працаўладкаванне і жыллё. Шмат яшчэ несправядлівасці сёння ў дачыненні да ветэранаў вайны у Афганістане, членаў сем'яў загінулых. Цяпер яны мала каму патрэбны. На вайне ж кожны салдат быў на вагу золата...

— Як вы думаеце, які лёс напаткаў тых, хто і дагэтуль лічыцца зніклым без вестак? Можа, хтосьці з іх, як герой рамана Ганада Чарказяна «Горкі пах палыну», трапіўшы ў палон да мясцовых жыхароў, стаў іх рабом, а потым і членам сям'і?

— Вайна непрадказальная. Магло быць некалькі варыянтаў. Пайшоў са зброяй у руках — прапаў без вестак. Было такое, што па неасцярожнасці адышоў і трапіў у палон. Або быў паранены ў баі, і яго не змаглі своечасова вынесці з эпіцэнтра падзей. У нашым злучэнні быў і такі прыклад. Адзін сяржант, рыхтуючыся да заступлення ў нарад, пайшоў да ракі, каб памыць бялізну. Паслізнуўся, і яго зацягнула ў карыз. Дастаць не змаглі. Цела не знойдзена — прапаў без вестак. Мы ж ведалі, як ён загінуў. Але такі парадак. Пакуль бацькі не прызнаюць, што іх сын загінуў, ён лічыцца зніклым без вестак. Былі і такія спецыяльныя аперацыі, калі салдата контрразведкі ўкаранялі ў банды душманаў для вядзення дыверсійнай работы. Многія не вярталіся... Пра гэта чамусьці не кажуць. Дагэтуль працуе міжведамасная камісія СНД, якая займаецца пошукам зніклых без вестак.

— З нагоды падзей у Бадаберы, калі ваеннапалонныя савецкія салдаты захапілі ў маджахедаў склад з боепрыпасамі, у свой час праводзіліся цэлыя журналісцкія расследаванні. Ці былі сярод удзельнікаў гэтай аперацыі беларусы?

— Так, Аляксандр Звярковіч. Нядаўна мы ездзілі да яго маці, якая жыве ў Віцебскай вобласці. Уручылі ёй памятны медаль, прысвечаны падзеям у Бадаберы, падарылі вымпел нашай гарадской арганізацыі, буклет з апісаннем подзвігу яе сына. Як тое было, сёння казаць складана. Або нашы салдаты ўзарвалі склад, або ў яго трапіў снарад — адзінага погляду пакуль няма. Тым больш сярод палонных былі не толькі савецкія салдаты, а і афганскія ваеннаслужачыя.

— Вы калісьці казалі пра тое, што ў кожнай школе, дзе вучыліся воіны-інтэрнацыяналісты, якія загінулі ў Афганістане, у іх памяць павінна з'явіцца хаця б мемарыяльная дошка...

— Да 25-годдзя вываду савецкіх войск з Афганістана ў многіх школах былі створаны музейныя экспазіцыі. Дзесьці яны былі і раней, але з развалам Савецкага Саюза шмат што было страчана. Як казалі тады, гэта не модна, не актуальна... Але ж чалавек жыве, пакуль пра яго памятаюць. Невыпадкова мы вырашылі, у першую чаргу ў школах, дзе вучыліся нашы палеглыя баявыя сябры, стварыць куткі памяці, устанавіць мемарыяльныя дошкі, а дзе была магчымасць, нават адкрыць музеі. У дзясятках школ функцыянуюць куткі памяці, а ў васьмі з'явіліся музеі. У лютым 2014 года, напрыклад, ва ўрачыстай абстаноўцы адкрылі музей гонару і доблесці воінаў-інтэрнацыяналістаў у сярэдняй школе № 2 горада Мінска. Цяпер гэта ўжо гімназія. З зацікаўленымі школамі мы дзелімся экспанатамі, дапамагаем шукаць грошы на стварэнне падобных экспазіцый, рэгулярна выступаем перад школьнікамі.

Не адразу была дадзена ацэнка нашым дзеянням у Афганістане. Толькі пасля прызналі, што савецкія войскі былі першымі, хто стрымаў наркатрафік, які хлынуў праз 10 гадоў пасля нашага вываду.

— Ведаю, што ў перспектыве плануеце стварыць і тэматычны турыстычны маршрут...

— Помнік воінам-інтэрнацыяналістам на Востраве мужнасці і смутку ўвасабляе памяць аб палеглых ва ўсе часы і войны. Ваявалі ж не толькі ў Афганістане, а і яшчэ ў 15 дзяржавах. І кожная маці з надзеяй чакала вяртання свайго сына... Помнік нават стаў брэндам Беларусі. Яго наведваюць і маладыя, ветэраны, замежныя дэлегацыі. Помнік жыве. І мы хочам зрабіць гэты куточак Мінска самым пазнавальным і прыгожым. Летась гэтая частка набярэжнай Свіслачы атрымала назву набярэжнай Воінаў-інтэрнацыяналістаў. Напярэдадні 27-й гадавіны вываду савецкіх войскаў з Афганістана мы адкрылі там памятны камень. Гэты куточак будзе цэнтрам патрыятычнага выхавання, канкрэтным турыстычным маршрутам. Ён мог бы пачацца ў гістарычным цэнтры сталіцы — у Траецкім прадмесці. Побач знаходзіцца Мінскае суворaўскае ваеннае вучылішча, і гэта таксама гісторыя. Далей набярэжная цягнецца да моста праз раку Свіслач і заканчваецца ў раёне вуліцы Мельнікайтэ, дзе таксама стаіць памятны знак воінам-інтэрнацыяналістам. Затым маршрут памяці мог бы перайсці ў парк Перамогі, потым — да стэлы «Мінск — горад-герой». Завяршыўся б ён у Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

— З кожным годам ветэранаў Вялікай Айчыннай па аб'ектыўных прычынах становіцца ўсё менш. Відавочна, што на змену ім прыйдзеце вы, удзельнікі вайны ў Афганістане...

— Пасля ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны мы засталіся адзінымі непасрэднымі ўдзельнікамі вайны і сведкамі таго, якія беды прыносяць яе наступствы. І хацелася б, каб адносіны да тых, хто выконваў свой воінскі і інтэрнацыянальны доўг на тэрыторыі іншых дзяржаў, былі б не горшымі, чым да нашых бацькоў і дзядоў — удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Хоць і пра іх пачалі згадваць праз дзясяткі гадоў пасля таго, як вайна скончылася. У нас няма столькі часу. Сярэдні ўзрост воіна-інтэрнацыяналіста — 56—58 гадоў. Многія з нас не дажывуць да такой даты, як 50 гадоў вываду савецкіх войск з Афганістана... Таму нам вельмі важна, каб, напрыклад, такія праблемы, як забеспячэнне жыллём і працай воінаў-інтэрнацыяналістаў, аказанне дапамогі маці і ўдовам загінулых, інвалідам, вырашаліся яшчэ пры нашым жыцці.

Вераніка КАНЮТА.
kanyuta@zviazda.by

Сумесны праект газеты «Звязда» і Міністэрства ўнутраных спраў

ФАРПОСТ СПАКОЮ

№ 8 (26)

ЗАБІ Ў САБЕ РАБА

Здавалася б, жывём у час, калі кожны ўсё ведае пра асабістую бяспеку, а інфармацыя пра яе гучыць з кожнай радыёкропкі, прапісана на тысячах сайтаў. Аднак людзі працягваюць рабіць памылкі, трапляюць у пасткі і ператвараюцца ў рабоў без грамадзянскіх правоў, дакументаў. Паводле інфармацыі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у 2012 годзе ахвярамі гандлю людзьмі сталі выхадцы з 154 краін. На жаль, і Беларусь не з'яўляецца выключэннем з правілаў...

«Гандаль людзьмі існуе па ўсім свеце»

— Гандаль людзьмі — гэта з'ява, якая існуе ў кожнай краіне, — падчас адмысловай прэс-канферэнцыі заўважыў **Зэйнал ГАДЖЫЕЎ, кіраўнік прадстаўніцтва Міжнароднай арганізацыі па міграцыі ў Беларусі.** — Па ацэнках экспертаў сёння ў свеце налічваецца 21 мільён яго ахвяр. І не выпадкова барацьба з гэтай з'явай адлюстравана ў некалькіх дакументах ААН па ўстойлівым развіцці да 2030 года.

— 21 мільён — гэта крыху меней, чым насельніцтва ўсяго аўстралійскага кантынента, гэта ў два разы больш насельніцтва Беларусі, — дадае **Кацярына ПАНІКЛАВА, намеснік пастаяннага прадстаўніка праграмы развіцця ААН у Беларусі.** — Вось з такімі маштабамі мы сёння маем справу. Самы распаўсюджаны спосаб трафікінга — сексуальнае рабства. Ахвярамі становяцца пераважна жанчыны і дзяўчынкі. Другой па значнасці формай рабства з'яўляецца прымусовая праца, адна з самых згубных з'яў для чалавека. Гэта ад дзейнасці, што цалкам знішчае свабоду выбару, жыцця і перамяшчэння.

За апошнія сямнаццаць гадоў беларускія праваахоўныя органы дасягнулі пазітыўнай дынамікі ў гэтым пытанні. Як падкрэсліў **Андрэй САЛАДОЎНІКАЎ, выконваючы абавязкі начальніка галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі крымінальнай міліцыі МУС Беларусі,** міліцыя стараецца працаваць на папярэджанне злачынстваў, звязаных з эксплуатацыяй чалавека, педафіліяй, распаўсюджваннем парнаграфіі. Калі верыць статыстыцы, найбольшую колькасць здарэнняў па артыкуле «Гандаль людзьмі» выявілі ў 2005 годзе — 159 фактаў. За апошнія пяць гадоў штогод выяўляюцца не больш 10 падобных злачынстваў. Нягледзячы на гэта, людзі ўсё роўна трапляюць у пастку сучасных гандляроў «жывым таварам». Беларусы сярод такіх няшчасных не рэдкасць. З 2002 года з 5298 ахвяр гандлю людзьмі сексуальнай эксплуатацыі падверглася 4693 чалавекі.

Сумная геаграфія

Наша краіна найчасцей з'яўляецца радзімай такіх ахвяр. Некаторых жанчын адразу падманваюць, прапануючы добрыя ўмовы працы, а іншыя загадзя ведаюць, чым будуць займацца. Толькі яны не вераць у тое, што застануцца за мяжой без аніякіх правоў. Як лічыць **Уладзімір ЕМЯЛЬЯНАЎ, намеснік начальніка другога ўпраўлення галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі крымінальнай міліцыі МУС,** афіцыянтка, пакаёўка, прыбіральшчыца — гэта часцяком не патэнцыйная прафесія, а прыхаваны метад вярбоўкі ахвяры.

— Трафікёры на месцы не сядзяць, — кажа суразмоўца. — І калі раней было запатрабавана знаходзіць ахвяр падманам, цяпер дзейнічаюць інакш. Яны загадзя знаходзяць патрэбных ім жанчын і наўпрост кажуць, што яна будзе працаваць прастытуткай. Ёй абяцаюць добры заробак, але калі дзяўчына прыязджае на месца «працы», усведамляе, што ўсё зусім не так, як ёй абяцалі. Яна трапляе ў краіну з іншай культурай, незнаёмай мовай і становіцца залежнай ад свайго вярбоўшчыка, выконвае яго волю.

Для сексуальнай працы трафікёры найчасцей перапраўляюць беларусак у Турцыю, Расію, краіны Еўрасаюза. За першае паўгоддзе МУС перакрыла 12 каналаў вывазу людзей у 5 краін свету: у Расію — 5, Турцыю — 4, Аўстралію, Кіпр, Кітай — па адным.

Што цікава, Беларусь таксама выкарыстоўваюць як пункт дастаўкі «жывога тавару». З 2006 года да нас для рабскай працы накіроўвалі грамадзян В'етнама, Расіі, Украіны і Малдовы.

Каб пазбегнуць адказнасці, самі трафікёры стараюцца не прыязджаць да нас, шукаюць людзей праз інтэрнэт, сустракаюць іх ужо ў краіне прызначэння. Хоць самыя адважныя рабілі інакш, на чым і пагарэлі. У МУС расказалі, што асобныя замежнікі выкарыстоўваюць беларускія крымінальныя сувязі, каб наладзіць вярбоўку жанчын для прастытуцыі. Пры такіх сітуацыях міліцыя стараецца прадухіліць выезд жанчын за мяжу. Толькі за гэты год праведзена чатыры аперацыі па затрыманні трафікёраў, арыштавалі восем чалавек. Чатыры аказаліся жыхарамі Расіі, адзін — грамадзянін Германіі. Беларусаў у гэтай невясёлай кампаніі — трое. Адзін з трафікёраў — жанчына, якая стварыла нават спецыяльны сайт і падбірала прастытутак у Беларусі для далейшай работы ў Турцыі. Жахлівы бізнес аказаўся для яе даволі прыбытковым. Пра ўсё скажуць лічбы. Пры вышуку праваахоўнікі выявілі ў яе больш за 360 тысяч доларaў...

Секс-турызм — новыя выклікі для міліцыі

Калі бачыш па тэлебачанні сюжэт пра інтымны турызм, адразу прыгадваеш экзатычныя краіны, куды дзеля яго адпраўляюцца натоўпы заклапочаных турыстаў. Беларусь — краіна не экзатычная, аднак і гэты від адпачынку дабраўся да нашых ваколіц. У размове з карэспандэнтам «Звязды» Уладзімір Емяльянаў сказаў, што падобныя выпадкі хоць і нешматлікія, але ўсё роўна фіксуюцца на працягу апошняга дзесяцігоддзя.

— Такая з'ява характэрна пераважна для сталіцы, — кажа суразмоўца. — Усё ж такі гэта абумоўлена тым, што ў Мінску шмат казіно, начных клубаў, другіх забаўляльных устаноў... Адзін грамадзянін Турцыі арганізаваў цэлую сетку здымных кватэр, у якіх нашы дзяўчаты працавалі прастытуткамі. Мэтай прыезду туркаў, якіх ён запрашаў, значылася азнаямленне з выдатнымі мясцінамі Беларусі. Праўда, цікавілі іх выключна інтымныя ўцехі. Праз некаторы час на гэтым папаўся яшчэ адзін турак. Наша заканадаўства дазваляе плённа працаваць у гэтым кірунку і прыцягваць вінаватых да адказнасці. Спадзяёмся, тыя людзі, якія патрапілі пад яе, здолеюць данесці сваім суайчыннікам, што такім бізнесам займацца ў нашай краіне не трэба.

Тарас ШЧЫРЫ

■ Прыклад іншым

ЗАЎЖДЫ НА СЛУЖБЕ

Супрацоўнік Дэпартамента аховы абяззброіў хулігана... вяртаючыся з крамы

У апошні дзень перад водпускам **інспектар аховы спецыяльнага батальёна міліцыі ўпраўлення Дэпартамента аховы па ахове дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў замежных дзяржаў Дзмітрый ЖАРТУН** вяртаўся дадому з магазіна — вырашыў пачаставаць блізкіх тортам з нагоды надыходзячага адпачынку. Раптам мужчына заўважыў на аўтастаянцы маладых людзей: у аднаго у руках быў нож, у іншага — рэзаная рана на твары. Апрануты ў грамадзянскае афіцэр прадставіўся супрацоўнікам міліцыі. Пакуль пацярпелы расказваў пра інцыдэнт, мужчына з нажом паспрабаваў уцячы праз бліжэйшыя дзверы. Дзмітрый Жартун кінуўся за ім.

«Калі я дагнаў зламысніка, у яго руках убачыў баявы нож-кастэт і зразумеў, што проста выбіць з рук зброю не атрымаецца, — расказвае інспектар аховы. — Ацаніўшы становішча і праціўніка, вырашыў псіхалагічна націснуць, папросту прыпужаць яго. Балазе, вагавыя ды і ўзроставыя катэгорыі ў нас розныя. Я некалькі разоў досыць груба крыкнуў на яго: «Стаяць, не рухацца, я супрацоўнік міліцыі, кідай зброю!» Ён сапраўды спалохаўся, у той жа момант спыніўся, адкінуў у бок нож, прысеў на кукішкі і прамовіў: «Гульня скончана...»

Дарэчы, гульня для нападніка сапраўды скончана. На мінчаніна 1988 года нараджэння заведзена крымінальная справа па артыкуле «Хуліганства» Крымінальнага кодэкса. Як паведамляюць у прэс-службе Дэпартамента аховы Міністэрства ўнутраных спраў, затрыманы быў у стане алкагольнага ап'янення. Мужчына спецыяльна шукаў канфлікту: ішоў праз стаянку і штурхаў прахожых. Адзін з іх зрабіў яму заўвагу, у адказ на што атрымаў удар нажом у скулу. За затрыманне п'янага дэбашыра міліцыянер быў прэміраваны і ўзнагароджаны нагрудным знакам «За адзнаку».

«Кожны б так зрабіў на маім месцы, — кажа лейтэнант міліцыі. — Я доўгі час працаваў у групе затрымання, у нас такіх выпадкаў магло быць некалькі ў дзень. Менавіта дзякуючы гэтаму вопыту я лёгка заўважаю псіхалагічныя асаблівасці парушальнікаў і дзейнічаю па абставінах, імкнучыся лішні раз словам і сілай пераканання абразуміць зламысніка».

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

Пастраляў з пнеўматыкі і атрымаў тэрмін за «хуліганку»

Кожны мужчына, напэўна, памятае, як у дзяцінстве з непрыхаваным інтарэсам заходзіў у цір і пасля страляў па металічных фігурках з пнеўматычнага ружжа. Нехта з-за настальгіі робіць гэта і зараз. Але наўрад ці можа ўявіць сабе тое, што з дапамогай пнеўматыкі хтосьці будзе наўмысна прычыняць шкоду іншаму чалавеку альбо чужой маёмасці.

Але, на жаль, гэта наша рэчаіснасць, у якой хапае месца ўсяму. Вось некалькі свежых прыкладаў. У красавіку жыхар Заводскага раёна сталіцы пастраляў з пнеўматыкі... па пластыкавых вокнах суседкі. Ды зрабіў гэта так «удала», што патрапіў пад адказнасць па артыкуле «Хуліганства». А напачатку ліпеня па інтэрнэце распаўсюдзілася яшчэ больш непрыемная навіна. Жыхар вядомых на ўсю Беларусь сваімі агуркамі Альшанаў, што на Століншчыне, пацэліў з пнеўматычнага пісталета шасцігадоваму хлопчыку ў шыю. На шчасце, усё абышлося, малому нават не спатрэбілася шпіталізацыя, але ўсё магло скончыцца жахліва. Следчы камітэт крымінальную справу ў дачыненні стралка ўсё ж такі завёў. Падобныя злачынствы выклікалі ў нас цэлы шэраг пытанняў. З імі мы і накіраваліся да **Андрыяна КАХНОВІЧА, начальніка аддзела ліцэнзійна-дазвольнай работы ўпраўлення прафілактыкі МУС.**

— Уся пнеўматыка дзеліцца на дзве вялікія групы — пнеўматычную зброю і вырабы, якія канструктыўна падобныя да яе, — пачынае размову Андрыян Мікалаевіч. — Пнеўматычныя вырабы з дульнай энергіяй да 3 джоўляў зброяй не лічацца і знаходзяцца ў свабодным продажы. Так прынята не толькі ў Беларусі, але і ў іншых краінах. А вось зброю з энергіяй звыш 3 джоўляў можна прадаваць выключна па спецыяльным дазволе. На ўтрыманне пнеўматычнай зброі, якая перавышае 7,5 джоўля, ужо трэба мець дазвол органаў унутраных спраў.

Ёсць пералік хвароб і фізічных недахопаў, які забараняе валодаць зброяй: псіхічныя растройствы, нервовыя і хірургічныя захворванні, хваробы вачэй, горла, слыху.

З той пнеўматычнай зброяй, якая знаходзіцца ў нас на ўліку, праблем амаль не бывае. Яна пад кантролем, пастаянна правяраецца. Аднак з канструктыўных вырабаў усё ж такі пастрэльваюць. І каб папярэдзіць злачынствы, МУС летась выступіла з ініцыятывай абмежаваць продаж пнеўматыкі непаўналетнім. Зварот ужо знаходзіцца на разглядзе ў Савеце Міністраў.

— Каб захоўваць пнеўматыку звыш 7,5 джоўляў у сваёй кватэры, ці трэба атрымаць даведку ад урача?

— Безумоўна. Ёсць пералік хвароб і фізічных недахопаў, які забараняе валодаць зброяй. Сярод іх псіхічныя растройствы, нервовыя і хірургічныя захворванні, хваробы вачэй, горла, слыху.

— Якімі яшчэ трэба валодаць дакументамі, каб мець пнеўматычную зброю?

— Членскі білет спартыўнай арганізацыі, у якім прапісана, што вы займаецеся стральбой ужо больш за 5 гадоў, альбо пасведчанне паляўнічага. І, безумоўна, вы мусіце мець жалезную шафу, дзе будзеце захоўваць зброю.

— Якая адказнасць прадугледжана за незаконны збыт пнеўматыкі?

— Штраф ці выпраўленчыя работы на тэрмін ад аднаго да двух гадоў. Альбо пазбаўленне волі да двух гадоў, арышт да шасці месяцаў. Пнеўматыку і канструктыўна падобныя вырабы абавязкова трэба прадаваць па ліцэнзіі. Уся яна павінна прайсці сертыфікацыю ў Дзяржаўным экспертна-крыміналістычным цэнтры. У іншым выпадку прадаўцы панясуць адказнасць. Так, сёлета з незаконнага абарачэння выведзена 79 адзінак пнеўматычнай зброі. За незаконны збыт заведзены 4 крымінальныя справы.

Трэба заўжды памятаць, што пнеўматыка не з'яўляецца сродкам самаабароны. Яе задача — удасканаленне вашых навыкаў у стральбе. Таму любая страляніна з яе ў грамадскіх месцах будзе расцэньвацца як хуліганства, а трапны выстрал можа прычыніць даволі сур'ёзныя цялесныя пашкоджанні. Нават страту зроку, слыху... Таму перад тым, як набыць такую небяспечную рэч, яшчэ раз падумайце, ці патрэбна яна вам насамрэч.

Тарас ШЧЫРЫ.

ПЕНСІЯНЕРЫ ПАД ПРЫЦЭЛАМ ЗЛАЧЫНЦАЎ

На паўночны ўсход ад сталічнага гадзіннікавага завода размясціўся самы першы вялікі жылы мікрараён горада. Амаль усе дамы там пабудаваны ў пачатку 60-х гадоў. Гэтая асаблівасць наклала свой адбітак на дэмаграфічны складнік: цяпер у тых дамах жыве вельмі шмат пенсіянераў. А гэта, у сваю чаргу, значна ўплывае на спецыфіку работы міліцыянераў грамадскага пункту аховы правапарадку №81, які месціцца амаль у цэнтры мікрараёна.

У камунальнай кватэры.

Ды і дыслакацыя яго незвычайная. У хрушчоўцы, якая прытулілася сярод сабе падобных у двары, дагэтуль захаваліся камунальныя кватэры, якія апявалі яшчэ незабыўныя Ільф і Пятроў. Шэсць сем'яў тут карыстаюцца агульнай кухняй і санвузлом. Як гэты рудымент пачатку 60-х дацягнуў да нашых часоў, калі ў Мінску ўжо пачалі зносіць васьміквартэрныя жылыя дамы, невядома.

У дзень, калі карэспандэнт «Звязды» завітаў у пункт аховы правапарадку, там працавалі два ўчастковыя міліцыянеры. Службу яны нясуць даўно, ужо больш за сямнаццаць гадоў. У кабінеце маёра міліцыі Аляксандра Амосава сабрана цікавая калекцыя паліцэйскіх шэўронаў з розных краін свету. Вока чапляе экспанаты з Манголіі, і са Швейцарыі, і з Расіі... Але болей за ўсё экспанатаў — з ЗША. Форма паліцэйскіх у кожным штаце мае свае знакі адрознення. І калі звычайна мы яе бачым толькі ў заакіянскіх баевіках, то тут выпала рэдкая магчымасць паглядзець ужывую.

— Збіраю калекцыю больш за дзесяць гадоў. Працэс марудны з-за таго, што заказваць узоры даводзіцца з-за мяжы, адрозніваюцца і кошты ў розных прадаўцоў, якія раскіданы па ўсім інтэрнэце. Затое калі прыходзіць пасылка з чарговым шэўронам, адчуваеш, што высілкі былі не марныя, — усміхаецца Аляксандр Амосаў.

Спецыфіка раёна, дзе знаходзіцца пункт аховы правапарадку, моцна ўплывае на методыку работы ўчастковых інспектараў. Напрыклад, тут знаходзіцца вядомы ў пэўных колах грамадства пункт прыёму шклатары, куды вязуць пустыя бутэлькі са значнай часткі горада. Шклатару ў асноўным здаюць асобы без пэўнага месца жыхарства, аматары алкаголю і пенсіянеры, якія могуць пацярпець ад прадстаўнікоў першых двух сацыяльных слаёў з-за таго, што тым не хопіць на чарговую бутэльку. Таму вельмі часта міліцыянеры патрулююць гэтае месца.

— Акрамя таго, людзі сталага ўзросту, як правіла, атрымліваюць пенсіі на пошце, — гаворыць **старшы ўчастковы інспектар, маёр міліцыі Аляксей БАРБАРЧУК.** — І гэтай старой завядзёнкай, на жаль, карыстаюцца злачынцы. Пасля таго як пенсіянер выйшаў за дзверы пошты, яны падыходзяць да яго, пачынаюць гутарку, якая на першы погляд здаецца бяскрыўднай. Напрыклад, прапаноўваюць размяняць буйныя купюры. Робяць гэта нахрапіста, імкнучыся спачатку забалбатаць старога, а пасля яго пераканаць. У пенсіянера рэакцыя, на жаль, ужо далёка не тая, як у маладых, і таму ён на веру ўспрымае даволі шмат. Таму лепш за ўсё не ўступаць у дыскусіі ні з кім незнаёмым. А супрацоўнікаў банка і пошты мы просім сачыць у памяшканні за тым, ці назірае хтосьці за чалавекам, які атрымлівае ў касе грошы. І калі такое падазрэнне ўзнікае, то раім або паведамляць непасрэдна старым, або адразу нам.

У кабінеце маёра міліцыі Аляксандра Амосава сабрана цікавая калекцыя паліцэйскіх шэўронаў з розных краін свету.

Таксама на падман пенсіянераў разлічваюць махляры з гандлярскім прыкрыццем. Напрыклад, патэлефанавалі старому дадому і прапанавалі набыць расхвалены набор каструль. Пры гэтым спачатку называецца кошт, узяты з галавы, — скажам, тысяча рублёў. І як толькі чалавек усвядоміў гэтую велічыню і сабраўся адмаўляцца, яму пачынаюць расказваць пра тое, што ў яго ёсць велізарны шанц атрымаць зніжку — скажам, набыць тавар за паўцаны. Узрадаваны пенсіянер пагаджаецца сустрэцца. Аглядвае тавар, думае, што яму прываліла шчасце, і... аддае свае грошы. Ды вось толькі праз некаторы час даведваецца, што ў рэальнасці яму прэзентавалі не дарагія каструлі знакамітага еўрапейскага брэнда, а танны кітайскі набор адпаведнай якасці, якому ўся цана — рублёў сто ў лепшым выпадку. Міліцыянеры таксама згадваюць выпадак, калі нейкая цыганка прадала бабулі вязаную жакетку за мільён недэнамінаваных рублёў! Увяла чалавека ў зман, што гэта нейкая асаблівая воўна, што ледзь не манахі ўручную яе ткалі...

— Махляры — цудоўныя псіхолагі і цудоўна ведаюць, што многія старыя пакутуюць на дэфіцыт гутаркі, — запэўнівае Аляксей Барбарчук. — Так і трапляюць ім у рукі грошы, адкладзеныя на «чорны дзень». А паколькі гэта высвятляецца, як правіла, не адразу, то і затрымаць злачынцу па гарачых слядах становіцца значна складаней.

«У прафілакторыі я працую, а дома адпачываю...»

Церпяць старыя людзі і ад сваіх дарослых дзяцей. Пэўная іх частка даўно забылася, што такое рэгулярная праца, але не забывае рэгулярна прыкласціся да бутэлькі са спіртным. Жыве, як правіла, на пенсію маці. Пастаянна ў такіх кватэрах адбываюцца дэбошы, скандалы, за адмову даць грошы на чарговую выпіўку ў адрас старога чалавека ляцяць зняважлівыя, лаянка. Калі пра гэта стала вядома ўпершыню, то мы выпівоху афіцыйна папярэджваем пра тое, што калі ён не зменіць свае паводзіны, то адказваць яму давядзецца перад законам. І пасля ўжо не атрымаецца націснуць на жаль і сказаць, што, маўляў, я не ведаў, выбачайце...

На падначаленай міліцыянерам тэрыторыі жыве своеасаблівы рэкардсмен. Назавём яго Л. Ён нарадзіўся ў 1977 годзе. За 39 гадоў жыцця яго ўжо адпраўлялі ў лячэбна-працоўны прафілакторый за парушэнні закона ў нецвярозым стане... дзевяць разоў! Аднойчы ён паехаў у чарговую гадавую «камандзіроўку» менш чым праз тры месяцы пасля таго, як вярнуўся дадому. Нідзе не працуе, жыве на пенсію маці, якой ужо далёка за 60.

— Л. неаднаразова атрымліваў папярэджанні, яго паставілі на прафілактычны ўлік, у тым ліку і ў нарколага. Адпраўлялі яго і пад адміністрацыйны арышт за дробныя правапарушэнні. Мы з ім неаднаразова гутарылі на гэтую тэму: такія паводзіны чалавека здаровай логіцы не паддаюцца. Але Л. заявіў нам прамым тэкстам: «У прафілакторыі я працую, а сюды прыязджаю на адпачынак».

«Канфлікты нараджае скучанасць»

Участковыя міліцыянеры перыядычна абыходзяць старых, якія жывуць адны. Гэта робіцца для таго, каб праінструктаваць людзей, як не стаць ахвярай злачынцы. Акрамя таго, людзі ў пагонах аглядаюць агульны стан жылля. Калі патрэбная якая-небудзь дапамога ад сацыяльнай службы ці ад камунальшчыкаў, то яны гатовы выслухаць і перанакіраваць просьбу па адрасе.

Зазіраю ў план-заданне па абыходзе. Дзіўнае супадзенне: якраз у тым доме, дзе знаходзіцца пункт аховы правапарадку, значыцца шмат адрасоў, дзе старыя жывуць адны.

На вуліцы прыкмячаю, што многія пад'езды расчыненыя насцеж. Зразумела, што гэта зроблена для вентыляцыі — усё ж такі на вуліцы ртутны слупок штурмуе трыццаціградусную адзнаку, — але тады які сэнс ад дамафона? Усё ж збольшага дзверы пад'ездаў зачыненыя на замок. Міліцыянеры набралі патрэбную кватэру, прагучалі тры-чатыры званкі — і адразу ж пачуўся гук дамафона, які сведчыць аб тым, што праход вольны. А калі б на месцы міліцыянераў апынуліся нейкія прайдзісветы?

Заходзім разам з супрацоўнікамі міліцыі ў агульны калідор камунальнай кватэры. Цеснавата: плячыстаму чалавеку тут развярнуцца няпроста. І налева-направа толькі старыя пашарпаныя дзверы. А ў паветры лунае нейкі рэзкі пах...

— Гэтая скучанасць нараджае шмат канфліктаў. Нам тэлефануюць перыядычна з рознымі скаргамі, якія могуць падацца неспрактыкаванаму чалавеку дзіўнымі, — расказвае Аляксандр Амосаў. — Напрыклад, сусед не закрыў ваду. Ці, напрыклад, нехта па чарзе не памыў падлогу. І вось даводзіцца цярпліва тлумачыць заяўніку, што сам па сабе незакрыты кран — гэта не правапарушэнне, і мы не займаемся яго прафілактыкай. Такія вось псіхалагічныя трэнінгі атрымліваюцца. І тут для нас самае галоўнае — не перагарэць з-за гэтага, не пачаць ставіцца да праблем чалавека па нейкім шаблоне...

За 39 гадоў жыцця яго ўжо адпраўлялі ў лячэбна-працоўны прафілакторый за парушэнні закона ў нецвярозым стане... дзевяць разоў! Аднойчы ён паехаў у чарговую гадавую «камандзіроўку» менш чым праз тры месяцы пасля таго, як вярнуўся дадому. Нідзе не працуе, жыве на пенсію маці, якой ужо далёка за 60.

У розных пакоях камунальнай кватэры жывуць адразу два старыя. Міліцыянеры распытваюць іх па чарзе пра здароўе, пра ўмовы жыцця, ці не крыўдзіць іх хто. На апошняе пытанне адказ чуецца адмоўны. Участковыя расказваюць ім пра тое, як не трапіць на вудачку махляра. Пакідаюць памятку, каб старыя азнаёміліся з інфармацыяй падрабязней. І нагадваюць: калі, крый божа, што адбудзецца, каб звярталіся ў апорны пункт.

Многіх старых у іншых кватэрах дома не аказалася. І не дзіўна: на вуліцы стаіць спякота, мала хто захоча па сваёй волі сядзець у чатырох сценах у такое надвор'е. Але гэта не азначае, што іх пакінуць без увагі. Проста міліцыянеры завітаюць да іх у госці крыху пазней. Не сакрэт: любое злачынства куды лепш папярэдзіць, чым пасля займацца яго разборам...

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
schklennik@zviazda.by

Пенсіянеры ўважліва слухаюць парады міліцыі.

■ Навіны 102

ФУТБАЛІСТЫ «ПРАДАЛІ» МАТЧ?

Супрацоўнікі міліцыі затрымалі гульцоў футбольнага клуба «Ашмяны», якіх падазраюць у подкупе і наўмысным пройгрышы.

Ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС расказалі, што 5 чэрвеня двое грамадзян Украіны праз пасярэдніка падкупілі некалькі гульцоў «Ашмян», каманды першай лігі. Мэта — пройгрыш гэтай каманды ў матчы з «Баранавічамі». Паядынак адбыўся ў гэты ж дзень.

Сума сумніўнага ганарару, перададзенага футбалістам напярэдадні сустрэчы і адразу пасля яе завяршэння, склала 2 тысячы долараў. Падазраванымі ўжо прызнаны пяць футбалістаў «Ашмян». Што цікава, замешаны ў гэтай нячыстай справе не толькі гульцы асновы, але і тыя, хто ўвесь матч правёў на лаве запасных. Адзін з такіх футбалістаў, перадаваў умоўныя сігналы сваім хаўруснікам наўпрост з лаўкі.

Паводле матэрыялаў Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй, Следчы камітэт ужо завёў крымінальную справу. Усе мерапрыемствы ажыццяўляюцца ва ўзаемадзеянні МУС і футбольнай федэрацыі.

Нагадаем, што раней за ўдзел у дагаворным матчы затрымалі некалькіх футбалістаў сталічнай каманды «Прамень», якая таксама выступае ў першай лізе.

ЗРАБІЎ НАРКАЛАБАРАТОРЫЮ Ў ІНТЭРНАЦЕ

Супрацоўнікі Чыгуначнага РУУС Віцебска падчас вышуковых мерапрыемстваў выявілі ў адным з жылых памяшканняў горада больш як 50 кустоў канапель.

Як высветлілася, уся расада, а яшчэ спецыяльнае абсталяванне і 3 грамы высушанай марыхуаны належалі мясцоваму беспрацоўнаму жыхару, які культываваў траўку наўпрост у пакоі. У дачыненні да мужчыны ўжо заведзена крымінальная справа за незаконнае абарачэнне наркотыкаў.

ПАТРУЛЁЎ СТАНЕ БОЛЬШ

На выхадных супрацоўнікі ДАІ будуць несці ўзмоцнены рэжым службы

Як паведамілі ў Дзяржаўтаінспекцыі, супрацоўнікі дарожнай міліцыі арыентаваны на аказанне дапамогі ўдзельнікам дарожнага руху, стварэнне бяспечных умоў руху, спыненне грубых парушэнняў ПДР. Акрамя таго, нарады ДАІ таксама будуць працаваць у месцах масавага адпачынку і каля аздараўленчых лагераў.

Да 31 ліпеня Дзяржаўтаінспекцыя праводзіць акцыю «Спынім бяду разам!». Калі вы бачыце, што нецвярозы чалавек рухаецца па праезжай частцы альбо сядае за руль, абавязкова тэлефануйце па нумары 102. Ваш выклік можа спыніць бяду.

Тарас ШЧЫРЫ. *taras@zviazda.by*

■

НАДВОР'Е ДЛЯ ФЕРМЕРА

Што патрэбна добраму гаспадару на сваёй зямлі?

Кажуць, што жыццё прайшло недарэмна, калі чалавек пасадзіў хоць адно дрэва. Віктар АШУРКЕВІЧ і Браніслаў АДАМОВІЧ у маладым узросце паспелі вырасціць цэлы сад на 60 гектарах. Хлопчыкі сябравалі з дзяцінства, жылі побач, вучыліся ў адной школе. Сялянскія дзеці дапамагалі бацькам па гаспадарцы, любілі даглядаць сад. Пасля школы кожны з іх пайшоў сваёй дарогай. Віктар закончыў тэхналагічны інстытут, працаваў у дарожна-будаўнічай арганізацыі. Браніслаў адслужыў у арміі, стаў ратаўніком. Але сваю мару аб вялікім садзе сябры не пакінулі. Аднойчы сустрэліся і вырашылі пераўтварыць яе ў рэальнасць. Так і з'явілася ў Валожынскім раёне фермерская гаспадарка «Дзівосны сад».

Віктар АШУРКЕВІЧ *(злева)* і Браніслаў АДАМОВІЧ у дзівосным садзе.

— «Дзівосны сад» заснаваны ў 2005 годзе. Для садаводства гэта невялікі тэрмін: каб дрэўца пачало прыносіць аддачу, яго трэба не менш як тры гады карпатліва даглядаць, стаяць, як над малым дзіцем. Спачатку мы ўзялі 17 гектараў зямлі, затым, па меры сіл і магчымасцяў, паступова пашыраліся. Да зямлі трэба ставіцца па-чалавечы, браць столькі, колькі можаш апрацаваць. Таму ішлі такімі крокамі, каб было камфортна і нам, і нашай карміцельцы, — распавёў Браніслаў Эдуардавіч. — Найперш стаўку рабілі на яблыкі і грушы, а затым паглядзелі, што людзі цікавяцца і іншай вітаміннай прадукцыяй. Таму вырашылі: у нашым садзе будзе ўсё, што толькі можа тут расці: буякі, маліна, агрэст, трускалкі. Нават ёсць грэцкія арэхі, персікі, абрыкосы.

Браніслаў Адамовіч лічыць, што фермеру ўвесь час трэба падладжвацца пад патрэбы людзей. Напрыклад, гэты год паказаў, што неабходна павялічыць пасадкі вішань, дурніц, паколькі не змаглі цалкам забяспечыць попыт асноўных пакупнікоў: мясцовых жыхароў і мінчан. Плануюць гаспадары пасадзіць і больш ягадніку. Спажыўцы самі прыязджаюць у сад, самі збіраюць ягады, якія ім падабаюцца па памеры, колеры, спеласці. Усё грунтуецца на ўзаемным даверы. Ніхто не сочыць, колькі вітаміннай прадукцыі трапіла ў рот, а колькі ў кошык. Многія пакупнікі нязгодны з тым, калі пры ўзважванні ім адкідваюць вагу ёмістасці, маўляў, мы з'елі больш, чым назбіралі ў вядро. А ёсць, наадварот, і такія, хто патрабуе, каб улічылі вагу хвосцікаў ад клубніц.

Фермеры доўга не адважваліся дазволіць збор ягад самім спажыўцам. Не сакрэт, што ў нас яшчэ шмат ахвотнікаў пажывіцца за чужы кошт. Але ўсё атрымалася як найлепш. Задаволены людзі, якія могуць выбраць тую прадукцыю, якая ім патрэбна, а не тую, што прапануюць або навязваюць. Задаволены і гаспадары: не баліць галава, як сабраць ураджай.

— На пастаяннай аснове ў гаспадарцы працуюць 14 чалавек, яшчэ 6 набіраем у сезон. Што тычыцца тэхнікі, то раней набыць яе было цяжка. Цяпер у Беларусі развіваецца садаводства, з'явіліся фірмы, якія пастаўляюць і айчынную, і замежную тэхніку, — кажа Браніслаў Адамовіч. — Прыбытак укладваем у развіццё. Калі ёсць запас трываласці, то заўсёды можна разлічваць на свае сілы.

— Няўжо няма ніякіх праблем? — цікаўлюся ў свайго суразмоўцы.

— Праблема адна. Хочацца, каб у Беларусі стварылі адзіную дзяржаўную праграму, дзе прагноз надвор'я будзе супадаць з рэаліямі хаця б на 80%. Заходжу з раніцы на розныя сайты: на адным дождж, на другім сонца. Каму верыць, як спланаваць работу на дзень? Пачынаць апрацоўку саду або не? Суцэльны галаўны боль. Для садаводаў і ў цэлым для аграрыяў на сённяшні дзень гэта самае актуальнае пытанне. А наогул, айчыннае садаводства набірае абароты і неўзабаве, думаю, мы будзем выглядаць не горш за Польшчу і Галандыю.

— На нашай беларускай зямлі можна ўкараняць лепшае з еўрапейскага вопыту, але пры гэтым важна не сапсаваць глебу хімічнымі ўгнаеннямі. Не цікавыя нам і генетычна мадыфікаваныя прадукты. Мы робім ухіл на натуральную прадукцыю. У Беларусі дастаткова грунту, каб вырасціць тое, што не шкодзіць здароўю людзей, — лічыць Віктар Ашуркевіч.

У «Дзівоснага саду» няма пакуль патрэбы ў дадатковых плошчах. «Навошта браць лішняе? Зямля павінна выкарыстоўвацца па-гаспадарску. У нас планы давесці гэтую тэрыторыю да ідэальнага стану, каб выхад прадукцыі з кожнага квадратнага метра, гектара быў максімальным», — тлумачыць Віктар Антонавіч.

Браніслаў Адамовіч лічыць, што фермеру ўвесь час трэба падладжвацца пад патрэбы людзей. Напрыклад, гэты год паказаў, што неабходна павялічыць пасадкі вішань, дурніц, паколькі не змаглі цалкам забяспечыць попыт асноўных пакупнікоў.

А вось кіраўніку фермерскай гаспадаркі Іосіфу Нехвядовічу патрэбна дадатковая зямля. Іосіф Іванавіч пачынаў у 1993 годзе з 10 гектараў. Цяпер у яго больш як 1 тыс. гектараў зямлі. За гэты час 8 разоў пашыраў свае ўладанні за кошт фермераў, якія бралі зямлю, але затым ад яе адмаўляліся. Ён займаецца бульбай, буракамі, морквай, капустай, цыбуляй, а таксама рапсам, збожжавымі, сёлета ўпершыню пасеяў грэчку.

— Прапашныя культуры займаюць штогод каля 360—380 гектараў. Астатнія землі непрыдатныя для іх вырошчвання. У мяне ёсць германская тэхніка для пасадкі бульбы на камяністых глебах, але гэта цягне за сабой вялікія затраты. Па такой тэхналогіі саджаю дзесьці 50—60 гектараў караняплодаў. Для наладжвання нармальнага севазвароту мне неабходна яшчэ 500 гектараў зямлі. Але ў райвыканкаме, Камітэце сельскай гаспадаркі і харчавання Мінаблвыканкама адказваюць, што свабоднай зямлі няма.

— На сённяшні дзень у раёне ёсць 850 гектараў свабодных зямель, якія мы вызначылі для прадастаўлення фермерскім гаспадаркам: як тым, што нядаўна створаны, так і тым, якія жадаюць пашырацца, — каментуе сітуацыю **начальнік землеўпарадкавальнай службы Валожынскага раёна Дзмітрый ПРОТАС.** — Але ўчасткі размешчаны ў розных сельгаспрадпрыемствах, і яны невялікія па памерах. Што тычыцца Іосіфа Іванавіча, то яму патрабуецца для севазвароту значная плошча. Мы прапанавалі яму палі за 10 кіламетраў ад яго асноўных зямель — фермера такі варыянт не задавальняе. Землі, якія ўшчыльную прылягаюць да яго гаспадаркі, выкарыстоўваюцца сельгасарганізацыямі.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.
lazovskaya@zviazda.by

У ТЭМУ

Аляксандр ШЫФРЫН, першы намеснік старшыні — начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Валожынскага райвыканкама:

— На Валожыншчыне працуюць 43 сялянскія фермерскія гаспадаркі, у тым ліку тры з іх займаюцца жывёлагадоўляй. Напрыклад, у адной разводзяць авечак. Усе яны паказваюць нядрэнныя вынікі. У прыватнасці, летась па раёне атрымалі бульбы да 200 цэнтнераў з гектара, а ў фермераў яна была каля 400 ц/га.

У нас ёсць фонд размеркавання, які налічвае 800 гектараў свабоднай зямлі. Усім, хто хоча займацца фермерствам, яе выдзяляем. Для гадоўлі жывёлы сяляне выкупляюць або бяруць у арэнду старыя памяшканні, што не выкарыстоўваюцца. Ім таксама выдаюцца льготныя крэдыты, паліва на пасяўную. Штогод да нас наконт адкрыцця фермерскіх гаспадарак звяртаецца да 5 чалавек.

БЕЛАРУСБАНК

Предложение на заключение дополнительного соглашения к договору текущего (расчетного) банковского счета с использованием банковской платежной карточки
(публичная оферта)

Настоящий документ, размещенный в сети Интернет на веб-сайте по адресу: www.asb.by Открытым акционерным обществом «Сберегательный банк «Беларусбанк», именуемым в дальнейшем БАНК, является публичной офертой, то есть предложением БАНКА заключить на условиях, указанных в настоящем предложении, дополнительное соглашение к договору текущего (расчетного) банковского счета с использованием банковской платежной карточки (далее – договор об использовании карточки), определенному в соответствии с настоящим предложением.

БАНК считает себя на условиях, указанных в настоящем предложении, заключившим дополнительное соглашение к договору об использовании карточки с физическим лицом, именуемым в дальнейшем КЛИЕНТ, которое при соблюдении условий настоящего предложения в порядке, предусмотренном настоящим предложением, отзовется на настоящее предложение (акцептует предложение).

Акцептом настоящего предложения (заключением дополнительного соглашения к договору об использовании карточки на изложенных далее условиях) является совершение КЛИЕНТОМ расходной операции по счету, влекущей возникновение (увеличение) овердрафта.

Предусмотренное настоящим предложением дополнительное соглашение к договору об использовании карточки вступает в силу с момента акцепта настоящего предложения и применяется с 01.08.2016.

Условия дополнительного соглашения к договору об использовании карточки

Годовая процентная ставка овердрафта, которая превышает ставку рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс 3 процентных пункта, с 01.08.2016 по 31.10.2016 (включительно) устанавливается в размере ставки рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс 3 процентных пункта.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

НА ДОЛЕВОЕ СТРОИТЕЛЬСТВО пристроенного магазина с инженерными сетями в составе объекта: «Группа многоквартирных жилых домов по ул. Лукьяновича со встроенными административными и торговыми помещениями, пристроенным магазином, гаражом-стоянкой открытого типа со сносом зданий и сооружений филиала треста – ДСУ № 12»

I. ИНФОРМАЦИЯ О ЗАСТРОЙЩИКЕ

1.	Фирменное наименование, место нахождения, режим работы застройщика	**Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 5» (ОАО «ДСТ № 5»)**
		Место нахождения: 220113, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253. График приема по вопросам долевого строительства: понедельник – четверг с 9.00 до 12.00. Выходные дни: суббота, воскресенье, государственные праздники и праздничные дни. Телефоны для справок: 8-024-970-96-06 (гор.), 8-017-234-41-32 (гор.), 8-024-970-95-16 (гор.)
2.	Документы о государственной регистрации застройщика	ОАО «ДСТ № 5» зарегистрировано в ЕГР юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 18.01.2010 г. за № 100219908 Минским городским исполнительным комитетом. Аттестат соответствия на право осуществления строительства объектов первого-четвертого классов сложности – №0000279-СТ (первая категория) от 19.04.2014
3.	Сведения о проектах строительства многоквартирных домов и (или) иных объектов недвижимости, в которых принимал участие застройщик в течение трех предшествующих лет	За данный период застройщик принимал участие в строительстве объекта: «Группа многоквартирных жилых домов по ул. Лукьяновича со встроенными административными и торговыми помещениями, пристроенным магазином, гаражом-стоянкой открытого типа со сносом зданий и сооружений филиала треста – ДСУ № 12»

II. ИНФОРМАЦИЯ О ПРОЕКТЕ СТРОИТЕЛЬСТВА

1.	Цель проекта строительства, этапы и сроки его реализации, результаты государственной экспертизы проектной документации	Цель проекта – строительство пристроенного магазина продовольственных товаров и сопутствующих групп непродовольственных товаров
		Начало – 01 августа 2016 года. Предполагаемое окончание – 01 декабря 2016 года. С 01.05.2016 года объект находится на консервации
		Положительные экспертные заключения о прохождении проектной документации государственной экспертизы выданы РУП «Главгосстройэкспертиза» от 30.01.2012 № 1162-15/11 и от 12.05.2015 № 252-15/15 (Внесение изменений)
2.	Разрешение на строительство	Разрешение на производство строительно-монтажных работ № 2-207Ж-029/12, выданное 15.05.2015 Инспекцией Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску. С 01.05.2016 объект находится на консервации
3.	Права застройщика на земельный участок, информация о собственнике земельного участка	Свидетельство о государственной регистрации № 500/1572-3065 от 20.07.2015, выданное РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»
		Общая площадь земельного участка – 0,5744 га, Кадастровый номер 500000000008000008
		Земельный участок расположен: г. Минск, ул. Лукьяновича
		Правообладатель – ОАО «ДСТ № 5» (право постоянного пользования)
4.	Характеристика и описание объекта строительства	Объект строительства представляет собой двухэтажное здание с подвалом прямоугольной в плане формы размером 45,0 х 18,0 м. Под частью здания находится проезд для автомобилей шириной 4,5 м и высотой 4,5 м. В подвальном помещении расположены подсобные, производственные и административно-бытовые помещения магазина, технические помещения, помещения администрации и персонала. На первом этаже расположены помещения торгового зала. На втором этаже расположены арендные помещения, кофейня с подсобными помещениями, административные помещения. Наружные стены здания толщиной 400 мм из газосиликатных блоков по СТБ 1117-1998. Предусмотрено утепление наружных стен по легкой штукатурной системе и системы вентилируемого фасада. Кровля плоская совмещенная, внутренние перегородки с влажным режимом приняты из кирпича керамического рядового полнотелого, перегородки в помещениях с нормальным влажностным режимом приняты из гипсокартона со звукоизоляцией из минеральных плит Наружная отделка: Стены – облицовка фасадными кассетами с окраской в заводских условиях, окраска силикатной фасадной краской по штукатурно-отделочному слою легкой системы утепления. Цоколь – облицовка декоративной плиткой. Витражи и входные группы выполняются из алюминиевого профиля с заполнением стеклопакетом. Окна – ПВХ профиль с заполнением стеклопакетом. Готовность объекта – 27,6%.
5.	Объемно-планировочные показатели	Общая площадь – 2100,18 м кв.; Торговая площадь 1 этажа – 471,6 м кв.; Торговая площадь 2 этажа – 521,4 м кв.; Площадь застройки – 974,3 м кв. Строительный объем – 8008,0 м кв.
9.1.	Планируемая стоимость строительства (создания) объекта недвижимости	2 730 834,70 (два миллиона семьсот тридцать тысяч восемьсот тридцать четыре рубля семьдесят копеек)
10.	Цена объекта долевого строительства (цена договора)	Формируется на стадии заключения договора создания объекта долевого строительства с дольщиком в соответствии с законодательством. Изменение договорной цены допускается в случаях, предусмотренных законодательством и по соглашению сторон, а ее уплата производится единовременно либо поэтапно в белорусских рублях
11.	Передача объекта недвижимости правообладателям	Застройщик в порядке и в сроки, предусмотренные законодательством и договором при условии полной оплаты дольщиком стоимости объекта долевого строительства передает документы на оформление права собственности
12.	Сведения о договоре строительного подряда	Отсутствуют

Заключение договоров (дополнительных соглашений к договору) создания объектов долевого строительства осуществляется согласно Указу Президента Республики Беларусь от 06.06.2013 № 263 «О долевом строительстве объектов в Республике Беларусь» в офисе застройщика (г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253, каб. № 6).

Заявления на участие в долевом строительстве принимаются не ранее чем через 7 (семь) календарных дней после опубликования настоящей проектной декларации, ежедневно, с учетом вышеуказанного режима работы застройщика.

Прием заявлений осуществляется до момента набора необходимого количества заявлений.

В целях оперативной работы и экономии времени претендентов информацию о дате и времени заключения договора застройщик сообщит претенденту по представленному претендентом телефону (звонок, СМС). Если претендент в течение пяти календарных дней не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу, и застройщик оставляет за собой право заключить договор на заявленный объект долевого строительства с другим претендентом.

Генеральный директор ОАО «ДСТ № 5» **В.В. Габец**

■ Актуальна

ЛАЙФХАК: ЯК БЕЗ ЛІШНІХ НАМАГАННЯЎ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ САБЕ ГОДНУЮ ПЕНСІЮ?

ПриорЛайф
СТРАХОВАЯ КОМПАНИЯ

Для абсалютнай большасці беларусаў пенсія асацыюецца са зніжэннем даходаў. Аднак гэты сцэнарый ужо не безальтэрнатыўны. Сёння мы можам разлічваць не толькі на дзяржаўную пенсію. У сучасных беларусаў з'явіўся шанц самастойна паклапаціцца аб сваёй старасці і забяспечыць узровень даходаў, які параўнальны з сярэднім заробкам — і нават перавышае яго! Гаворка ідзе пра пенсійнае страхаванне, якое набірае папулярнасць у Беларусі. І задумацца пра яго варта як мага раней.
Пра новы спосаб забяспечыць годны ўзровень жыцця пасля выхаду на пенсію расказвае намеснік дырэктара ўнітарнага страхавога прадпрыемства «ПріорЛайф» «Пріорбанк» ААТ Вера КАРАЛЁВА.

Праграма страхавання дадатковай пенсіі прызначана для тых, хто ўжо сёння думае пра свой заўтрашні дзень і турбуецца аб годным узроўні жыцця пасля спынення працоўнай дзейнасці. Праграма дазваляе назапасіць сродкі на дадатковую пенсію, якая стане адчувальнай прыбаўкай да дзяржаўнай пенсіі.

— На першы погляд, самым відавочным спосабам забяспечыць сабе нябедную старасць падаецца банкаўскі дэпазіт. Аб праграме страхавання дадатковай пенсіі беларусы ведаюць менш. У чым яе асаблівасці і адрозненні ад банкаўскіх укладаў?

— Схема страхавання простая. Спачатку вы назапашваеце сродкі на дадатковую пенсію, рэгулярна адлічваючы зручную суму на свой асабовы рахунак у страхавую кампанію, а пасля дасягнення пенсійнага ўзросту страхавая рэгулярна выплачвае вам назапашаныя сродкі на працягу абранага вамі тэрміну. Гэта значыць, плаціць вам яшчэ адну пенсію.

Як і дэпазіт, праграма прадугледжвае не толькі захаванне, але і прымнажэнне сродкаў. Гэтыя назапашванні гарантуюць вам годны ўзровень жыцця ў пенсійным узросце. Але ў выпадку са страхаваннем кожны кліент самастойна вызначае памер камфортных узносаў і перыядычнасць. Мы не вызначаем мінімальную суму ўзносу, у тым ліку першага.

Што тычыцца нормы даходнасці, то ў валюце яна фіксаваная і на сёння складае 6%, у беларускіх рублях — плаваючая, у памеры 20%.

І яшчэ адна важная перавага праграмы страхавання: заключыўшы дагавор, вы атрымліваеце дадатковую эканомію ў выглядзе падатковай ільготы: узносы да 1 813 BYN (або 18 130 000 недэнамінаваных рублёў) у год не абкладаюцца падаходным падаткам. Гэта значыць, фактычна кліент можа сэканоміць да 2 356 900 BYR (235,69 BYN) кожны год, калі падасць у бухгалтэрыю па месцы асноўнай работы копію дагавора страхавання і квітанцыі аб аплаце страхавых узносаў на працягу года.

— Давайце прывядзём канкрэтны прыклад з лічбамі. Колькі трэба адлічваць штомесяц, каб забяспечыць сабе дадатковую пенсію, напрыклад, у 500 долараў? І якая будзе эканомія на падатковай ільготе?

— Калі ласка. Возьмем для прыкладу мужчыну ва ўзросце 37 гадоў. Для таго, каб ён з 60 да 70 гадоў атрымліваў штомесяц па 500 долараў, цяпер яму неабходна адкладаць па 77 долараў 40 цэнтаў. Усяго ж за гэтыя 10 гадоў ён атрымае 60 000 долараў. Плюс да гэтага ён можа разлічваць на падатковую льготу ў памеры прыкладна 2,7 тысячы долараў.

— Лічбы выглядаюць вельмі прывабна. А калі гаворка ідзе пра больш сціплыя магчымасці кліента? Якая сума ўзносу аптымальная, каб прыбаўка да пенсіі была адчувальная?

— Аптымальнай лічыцца сума ад 20 долараў (або 4 рублі). Тады і прыбытак, і падатковая льгота прыкметныя кліенту. Напрыклад, у нашым выпадку 37-гадовы мужчына пры ўнясенні 20 долараў штомесяц пасля дасягнення пенсійнага ўзросту (цяпер гэта 60 гадоў для мужчын) будзе атрымліваць дадаткова да пенсіі 129 долараў. Пры гэтым падатковая льгота за ўвесь тэрмін складзе 717 долараў...

— Куды можна звярнуцца, каб разлічыць дадатковую пенсію для кожнага канкрэтнага кліента?

— Вы можаце даведацца пра сваю дадатковую пенсію і падатковую льготу, скарыстаўшыся адмысловым **калькулятарам**, размешчаным на нашым сайце www.priorlife.by. Увёўшы свой узрост, пол, жаданы памер адлічэнняў, вы зробіце разлік у рэжыме анлайн. Таксама кансультацыю можна атрымаць у любым аддзяленні «Пріорбанка» па ўсёй краіне альбо па тэлефонах прадпрыемства «ПріорЛайф».

— Калі лепш пачынаць збіраць дадатковую пенсію?

— Пачынаць інвеставаць у сваю будучыню пажадана як мага раней — тады адлічэнні будуць менш заўважныя для вашага бюджэту, а сума дадатковай пенсіі атрымаецца больш важкай. Але нават за 5-10 гадоў у вас ёсць шанц назбіраць на адчувальную прыбаўку да пенсіі. Сярод нашых кліентаў ёсць і 22-гадовыя, і тыя, каму ўжо за 50. Інвеставаць у сваю будучыню — заўсёды своечасова!

— А калі фінансавыя магчымасці кліента зменяцца? Яго заробак можа вырасці ці, наадварот, зменшыцца. Можа ўзнікнуць неабходнасць у буйных тратах або, наадварот, з'явіцца дадатковыя свабодныя сродкі... Ці зможа кліент адкарэктаваць перыядычнасць і суму узносаў?

— Вядома. На працягу тэрміну дзеяння дагавора можна мяняць і перыядычнасць, і суму узносаў.

— Якім можа быць тэрмін выплаты дадатковай пенсіі?

— Гэта можа быць 5, 10 або 15 гадоў — як вырашыць кліент. Перыядычнасць выплат таксама можна вар'іраваць — штомесяц, паквартальна, раз у паўгода або ў год.

— Што здарыцца з грашыма кліента, калі да пенсіі ён не дажыве?

— Уся сума з інвестыцыйным даходам, якая назапасілася на рахунку кліента да моманту яго смерці, будзе выплачана выгаданабытчыку, калі кліент назваў яго ў дагаворы. Выгаданабытчыкам можа быць любы чалавек. Прычым, у адрозненне ад банкаўскага дэпазіту, выгаданабытчыку не давядзецца чакаць 6 месяцаў, каб уступіць у права атрымання спадчыны. Грошы будуць выплачаны яму на працягу 10 дзён пасля прадастаўлення дакументаў.

Калі ж выгаданабытчык не быў названы кліентам, грошы пароўну дзеляцца паміж усімі спадкаемцамі пасля іх уступлення ў права атрымання спадчыны.

— Ці гарантуе дзяржава вяртанне сродкаў, калі страхавая кампанія спыніць дзейнасць, як у выпадку з банкаўскімі ўкладамі?

— Так, гарантуе. Згодна з указам Прэзідэнта № 530 у краіне створаны дзяржаўны гарантыйны фонд, у які страхавыя кампаніі адлічваюць сродкі. У выпадку ліквідацыі кампаніі фонд прымае на сябе ўсе абавязацельствы па выплаце ўзносаў.

— Ці можна ўносіць плацяжы дыстанцыйна?

— Вядома. Вы можаце рабіць адлічэнні з карткі любога банка без спагнання камісій. Прычым калі вы адкрылі валютны ўклад, адлічэнні можна рабіць у рублях — канвертацыя будзе ажыццёўлена па курсе, які дзейнічае на гэты момант у Пріорбанку.

— Пры ўсёй відавочнай выгадзе праграм страхавання дадатковай пенсіі іх папулярнасць у Беларусі пакуль не надта вялікая. Чым вы гэта тлумачыце?

— Думаю, прычына толькі ў тым, што гэты інструмент для нашай краіны яшчэ адносна малады, і людзі пакуль проста мала пра яго ведаюць. Спрацоўвае і стэрэатып: пачуўшы слова «страхаванне», людзі праводзяць паралель са страхаваннем дома, машыны, калі пры адсутнасці страхавога выпадку ўзносы па сутнасці страчваюцца. Важна разумець, што ў выпадку са страхаваннем дадатковай пенсіі гаворка ідзе пра назапашвальную сістэму — пасля заканчэння тэрміну дагавора кліент гарантавана атрымлівае грошы, прычым у большым памеры.

Аднак на прыкладзе сваёй кампаніі мы бачым, як мяняецца менталітэт нашых людзей. Кліентаў у нас становіцца ўсё больш. Наша моладзь пачынае разумець, што нябедная, спакойная старасць — гэта, перш за ўсё, зона адказнасці самога чалавека. Так, за шэсць месяцаў 2016 года мы ўжо заключылі дагавораў больш, чым за ўвесь мінулы год.

Інфармацыю аб праграме страхавання дадатковай пенсіі можна знайсці на сайце www.priorlife.by і па тэлефоне 8 (017) 283 10 71. Звяртайцеся, і нашы спецыялісты дапамогуць разлічыць камфортны для вас варыянт назапашвання дадатковай пенсіі.

Аформіць дагавор добраахвотнага пенсійнага страхавання і атрымаць кансультацыю можна ў любым аддзяленні Пріорбанка па ўсёй Беларусі.

УНП 190247301

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

Дата, время и место проведения аукциона, организатор торгов	Аукцион состоится 17 августа 2016 г. в 11.00 по адресу: Гомельская область, г. Жлобин, ул. Петровского, 45 (подъезд 2, этаж 1) Коммунальное унитарное предприятие по операциям с недвижимым имуществом «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью»					
Номер лота	1	2	3	4	5	6
Адрес земельного участка	Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Воинов-интернационалистов, 17	Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Воинов-интернационалистов, 25	Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Воинов-интернационалистов, 29	Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Воинов-интернационалистов, 31	Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Воинов-интернационалистов, 33	Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Воинов-интернационалистов, 35
Кадастровый номер участка	321850100001002708	321850100001002712	321850100001002714	321850100001002715	321850100001002716	321850100001002717
Площадь, га	0,1076	0,1155	0,1426	0,1386	0,1409	0,1390
Целевое назначение	Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания)					
Условия и ограничения	Победителю либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: 1. В течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: - внести плату за право частной собственности земельного участка (часть платы в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке); - возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документов, необходимых для его проведения, формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка; 2. После совершения победителем аукциона вышеуказанных действий, но не позднее 2 рабочих дней, местный исполнительный комитет передает ему выписку из названного решения, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона. 3. Обеспечить в двухмесячный срок государственную регистрацию права частной собственности на земельный участок со дня утверждения протокола аукционных торгов по продаже земельного участка в частную собственность; 4. В течение двух месяцев, со дня государственной регистрации права земельного участка, получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство одноквартирного жилого дома; 5. Приступить к занятию земельного участка в течение одного года, со дня утверждения в установленном порядке проектной документации; 6. Снять, сохранить и использовать плодородной слой почвы согласно проектной документации; 7. Соблюдать права и обязанности иных землепользователей земельных участков; 8. Использовать земельный участок в соответствии с целевым назначением и условием его предоставления, согласно Кодексу Республики Беларусь о земле.					
Начальная цена, рублей	4 125 руб. 52 коп. (41 255 185* руб.)	4 428 руб. 41 коп. (44 284 144* руб.)	5 467 руб. 46 коп. (54 674 623* руб.)	5 314 руб. 10 коп. (53 140 973* руб.)	5 402 руб. 28 коп. (54 022 821* руб.)	5 214 руб. 49 коп. (52 144 877* руб.)
Сумма задатка, рублей	400 руб. (4 000 000*руб.)	400 руб. (4 000 000* руб.)	500 руб. (5 000 000 руб.)	500 руб. (5 000 000* руб.)	500 руб. (5 000 000* руб.)	500 руб. (5 000 000* руб.)
Затраты по изг. зем. документации, рублей	1 422 руб. 6 коп. (14 220 553* руб.)	1 448 руб. 88 коп. (14 488 773* руб.)	1 448 руб. 88 коп. (14 488 773* руб.)	1 378 руб. 70 коп. (13 786 995*руб.)	1 378 руб. 70 коп. (13 786 995* руб.)	1 441 руб. 62 коп. (14 416 160* руб.)
Стоимость расходов по орг. и проведению аукциона (ориент.), рублей	300 руб. (3 000 000* руб.)	300 руб. (3 000 000* руб.)	300 руб. (3 000 000* руб.)	300 руб. (3 000 000* руб.)	300 руб. (3 000 000* руб.)	300 руб. (3 000 000* руб.)
1.2. возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документов, необходимых для его проведения, формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка;

2. заключить с райисполкомом договор аренды земельного участка и в течение двух месяцев со дня его подписания, но не позднее трех месяцев со дня утверждения протокола о результатах аукциона обратиться в Гомельский межгородской филиал республиканского унитарного предприятия «Гомельское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него (г. Гомель, ул. Войкова, 87);

3. получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства, разрешение райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ, разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий одного года;

4. приступить к строительству объекта в течение шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство такого объекта;

5. снять на занимаемом земельном участке плодородный слой почвы и использовать его согласно проектной документации;

6. завершить строительство объекта в сроки, определенные проектной документацией;

7. по мере изменения фактического состояния и характера использования земель обратиться в райисполком для внесения сведений в государственный земельный кадастр сведений об изменении видов земель.

Аукцион проводится при наличии двух или более участников аукциона.

Участникам предоставляется возможность осмотра земельного участка на местности с представителем комиссии по организации и проведению аукционов по продаже земельных участков в частную собственность и на право заключения договоров аренды земельных участков.

■ Працяг тэмы

ДЫЯГНАЗ ПА ІНТЭРНЭЦЕ

Жыхары Магілёўскага раёна атрымалі магчымасць карыстацца медыцынскай дапамогай на адлегласці

Прыёмы анлайн вядуцца ў Вільчыцкай амбулаторыі ўжо з чэрвеня, і яе загадчык Рыгор МАІСЕЕЎ можа прывесці шмат прыкладаў на карысць новай формы абслугоўвання.
— Неяк да нас звярнулася пацыентка, хворая на цукровы дыябет, каб высветліць, наколькі небяспечнымі могуць быць невялічкія язвачкі, што з'явіліся на яе ступні, — расказвае ён адзін з выпадкаў. — Мы звязаліся з хірургам 11-й паліклінікі ў Магілёве, ён агледзеў ступню і пацвердзіў дыягназ: трафічная язва. Жанчыне назначылі лячэнне, а праз 10 дзён яе зноў паглядзеў хірург. Язва пачала загойвацца. Цяпер жанчына атрымлівае лячэнне па месцы жыхарства. Ёй не спатрэбілася ехаць у раённую паліклініку і, дзякуючы своечасова пастаўленаму дыягназу, атрымалася пазбегнуць бальніцы.

Некалькі месяцаў таму «Звязда» пісала пра тое, што на тэрыторыі Магілёўскай вобласці ўкараняецца перадавы праект, які дазволіць абслугоўваць сельскіх жыхароў з дапамогай відэасувязі. У буйных гарадах гэта ўжо не навінка, а вось для глыбінкі сапраўдны прарыў. Тым больш што анлайн-прыёмы не абмяжоўваюцца сценамі адной установы. У Магілёўскім раёне ў агульную сетку аб'яднаны тры ўчастковыя бальніцы, шэсць амбулаторый і два ФАПы. Магілёўская паліклініка №11, якая для ўсіх гэтых устаноў з'яўляецца галоўнай, рызыкнула прыняць удзел у конкурсе ініцыятыў ПРААН «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Беларусі» і перамагла з гэтым праектам. Ініцыятыва зыходзіла ад **галоўнага ўрача Сяргея КАРАЕВА**, а распрацоўшчыцай стала **начальнік гаспадарчай часткі Вольга МАСОЛЬД.** Праект працуе, і кіраўнік са сваёй падначаленай бачаць, што не памыліліся.



Наладка абсталявання ў Сухараўскай участковай бальніцы.

— Менш траціцца часу на пустыя паездкі, — задаволены вынікамі Сяргей Караеў. — Перадача інфармацыі адбываецца імгненна, наладзіўся электронны дакументабарот, даводзім да ведама сваіх вясковых калег загады, новыя распрацоўкі абласнога ўпраўлення аховы здароўя і нашага міністэрства.

Мясцовыя жыхары станоўча ацанілі новаўвядзенні. Калі раней трэба было для ўдакладнення дыягназу ехаць ў магілёўскую паліклініку, то цяпер дастаткова вясковай амбулаторыі. У тых жа Вільчыцах па відэасувязі высветлілі, наколькі сур'ёзны стан у маладога чалавека, на шыі якога выскачыў карбункул. Магілёўскі ўрач уважліва разглядзеў нагнаенне і тэрмінова накіраваў пацыента ў бальніцу. Яшчэ адзін малады чалавек атрымаў кансультацыю лор-урача наконт падазронай сыпкі на міндалінах.

— Так працаваць значна прасцей, — разважае загадчык Вільчыцкай амбулаторыі Рыгор Маісееў. — Пацыент прыйшоў да нас у кабінет, мы яго агледзелі, а калі нешта не зразумела, звязаліся з вузкімі спецыялістамі. І паліклініку разгрузілі ад народу, і хвораму не трэба кудысьці ехаць.

У некаторых медыцынскіх установах, дзе цяпер дзейнічае гэта паслуга, спачатку сумняваліся, ці будзе ад яе карысць. Зараз упэўніліся, што сапраўды стала лягчэй працаваць. Асабліва рады былі далучыцца да перадавых метадаў абслугоўвання нядаўнія выпускнікі медыцынскіх устаноў.

— На ФАПах працуюць маладыя ініцыятыўныя фельчары, якім бывае патрэбна дапамога вопытных спецыялістаў, — кажа Вольга Масольд. — Адна справа тэорыя, і зусім іншая — практыка. Апошняга моладзі вельмі нестае.

Алеся Пракапнёва працуе загадчыцай Вендаражскай амбулаторыі другі год. Наватарскі падыход да справы ўспрыняла з захапленнем. Цяпер на выезд па выкліку разам з неабходным медыцынскім інструментам бярэ і ноўтбук. Былі выпадкі, калі даводзілася тэрмінова выходзіць на сувязь з хірургам або неўролагам. Звярталася па дапамогу начмеда, калі ўзнікла пытанне наконт групы інваліднасці, удакладняла нюансы па кардыяграме.

— Такая форма абслугоўвання дапамагае не толькі маладым спецыялістам, але і больш спрактыкаваным, — кажа малады ўрач. — Наша прафесія не даруе памылак. Плюс яшчэ ў тым, што не трэба рабіць двайную работу. Усё афармляецца ў электронным выглядзе: фіксуем дыягназ, апісваем ход лячэння, а хутка будзем уносіць і вынікі лабараторных аналізаў.

Кожная капейка пад кантролем

Прыклад, калі паліклініка сама бярэцца за пошук грошай для рэалізацыі сваіх ідэй, на жаль, пакуль што нетыповы для Беларусі.

Фота Нэлі ЗІГУЛІ.

Начмед паліклінікі №11 Наталля Федасеева на сувязі з загадчыкам Вільчыцкай амбулаторыі Рыгорам Маісеевым.

Прынята лічыць, што раз установа бюджэтная, значыць сродкі для ўдасканалення матэрыяльна-тэхнічнай базы павінна даць дзяржава. Кіраўніцтва 11-й паліклінікі глядзіць значна далей. І не баіцца адказнасці. Ініцыятыва «Васа», як называецца гэты праект, ажыццяўляецца ў рамках Праекта ЕС/ПРААН «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь». На рэалізацыю яе Еўрапейскі саюз і Праграма развіцця ААН выдзелілі 13 801,4 еўра. І за кожны еўрацэнт павінна быць справаздача.

— Кожны наш крок адсочвае ПРААНаўская камісія, — кажа **начмед паліклінікі №11 Наталля ФЕДАСЕЕВА.** — Эксперты назіралі, як мы працуем з гэтай праграмай, як нашы ўрачы валодаюць ёю, выязджалі нават з імі на дом, глядзелі, як адбываюцца кансультацыі па «Скайпе». Іх цікавіла, наколькі палепшылася даступнасць медыцынскіх паслуг, наколькі гэта наогул трэба было насельніцтву. І пераканаліся на свае вочы — трэба.

Па ўмовах дагавора паліклініка за свой кошт аплачвала падключэнне да сусветнай сеткі, набывала сумкі для ноўтбукаў, навушнікі. Тут не шкадавалі грошай на якасныя вэб-камеры, калонкі, бо рабілі гэта не для справаздачы, а дзеля таго, каб зручна было ўрачам разгледзець на экране нават драбязу на целе пацыента. Каб цалкам выключыць магчымасць, што нешта недачулі і зрабілі не так. Не эканомілі і на паслугах аператара мабільнай сувязі. Выбралі найлепшага.

Сёння паўсюдна вядзецца аптымізацыя. У Магілёўскім раёне гэта робіцца па прынцыпе: закрываецца ФАП , дзе невялікая колькасць насельніцтва, затое непадалёк адкрываецца амбулаторыя, дзе замест фельчара ўрач плюс абслуговы транспарт. Анлайн-сувязь робіць гэтыя амбулаторыі спадарожнікамі цэнтральнай паліклінікі. І калі б не выйграныя грошы, невядома, калі б гэты прагрэс яшчэ дайшоў да вёскі.

— Першы транш склаў 159 мільёнаў 311 тысяч рублёў, мы яго цалкам асвоілі, — расказвае **намеснік галоўнага бухгалтара Ала ЦУМАРОВА.** — Можна было набыць толькі тое, на што выдзяляліся грошы, прычым без усякай перадаплаты. Кожную накладную капіравалі і адсылалі ў Мінск вядучым праекта для ўзгаднення з нашым міністэрствам эканомікі. А фінансавую справаздачу зрабілі аднымі з першых. Гэтым мы яшчэ раз пацвердзілі сваю добранадзейнасць. Цяпер чакаем другі транш.

Ініцыятыва зыходзіла ад галоўнага ўрача Сяргея Караева.

— Складаней за ўсё было рабіць справаздачы, бо там усё разлічана да дробязяў, кожны крок трэба тлумачыць. Калі гэтага не зрабіць, там могуць вырашыць, што грошы не адпрацаваны, — кажа Вольга Масольд. — У інтэрнэце ў нас заведзена старонка на яндэкс-дыску, дзе мы ўсе мерапрыемствы распісалі. Кожнае з васьмі ў асобнай папцы. Калі выбіралі абсталяванне, купляліі нешта — усё гэта фатаграфавалі і выкладвалі ў інтэрнэт. А нашы еўрапейскія спонсары адсочвалі працэс.

За станам пацыента сочыць «Лекар»

На абслугоўванні 11-й паліклінікі 29 тысяч жыхароў Магілёўскага раёна. Сучасныя тэхналогіі дапамогуць праводзіць прафілактычную работу, карэктаваць лячэнне, праводзіць урачэбна-кансультацыйную камісію на адлегласці. Гэта рабіць значна лягчэй яшчэ і таму, што ўвядзенне новага віду медабслугоўвання супала з запускам медыцынскай інфармацыйнай сістэмы «Лекар», якая зараз паўсюдна ўкараняецца ў краіне. У паліклініцы №11 усе тэрапеўтычныя і педыятрычныя кабінеты былі камп'ютаразаваны і аб'яднаны ў адну сетку.

Урачам цяпер можна, не адыходзячы ад стала, адным клікам мышы атрымаць поўнае «дасье» на хворага. Новая праграма па выпісцы бальнічных лістоў дазваляе паглядзець, колькі разоў ён быў на прыёме ва ўрача, з якім дыягназам, якое атрымаў лячэнне. А яшчэ медыкам не трэба марнаваць час на нейкі там статыстычны аналіз. Праграма сама падлічыць, колькі за месяц выдадзена бальнічных лістоў, па якіх захворваннях і гэтак далей. Усё гэта вельмі зручна для справаздачы. Начмед кантралюе, як падначаленыя працуюць з праграмай, як часта і наколькі якасна запаўняюць амбулаторныя карткі.

— У планах паступова ахапіць відэасувяззю ўсе свае 33 падраздзяленні з ліку бальніц, амбулаторый і ФАПаў, — кажа галоўны ўрач. — Гэтым мы даб'ёмся больш дакладнай пастаноўкі дыягназаў і, як вынік, зніжэння ўзроўню захваральнасці і смяротнасці.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
zigulya@zviazda.by
Фота з архіва Вольгі МАСОЛЬД

Фота Нэлі ЗІГУЛІ.

Каардынатар праекта Вольга Масольд.

алімпіец
ЗВЯЗДА
ВЫПУСК № 7 (44)
Сумесны праект газеты «Звязда», Нацыянальнага алімпійскага камітэта і Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь

■ Экспрэс-навіны

БУДЗЕ ШМАТ ГАНАРОВЫХ ГАСЦЕЙ

На цырымоніі адкрыцця XXXI летніх Алімпійскіх гульняў у Рыа-дэ-Жанэйра чакаецца прысутнасць больш як 40 кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў з усяго свету.

Акрамя таго, 5 жніўня, у дзень адкрыцця Алімпіяды-2016, на трыбунах легендарнага стадыёна «Маракана», што ўмяшчае амаль 80 тыс. гледачоў, будуць прысутнічаць больш як 50 міністраў спорту. Нагадаем, на Алімпійскіх гульнях у Рыа будзе разыграна рэкордная колькасць камплектаў узнагарод — 306 у 33 відах спорту. Арганізатары чакаюць, што ў спаборніцтвах прымуць удзел 206 нацыянальных камандаў, што таксама з'яўляецца рэкордам за ўвесь час правядзення Алімпіяд. Першыя ў гісторыі Гульні ў Паўднёвай Амерыцы завершацца 21 жніўня.

БЫЦЬ, ЯК АЛІМПІЕЦ

Такое ж адзенне, як у беларускіх спартсменаў, што адпраўляюцца ў Рыа-дэ-Жанэйра, можа заказаць і набыць любы ахвотны. Алімпійская форма ўключае ў сябе розныя элементы гардэроба, што дае магчымасць камбінавання вырабаў паміж сабой і дазваляе апранацца як у класічным, так і ў паўсядзённым стылі.

Распрацавалі мадэлі маладыя беларускія дызайнеры Іван Айплатаў і Юлія Латушкіна. Калекцыя ўжо ёсць ва ўсіх буйных універмагах. Вялікім попытам у пакупнікоў карыстаюцца трыкатажныя вырабы: майкі, сукенкі, фуфайкі, бомберы. Цэны на гэтыя тавары даступныя: фуфайка, напрыклад, каштуе ад 15 да 30 рублёў, сукенкі — ад 35 да 40 рублёў.

Парадная форма ад Юліі Латушкінай, у якой каманда была на афіцыйнай цырымоніі провадаў і будзе выходзіць на стадыён «Маракана» падчас адкрыцця і закрыцця Алімпіяды, таксама стане даступнай для пакупнікоў, атрымаць яе можна будзе па індывідуальным заказе.

«ЗАЛАТАЯ» МОЛАДЗЬ ВЕСЛАВАННЯ

У Заслаўі стартаваў чэмпіянат свету (да 23 гадоў) па веславанні на байдарках і каноэ

Пазмагацца за званне наймацнейшых да нас прыехалі больш як тысяча спартсменаў з 62-х краін. Беларусь на сусветным першынстве прадстаўляюць чатыры дзясяткі весляроў.

Да старту чэмпіянату краіна-гаспадыня падрыхтавалася добра: у Заслаўі пабудаваны новы мост, які злучае тэрыторыю вяслярнага канала з трасай, арганізавана паркоўка, з'явіліся кропкі выязнога гандлю, устаноўлена трыбуна, здольная змясціць 800 гледачоў. На пачатку не абышлося і без скандальных навін. У члена французскай каманды ў ходзе асабістага дагляду пры ўездзе ў Беларусь была выяўлена забароненая ў спаборніцкі перыяд субстанцыя. Дзяржаўны мытны камітэт неадкладна накіраваў гэтую інфармацыю ў Нацыянальнае антыдопінгавае агенцтва. Там пацвердзілі, што «рэчыва адносіцца да адмысловых субстанцый S9 (глюкакард) і забаронена да ўжывання ў спаборніцкі перыяд».

Аднак **намеснік дырэктара НАДА Валерый РАКОВІЧ** адзначыў, што спартсменцы, у якой выявілі лекавыя прэпараты, дыскваліфікацыя, хутчэй за ўсё, не пагражае.

- Прэпарат забаронены ВАДА толькі ў спаборніцкі перыяд. На момант жа яго выяўлення на мытні спаборніцтвы яшчэ фармальна не пачаліся, а значыць, і дыскваліфікаваць няма за што.

Учора на вяслярным канале прайшлі кваліфікацыйныя заезды. Сёння на турніры будуць разыграны першыя медалі, ну а завершацца спаборніцтвы ўжо заўтра.

ПРАГРАМА ЛЕТНІХ ГУЛЬНЯЎ МОЖА ПАПОЎНІЦЦА 5 ВІДАМІ СПОРТУ

Камісія Міжнароднага Алімпійскага Камітэта падтрымала ўключэнне ў алімпійскую праграму пяці відаў спорту — каратэ, сёрфінгу, скалалажання, скейтбордынгу і бейсбола/софтбола, паведамляе афіцыйны сайт МАК.

Паўнавартаснае ўключэнне гэтых відаў у праграму Гульняў чакаецца ўжо ў 2020 годзе ў Токіа. Канчатковае рашэнне будзе прынята 3 жніўня на сесіі МАК у Рыа-дэ-Жанэйра.

Уключэнне гэтых відаў у праграму Алімпійскіх гульняў дадасць 18 камплектаў узнагарод, у розыгрышы якіх прымуць удзел 474 спартсмены. Характэрна, што бейсбол уваходзіў у афіцыйную праграму Алімпіяды з 1992 па 2008 год, а софтбол — з 1996 па 2008

Таццяна ТРОІНА:

«Перад намі стаяць сур'ёзныя задачы»

Лідар баскетбольнай зборнай — пра мэты ў Рыа, допінг весляроў і крыху пра сваё жыццё

Наша жаночая баскетбольная зборная — адна з самых паспяховых камандаў краіны. Толькі яна прадставіць Беларусь на Алімпіядзе ў гульнявых відах спорту. На галоўных стартах чатырохгоддзя нашы дзяўчаты ўжо былі — 8 гадоў таму. Тады ў Пекін яны ехалі без звышзадач, тое, што трапілі на Гульні, было ўжо шчасцем. Цяпер, калі за плячыма некалькі чэмпіянатаў Еўропы і свету (а там былі і поспехі, і правалы), падапечныя Анатоля Буяльскага адправіліся ў Бразілію з вялікім жаданнем перамагаць, бо для многіх з іх гэта Алімпіяда можа стаць апошняй. Шэсць баскетбалістак са складу сёлетняй зборнай былі і ў абойме той, пекінскай, каманды.

Біяграфічная даведка

Таццяна Троіна нарадзілася ў Мінску 30 чэрвеня 1981 года. Баскетболам пачала займацца ў дзевяць гадоў. У секцыю яе прывялі бацькі (у мінулым таксама баскетбалісты). Выступала за юнацкую і маладзёжную зборную Беларусі, сёння з'яўляецца адной з самых вопытных баскетбалістак алімпійскай зборнай. Таццяна — бронзавая прызёрка чэмпіянату Еўропы — 2007 і ўдзельніца Алімпіяды ў Пекіне. За сваю кар'еру выступала ў баскетбольных клубах ЗША, Латвіі, Ізраіля, Румыніі, Францыі, Расіі і Польшчы.

Сярод іх Таццяна Троіна, без якой наша «дрымцім» ужо не наша. Яна своеасаблівы рухавік гэтай зборнай (калі трэба, завядзе), дасведчаны баец (не пахіснецца ў адказны момант) і проста пазітыўны і прыемны чалавек. Напярэдадні ад'езду зборнай у Рыа-дэ-Жанэйра мы сустрэліся з Таццянай, каб адчуць настрой нашых дзяўчат перад адказным стартам, абмеркаваць дзёрзкую гульню Троінай і даведацца пра змены ў яе асабістым жыцці.

— Таня, як прайшлі апошнія перад ад'ездам зборы?

— Мы сабраліся ў Раўбічах пасля невялікага двухтыднёвага адпачынку. Гэты збор праходзіў практычна ў поўным складзе, не хапала толькі Алены Леўчанкі і Ліндсэй Хардзінг. Прабылі там 10 дзён, усё прайшло добра, вялікую ўвагу ўдзялялі непасрэдна гульні, успаміналі старыя камбінацыі, кардынальна новага нічога не ўводзілася. Займаліся, вядома, і фізічнай формай, таму што два тыдні ўсё ж такі кожны адпачываў па-рознаму.

— Адчуванне перад Алімпійскімі гульнямі ў Пекіне і цяпер розныя?

— Прайшло ўжо 8 гадоў, згуляны тры чэмпіянаты Еўропы і чэмпіянат свету, набраны каласальны вопыт. Таму розніца ў адчуваннях вялікая. У 2008 годзе мы былі рады толькі таму факту, што трапілі на Гульні, цяпер таксама, вядома, рады, але гэтым ужо не абмяжоўваемся. Сёння перад намі стаяць сур'ёзныя задачы — выступіць добра і заняць не ніжэй за 5-е месца.

— Саперніцы па групе вядомыя ўжо даўно. Можаце нешта канкрэтнае сказаць пра гэтыя каманды?

— На такім турніры «лёгкіх» камандаў ужо няма. Усе яны засталіся за кваліфікацыйным раўндам, таму немагчыма сказаць, што ў кагосьці мы выйграем, а камусьці дакладна прайграем. Ды і наогул, загадваць — няўдзячная справа.

— Раней у Бразіліі былі?

— Не, але ляцець туды абсалютна не баюся. Я лічу, што ўся гэтая шуміха з нагоды розных пагроз і экзатычных захворванняў — пустая справа. Калі людзі ўзяліся праводзіць настолькі маштабны турнір, то рызыкаваць здароўем спартсменаў, перш за ўсё, сваіх, і людзей, якія прыязджаюць з усяго свету, я думаю, ніхто не будзе.

— Неяк прызнаваліся, што баіцеся лятаць на самалёце. Гэты страх застаўся?

— Раней такога за сабой не заўважала, а цяпер чым больш лятаю, тым больш пачынаю пра гэта думаць. Да таго ж паўплывалі апошнія негатыўныя падзеі ў свеце. Гэта нават страхам не назавеш, проста я часта думаю пра гэта.

— Вы ляціце ў Рыа першымі з беларусаў. Чым абумоўлены такі ранні ад'езд?

— Перш за ўсё акліматызацыяй. З моманту прылёту ў Рыа-дэ-Жанэйра да старту нашых гульняў пройдзе 10 дзён. Калі б у нас быў від спорту, дзе выступіць трэба было ўсяго толькі раз, то, можа, столькі часу б і не спатрэбілася, а так важна прыйсці ў сябе пасля пералёту, прывыкнуць да ўмоў надвор'я, да ўсяго. Як мінімум мы згуляем 5 матчаў за 10 дзён, сіл для гэтага трэба шмат.

— Ад таго, як вы выступіце на Алімпіядзе, будзе залежаць, ці працягнеце спартыўную кар'еру?

— Я яшчэ не прымала ніякіх канкрэтных рашэнняў, сапраўды чакаю заканчэння гэтых Гульняў, каб потым ужо адштурхоўвацца ад іх. Ці прадоўжу я наогул гуляць у баскетбол, будзе залежаць, хутчэй, ад маіх унутраных адчуванняў, а не ад месца, якое зойме зборная Беларусі на Алімпіядзе. Я паспрабую ацаніць сваю будучыню цвярозым позіркам і зразумець, ці варта мне гуляць далей.

— Ваша клубная кар'ера была багатая на розныя замежныя краіны і на тытулы. Можаце вылучыць найбольш паспяховы перыяд?

— У плане дасягненняў у мяне выдаўся добры прамежак часу, калі я выступала за польскі «Лотас» (2003—2005 г.). Там я станавілася чэмпіёнкай Польшчы, двойчы ў нас былі сярэбраныя медалі Еўралігі. Нядрэнны сезон быў у Ізраілі, калі мой клуб выйграў мясцовы чэмпіянат. Падчас выступлення ў Расіі разам з клубам займала трэцяе месца ў Суперлізе А, але мне было не вельмі цікава і камфортна там у гульнявым плане.

— Усё жыццё гуляеце пад 13-м нумарам. Гэтая лічба значыць для вас нешта асаблівае?

— Пад гэтым нумарам выступала яшчэ ў дзіцячых зборных, потым прыйшла ў дарослую каманду, і так атрымалася, што мне далі яго зноў. Напэўна, браць нумар ніхто не хацеў, а ў мяне з гэтай лічбай ніякіх гісторый не звязана, забабонаў няма.

— Таццяна Троіна на паркеце і за яго межамі — гэта розныя людзі?

— Характар ёсць усюды, яго ў кішэню не засунеш. Прынцыповых адрозненняў, я думаю, няма. Упартасць, дзёрзкасць дапамагае мне вырашаць пэўныя задачы на пляцоўцы. У жыцці, напэўна, я таксама досыць няўступчывы чалавек.

— Можна прывесці вас у прыклад як спартсменку, якая змагла сумясціць спорт з замужжам?

— Напэўна, не, таму што я ўжо паспела развесціся. Але сказаць, што жанчына-спартсменка не можа сумяшчаць гэтыя рэчы, нельга. Усё тут індывідуальна. Я не магу сказаць, што мой шлюб распаўся з-за таго, што я гуляю ў баскетбол, так атрымалася з іншых прычын. Галоўнае, каб выбраннік разумеў і прымаў твой лад жыцця, і з гэтым у маёй сям'і ўсё было нармальна.

— Ужо думалі, чым бы хацелі заняцца пасля вялікага спорту?

— Канкрэтных думак няма, але я дакладна хацела б застацца ў спорце і займацца чымсьці, звязаным з баскетболам.

— Сёння ў беларускім баскетболе, на ваш погляд, ёсць праблемы?

— Я магу казаць пра гэта толькі з боку гульца. Дарэчы, вось таму я і хачу застацца ў спорце, каб разабрацца, ці ёсць праблемы. Глабальных, мне здаецца, няма. З тых часоў, як мы пачалі ўдзельнічаць на ўсіх топ-турнірах, сітуацыя палепшылася. Дзяржава пачала звяртаць на нас увагу, падтрымліваць і ісці насустрач. А раней даходзіла да таго, што і нумары мы на майкі самі сабе прышывалі, і форму ўручную мылі. Нейкія дробныя пытанні, магчыма, узнікаюць і цяпер, але яны настолькі неістотныя, што не варта нават і казаць.

— Як паставіліся да допінгавага скандалу, які закрануў нашу зборную веславання?

— Думаю, гэтая навіна ўдарыла па галаве не толькі саміх спартсменаў, але і ўсіх неабыякавых да спорту людзей. Вельмі непрыемна. Я сама асабіста знаёмая з некаторымі з нашых весляроў, ведаю іх не толькі як спартсменаў, але і як людзей. Яны вельмі адкрытыя, няхітрыя хлопцы, якія не пайшлі б на махінацыі, каб потым усё ўтойваць. Вядома, гэта велізарная страта, найперш для краіны, бо адхілены тыя людзі, якія рэальна прэтэндавалі на ўзнагароды і за якіх заўсёды хочацца хварэць.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.
lobazhevich@zviazda.by

ШТО СТРАШНЕЙ — СУПЕРЛЮДЗІ АБО СУПЕРМУРАШКІ?

У сучасным свеце адбываецца вялікая колькасць падзей у сферы развіцця навукі і тэхналогій, і чалавек, натуральна, не паспявае сачыць за ўсімі. Гэта тычыцца як банальных бытавых навінак, так і ўдасканаленняў чалавечага жыцця з вобласці высокіх тэхналогій. А між тым прагрэс падкідвае абывацелю такія сюрпрызы, ад якіх у яго могуць і валасы ўстаць дуба, а можа і з'явіцца надзея на цуды пры жыцці. Мяркуйце самі, як той казаў, з апошняга, адкрытага.

АМЕРЫКАНЦЫ НЕ ХОЧУЦЬ БЫЦЬ ЗВЫШЛЮДЗЬМІ

Грамадзяне ЗША з асцярогай ставяцца да апошніх навуковых прарываў, якія дазваляюць людзям здабыць звышчалавечыя здольнасці і здароўе. Пра гэта са спасылкай на вынікі агульнанацыянальнага сацыялагічнага апытання паведамляе Popular Science.

Сацыёлагі з цэнтра Pew Research апыталі 4700 жыхароў краіны, спрабуючы даведацца пра стаўленне да трох новых тэхналогій: рэдагавання геному чалавека, увядзення электронных імплантатаў у мозг і пералівання сінтэтычнай крыві. Хоць такія тэхналогіі пакуль знаходзяцца на пачатковым узроўні, іх патэнцыял велізарны. «Выпраўленне» геному дазволіць пазбавіцца ад спадчынных захворванняў, мікрачыпы ў мозгу паскораць апрацоўку інфармацыі, а сінтэтычная кроў падыме цягавітасць арганізма.

Аднак рызыкі гэтых інавацый займаюць амерыканцаў больш, чым іх карысць. 68% апытаных выказалі занепакоенасць з нагоды рэдагавання геному, 69% — на тэму мазгавых імплантатаў, 63% — з-за штучнай крыві. Кажучы аб прычынах сваіх трывог, амерыканцы адзначылі, што гэтыя тэхналогіі па паляпшэнні чалавечай прыроды дастануцца толькі багатым і ўзмоцняць няроўнасць сярод людзей. Акрамя таго, амерыканцы схільныя ўхваляць імплантаванні мікрачыпаў, калі яны будуць часовымі. У цэлым апытаныя ўхваляюць новыя біятэхналогіі, пакуль тыя толькі аднаўляюць здароўе чалавека, але не надзяляюць яго новымі здольнасцямі.

Падобнае апытанне, праведзенае Pew Research у 2014 годзе, паказала, што траціна амерыканцаў абвінавачваюць новыя тэхналогіі ў тым, што іх працоўны дзень стаў даўжэйшы.

СУПЕРМУРАШКІ Ў ВЯЛІКАБРЫТАНІІ

Навукоўцы Ёркскага ўніверсітэта прадэманстравалі, наколькі моцна супермурашкі Lasius neglectus распаўсюдзіліся па Вялікабрытаніі, пагражаючы мясцовым экасістэмам і жывёлам. Цяпер вядома каля дзясятка інвазій насякомых, аднак біёлагі лічаць, што ступень уварвання мурашак недаацэнена, паведамляе EurekAlert!

Нягледзячы на назву, супермурашкі па памерах меншыя, чым віды мурашак, характэрных для Брытанскіх астравоў. Аднак яны будуюць гіганцкія калоніі са мноствам матак і тунэлямі паміж гнёздамі, якія могуць працягнуцца на некалькі кіламетраў. L.neglectus, такім чынам, выцясняюць абарыгенных (мясцовых) насякомых, якія насяляюць пераважна сады. Супермурашкі першапачаткова з'явіліся на Блізкім Усходзе і з тых часоў распаўсюдзіліся па ўсёй Еўразіі. Тым не менш на Брытанскіх астравах яны былі заўважаныя толькі ў 2009 годзе.

Упершыню L.neglectus былі выяўленыя на тэрыторыі саду ў Глостэршыры, пасля яны знайшліся ў шасці іншых месцах Вялікабрытаніі, уключаючы горад Істбарн і Хендан, што ў ваколіцах Лондана. Праз пяць гадоў мурашкі апынуліся за 160 кіламетраў на ўсходзе ад сталіцы, а таксама ў графстве Кембрыджшыр. У 2016 годзе былі знойдзеныя калоніі ў Ёркшыры і на паўднёвым узбярэжжы Англіі. Улічваючы хуткасць з'яўлення новых гнёздаў супермурашак, навукоўцы ацанілі ступень уплыву, які насякомыя могуць аказаць на экасістэмы. Паводле слоў даследчыкаў, інвазіўныя мурашкі выцясняюць іншыя віды. Да гэтага часу L.neglectus ладзілі калоніі ў садах і цяпліцах, аднак біёлагі папярэджваюць, што яны могуць распаўсюджвацца і ў дзікай прыродзе.

Інвазіяй называюць уварванне на тэрыторыю нехарактэрнага для яе біялагічнага віду без удзелу чалавека.

БІЁЛАГІ СПЫНЯЦЬ СТАРЭННЕ СЭРЦА?

Біёлагі з іспанскага Нацыянальнага цэнтра сардэчна-сасудзістых даследаванняў выявілі, што целамеры — канцавыя ахоўныя ўчасткі храмасом — у клетках міякарда ў мышэй хутка пакарочваюцца з узростам, пагаршаючы сардэчную дзейнасць. Навукоўцам удалася прадухіліць старэнне сэрца, прыглушыўшы актыўнасць аднаго з бялкоў. Вынікі даследавання апублікаваны ў Journal of Cell Biology.

Нованароджаныя мышы могуць эфектыўна аднаўляць пашкоджаную сардэчную мышцу, аднак у дарослых грызуноў сардэчныя прыступы прыводзяць да незваротных парушэнняў, сардэчнай недастатковасці і смерці. З узростам кардыяміцыты — мышачныя клеткі сэрца — выходзяць з клетачнага цыкла, што абмяжоўвае іх размнажэнне і рэгенератыўныя функцыі.

Навукоўцы вырашылі праверыць, ці звязана даўжыня целамер са старэннем кардыяміцытаў. Даследчыкі высветлілі, што канцы храмасом хутка пакарочваюцца на працягу першага тыдня пасля нараджэння мышэй. Гэта супала з памяншэннем сінтэзу целамеразы — ферменту, які аднаўляе целамеры. У канчатковым выніку ўключаецца клетачная сістэма, якая перашкаджае пашкоджанню ДНК праз прыгнечанне росту і размнажэння клетак. Ключавым кампанентам сістэмы з'яўляецца бялок-інгібітар P21.

Аднак калі прыглушыць актыўнасць бялку P21, то гэта падаўжае здольнасць кардыяміцытаў да росту і размнажэння, дазваляючы мышам тыднёвага ўзросту больш эфектыўна рэгенераваць пашкоджаныя сардэчныя тканкі. Навукоўцы таксама працуюць над тым, каб стварыць жывёл з павялічаным сінтэзам целамеразы, каб праверыць, ці паўплывае падаўжэнне целамер на паспяховае аднаўленне кардыяміцытаў.

НОВАЯ ЗЕЛАНДЫЯ ЗБІРАЕЦЦА ЗНІШЧЫЦЬ ДРАПЕЖНІКАЎ

Новая Зеландыя першай у свеце прыняла рашэнне знішчыць усіх дзікіх драпежнікаў на сваёй тэрыторыі — да 2050 года. Такімі захадамі ў краіне спадзяюцца выратаваць ад знікнення птушак ківі і мясцовых папугаяў, паведамляе Gizmodo.

На знішчэнне сотняў тысяч пацукоў, апосумаў, тхароў, гарнастаяў і дзікіх кошак ужо выдзелена 28 мільёнаў долараў. Усе гэтыя віды трапілі (ці былі завезены) у Новую Зеландыю з іншых тэрыторый і штогод забіваюць мільёны мясцовых птушак. Венчурная кампанія Predator Free New Zealand Ltd будзе шукаць і фінансаваць канкрэтныя праекты па знішчэнні драпежнікаў.

Адзначаецца, што такая амбіцыйная задача запатрабуе распрацоўкі новых тэхналогій барацьбы са шкоднікамі — акрамя традыцыйных пестыцыдаў і агароджаў. Predator Free New Zealand Ltd паставіла сваёй мэтай здзейсніць «навуковы прарыў», у выніку якога да 2025 года ў краіне будзе знішчаны як мінімум адзін від драпежнікаў. Пры ўсёй жорсткасці гэтага плана новазеландцы адзначаюць, што да з'яўлення на астравах еўрапейцаў (а таксама маоры, якія прывезлі з Палінезіі пацукоў і сабак), экасістэма Новай Зеландыі была больш гарманічнай і збалансаванай. «Унікальныя жывёлы і расліны з'яўляюцца цэнтральным элементам нашай нацыянальнай ідэнтычнасці. Мільёны гадоў яны эвалюцыянавалі ў свеце, дзе не было млекакормячых, і ў выніку гэтага яны аказаліся надзвычай уразлівымі да прышлых драпежнікаў», — заявіла міністр Новай Зеландыі па пытаннях захавання навакольнага асяроддзя Мэгі Бэры.

■ Дайджэст

ФУТУРОЛАГ ПРАДКАЗВАЕ НЕЎМІРУЧАСЦЬ ДА 2029 ГОДА

У розных СМІ даволі часта з'яўляюцца матэрыялы пра тое, што навукоўцы паступова набліжаюцца да таго, каб навучыцца падаўжаць чалавечае жыццё, падмануўшы законы прыроды. Многія задаюцца вечным пытаннем: калі ж чалавек зможа на самай справе авалодаць неўміручасцю? Адзін з самых уплывовых футуролагаў свету Рэй Курцвейл у сваім нядаўнім інтэрв'ю паабяцаў, што пачынаючы з 2029 года навука і медыцына дазволяць працягваць чалавечае жыццё практычна неабмежавана.

Рэйманд Курцвейл нарадзіўся ў Нью-Ёрку ў 1948 годзе. З самага дзяцінства ён марыў стаць вынаходнікам і падарыць свету новыя тэхналогіі. У 15 гадоў ён напісаў сваю першую камп'ютарную праграму, у 1970-м годзе скончыў Масачусецкі тэхналагічны інстытут, а ў 1974-м адкрыў уласную кампанію, якая займаецца тэхналогіямі распазнавання гаворкі. Перспектыўны бізнес зрабіў Курцвейла мільянерам, што дазволіла вынаходніку і далей займацца стварэннем новых тэхналогій. Сусветную вядомасць ён атрымаў дзякуючы сваім работам у галіне футуралогіі, у тым ліку свайму абгрунтаванню тэхналагічнай сінгулярнасці.

Цяпер Рэй Курцвейл займае пасаду тэхнічнага дырэктара Google, працягвае займацца распрацоўкамі ў галіне штучнага інтэлекту і час ад часу дзеліцца з журналістамі сваім бачаннем недалёкай будучыні чалавецтва. Напрыклад, у адным сваім нядаўнім інтэрв'ю Курцвейл сказаў, што да 2020 года чалавецтва пачне актыўна ўжываць нанаробатаў у медыцыне. Гэтыя малюсенькія механізмы змогуць дапоўніць ці зусім замяніць чалавеку яго натуральную імунную сістэму і тым самым атрымаць магчымасць эфектыўна супрацьстаяць усім захворванням і патагенам. Паводле слоў Курцвейла, усё гэта будзе нагадваць сітуацыю з камп'ютарнымі антывірусамі, калі чалавек зможа загрузіць з інтэрнэту абнаўленне для сваёй імуннай сістэмы і не перажываць з нагоды ўзнікнення новага штама небяспечнага віруса.

Паводле слоў футуролага, ужо да 2029 годзе медыцына дасягне таго ўзроўню, калі людзям не трэба будзе хвалявацца аб працягласці свайго жыцця. Раней Курцвейл заяўляў, што неўміручасць будзе дасягнута толькі ў 2030-х гадах, але цяпер вырашыў зрушыць дату бліжэй да сённяшняга дня. Што ж, вельмі хочацца верыць, што навуковец мае рацыю і чалавецтву сапраўды ўдасца так моцна развіць сваю навуку ў бліжэйшыя дзесяцігоддзі. Зразумела, неўміручасць выклікае нямала пытанняў, у тым ліку аб перанаселенасці планеты і недахопу харчавання. Ды і многія навукоўцы да заяў футуролага ставяцца вельмі скептычна і лічаць іх залішне аптымістычнымі. Акрамя таго, Курцвейл ужо неаднаразова памыляўся ў сваіх прагнозах, так што застаецца толькі чакаць і верыць у светлую будучыню.

НАВУКОЎЦЫ ПАДЛІЧЫЛІ ЎСЕ РАСЛІНЫ

У Каралеўскім батанічным садзе ў Вялікабрытаніі правялі першае ўсёабдымнае абследаванне сусветнай флоры і прыйшлі да высновы, што ўсяго навуцы вядома каля 390 900 відаў раслін.

Батанікі вывучылі існуючыя базы даных і выявілі там мноства паўтораў — часцяком адна і тая ж расліна ўлічвалася пад рознымі назвамі. Увогуле, навукоўцы настойваюць на лічбе 390 900 відаў (за вылікам водарасцяў, імхоў, антацэравых і пячоначных імхоў), з якіх прыкладна 369 400 відаў належаць кветкавым. Даследчыкі сцвярджаюць, што тысячы відаў раслін усё яшчэ застаюцца неапісанымі. Адкрыцці адбываюцца пастаянна: так, у 2015 годзе было апісана 2034 новыя віды. У іх ліку — дрэва Gilbertiodendron maximum (у Габоне), якое вырастае да 45 метраў у вышыню, 90 новых відаў бягоній і пяць новых відаў цыбулі. Часцей за ўсё новыя расліны адкрываюць батанікі з Кітая, Аўстраліі і Бразіліі.

Навукоўцы папярэджваюць, што 21% сусветнай флоры знаходзіцца пад пагрозай вымірання — перш за ўсё з-за высякання лясоў і знішчэння мангравых зараснікаў. Хваробы і шкодныя насякомыя таксама былі прызнаныя крыніцай небяспекі. Уразлівымі да наступстваў глабальнага пацяплення выявіліся 10% усёй глебы Зямлі. Нарэшце, батанікі разгледзелі праблему інвазіўных відаў — раслін, якія трапляюць у новыя для сябе экасістэмы і там разбуральна ўплываюць на мясцовую флору. Агульную шкоду ад такіх відаў яны ацэньваюць у 5% ад глабальнага ВУП.

У верасні 2015 года навукоўцы займаліся падлікам агульнай колькасці дрэў на планеце і налічылі больш за тры трыльёны

■

Матэрыялы падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.
hvir@zviazda.by

■ Прадметная гісторыя

Працягваем знаёміцца з цікавымі і незвычайнымі рэчамі з нашага мінулага.

Жэтоны ў бардэлях

Такімі жэтонамі расплачваліся ў бардэлях за пікантныя паслугі ў XIX стагоддзі ў ЗША. Выкарыстанне жэтонаў было зручным для ўладальнікаў такіх устаноў — гэта зводзіла да мінімуму магчымасць жанчын пакінуць сабе больш грошай і раскруціць кліента ў працэсе.

Набор паляўнічага на вампіраў

Чамадан, які выклікае страх, выглядае так, быццам яго канфіскавалі ў маньяка або забралі на памяць са здымак чарговага галівудскага фільма пра вампіраў. Але на самай справе такі набор — не бутафорыя і не аксесуар на Хэлоўін, а цалкам рэальная рэч з жыцця нашых продкаў. Яны насамрэч верылі ў тое, што ўсе гэтыя прылады дапамогуць ім перамагчы і забіць злоснага крывасмока. Што, дарэчы, адбілася і надалей — у кнігах на адпаведную тэматыку, а потым і ў кінематографе

■

«Адкрыццё Яна», 2007 год.

■ Падзея месяца

ДОБРЫЯ ВЕСТКІ АБ НОВЫМ ЖЫЦЦІ

Жывапіс, што ад прыватнага накіроўвае да агульначалавечага

Чарнобыльская катастрофа, упадак, Дабравесце. Рэалістычны ланцужок са зразумелым інтэртэкстам пранізвае жыццё і, як вынік, персанальную выставу беларускага імпрэсіяніста Лявона Грышука. 20 ліпеня экспазіцыя пленэрных пейзажаў «Дабравесце» адкрылася ў Палацы мастацтваў сярод іншых экспазіцый юбіляраў. Біблейскі матыў, што кажа пра шчаслівую вестку аб збаўленні чалавечага роду ад граху праз пакуты Божага Сына, тлумачыцца тут у больш «зямным» сэнсе. Дабравесце — як пазбаўленне ад трывалага болю і пераход да новага жыцця. Можа, без ахвяр, без абвяшчэння аб выратаванні, без дзівосаў. Але ў рэальным жыцці, з чалавечай сілай духу, жаданнем жыць... і ўсё ж з Евангеллем і дакладна з Богам.

Сёлета споўнілася трыццаць гадоў з часу катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, мы сталі сведкамі доўгага шэрагу прысвечаных аварыі мерапрыемстваў. Водгаласы яе адзываюцца не толькі ў юбілейныя даты, не толькі ў наш 2016-ы, а кожны дзень і нават кожную хвілін. Натуральна, у агульныя тэндэнцыі, асаблівасці беларускага выяўленчага мастацтва можна ўключыць рэфлексію на чарнобыльскія падзеі, тэмы страчанасці, закінутых земляў, жаху, прадчування катастрофы. Побач з гэтай тэндэнцыяй ідзе канцэптуалізм, што перадае перажыванні аўтара праз пэўныя вобразныя знакі.

Лявон Грышук трапіў у самае пекла катастрофы — сярод іншых ён працаваў на даху ўзарванага энергаблока, трымаў у руках радыеактыўны графіт, бачыў цемру ўзарванага рэактара.

Лявон Грышук, не паспрачаешся, працуе ў рэчышчы першай тэндэнцыі, але канцэптуалізм, калі мы выкарыстаем гэта слова як аўтарскі неалагізм (бо ў традыцыйным сэнсе слова канцэптуалістам мастака назваць нельга), патлумачыць можна таксама. У свой час Лявон Грышук трапіў у самае пекла катастрофы — сярод іншых ён працаваў на даху ўзарванага энергаблока, трымаў у руках радыеактыўны графіт, бачыў цемру ўзарванага рэактара. Кажуць, той, «хто захапляўся прыгажосцю жывога, трапіў у самы эпіцэнтр разбурэння, якое несла смерць». Несправядлівыя аксюмараны жыцця. Удзел у ліквідацыі наступстваў катастрофы абярнуўся дэпрэсіяй і хваробамі — упадак. Але Дабравесце, наступны пункт ланцужка, стала сімвалізаваць збаўленне, адраджэнне, аднаўленне. І не толькі — грэх і ахвяры ў гэтай адсылцы іграюць таксама. Бо сама катастрофа — ёсць праява чалавечага граху і хіб цывілізацыі, якая аддае нам даброты, а ўзамен патрабуе пагадненняў з сумненнем. І ахвяры — хваробы, гады пакут — трэба было прынесці, каб нарэшце «прыйсці ў норму» альбо гучней — атрымаць добрую вестку аб збаўленні.

Дык вось канцэпцыя творчасці Лявона Грышука. Мастак убачыў утылітарныя, урбаністычныя віды Чарнобыльскай АЭС, створаныя чалавечымі рукамі магутныя збудаванні, адчуў маўклівы, нечалавечы, жудасны подых узарванага рэактара, але адказаў гэтым успамінам прыродай, пейзажамі, вобразамі, жывымі краявідамі.

Тым не менш жывая прырода, якая па вызначэнні рухаецца і гучыць, у Лявона Грышука статычная альбо павольная, нямая і насцярожаная. Пакутлівая. Так невідавочна спалучэнне жывога і мёртвага маецца на ўвазе, пачынае кантактаваць і адзывацца бязрадасным узаемадзеяннем. Мастак часта працуе на адкрытай прасторы, выязджае на пленэры ў розныя мясціны. А тое, што адлюстроўваецца на палатне — усё роўна нагадвае пра нешта незваротна страчанае, хай гэта моманты з дзяцінства, закінутыя вёскі, забытыя прасторы ці непасрэднасць уражанняў, якая некалі была такой натуральнай. У кожнага з нас.

За цёмнымі і светлымі, размытымі, вобразамі на палотнах аўтара не толькі свае прывіды, але асэнсаванне агульнага шляху.

Насамрэч, збаўленне, што стаіць за Дабравесцем, тут таксама павінна быць умоўным. Гледзячы на пласт работ, прысвечаных катастрофе, што пакінула грувасткі адбітак на жыцці аўтара, зразумела — абсалютнае выратаванне не прыйдзе ніколі, ды і абсалютаў не існуе, памятайце ж.

Сама катастрофа — вынік чалавечага граху і хіб цывілізацыі, якая аддае нам даброты, а ўзамен патрабуе пагадненняў з сумненнем.

І яшчэ: нават вельмі асабісты жывапіс Лявона Грышука мае на ўвазе перажыванні не аднаго чалавека. Дабравесце ў Евангеллі прагучала для ўсяго чалавецтва. Катастрофа на АЭС шакіравала ўсю планету, грэх, ахвяры, збавенне — актуальныя для кожнага. За цёмнымі і светлымі, размытымі, вобразамі на палотнах аўтара не толькі ўласныя прывіды, але асэнсаванне агульнага шляху. Катастрофа — упадак — дабравесце. Універсальная формула, і апошні пункт у ёй непазбежны.

«Я імкнуся паказаць, што выратаванне ёсць — яно з Богам, і ёсць іншае жыццё, не толькі зямное», — кажа аўтар. Гучыць з першых вуснаў таго, каму давялося стаць ліквідатарам наступстваў чарнобыльскай катастрофы. Гучыць жыццесцвярджальна. Бо пад іншае — незямное — жыццё кожны можа падставіць свае варыянты. Нават калі гэты варыянт — новае жыццё з панядзелка.

Выстава «Дабравесце» будзе працаваць у Палацы мастацтваў да 8 жніўня.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ. *katsyalovich@zviazda.by*

■ Невядомае пра вядомых

ЯГО ПАЗНАВАЛІ ПА ГОЛАСЕ...

«Жывое слова» знакамітага радыёдыктара

Па першай адукацыі архітэктар, але па прызванні — дыктар, мовазнаўца, літаратурны крытык, дзіцячы пісьменнік. Уладзімір ЮРЭВІЧ каментаваў першы парад Перамогі ў вызваленым Мінску, калі горад яшчэ быў у руінах; больш як 40 гадоў вёў па радыё праграму «Жывое слова», праз якую даў пуцёўку ў вялікую літаратуру цэламу пакаленню таленавітых творцаў; выдаў пяць кніг апавяданняў для дзяцей, а за мовазначую працу «Слова жывое, роднае, гаваркое...» быў удастоены Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Яго паважалі, ім захапляліся, па адметным дыктарскім голасе пазнавалі на вуліцах і ў крамах.
Не так даўно споўнілася 100 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Юрэвіча, таму сёння ўспамінамі пра свайго любімага тату з нашымі чытачамі дзеліцца яго дачка Галіна.

І ў 80 — малады

— У гады вайны тата працаваў дыктарам на маскоўскім радыё на станцыі «Савецкая Беларусь» і перадаваў навіны на тэрыторыю нашай краіны. Там і познаёміўся з мамай, прывёз яе ў Беларусь. Мама часта ўспамінала: прыехалі ў Мінск, выйшлі з цягніка на вакзале, а ўвесь горад у руінах. Восем гадоў яны пражылі ў двары Камітэта радыё на Рэвалюцыйнай, у гаражы. Там жа з ім жылі татавы бацькі, якія хварэлі... Мама таксама ў той час захварэла на туберкулёз...

Але калі я нарадзілася, у сям'і ўжо была кватэра, у доме, дзе кінатэатр «Цэнтральны». Там быў вельмі цікавы асяродак — побач жылі спартсмены, артысты. Дзякуючы тату маё жыццё было багатым і насычаным. Часта браў мяне з сабой на вечарыны, канцэрты, сустрэчы, спектаклі. Вёў адкрытыя канцэрты па радыё, усе яго ведалі, на вуліцах віталіся. У свой час тата быў зоркай, мог і дапамагчы. Напрыклад, паспрыяў таму, каб вядомая актрыса Стэфанія Станюта атрымала кватэру для сына. Але для сябе вельмі рэдка нешта прасіў.

У таты голас амаль да самай смерці заставаўся такім, як у маладосці. Мне часам тэлефанавалі і шораз па голасе яго прымалі за майго мужа, нават калі бацьку ўжо было 80. Штодзень паласкаў горла, сачыў за голасам. Заўсёды быў акуратны, з прыгожай прычоскай, ветлівы. З усімі. Калі хадзіў на рынак, то прыносіў мноства падарункаў — яго пазнавалі па голасе і імкнуліся нешта падарыць. Мог размаўляць з кім заўгодна на любыя тэмы, яго цікавіла ўсё.

Уладзімір Юрэвіч з жонкай Лідзіяй, дачкой Галінай і сынам Леанідам, канец 1950-х гг.

Па строгім графіку

— Кожную раніцу тата прачынаўся а 6-й, абіраў бульбу і ставіў варыць. Потым рабіў гімнастыку. Пасля вайны ён перажыў інсульт, таму падтрымліваў сябе ў форме, клапаціўся пра здароўе. Ніколі не ўжываў алкаголю. Паснедаўшы ў 9, гадзіны дзве працаваў дома, потым ішоў на работу ў рэдакцыю «Маладосці», вярнуўшыся, яшчэ 20 хвілін спаў, нешта горад, і нават цяпер, калі бачу нешта адметнае, хочацца расказаць тату.

Кансультант для Мележа

— Тата да ўсіх ставіўся вельмі спакойна і лаяльна. Дахаты цэлыя натоўпы моладзі прыходзілі. Маладыя аўтары заходзілі не проста так: прыносілі новыя творы, хацелі параіцца, пагутарыць. Людзей, званкоў у доме было многа. Быў такі рытуал: калі Іван Мележ нешта новае пісаў, ён тэлефанаваў тату і чытаў. Зачыняліся дзверы ў кабінет, і гутаркі з Мележам доўжыліся гадзінамі. Ён не быў у нас дома, мы не сябравалі сем'ямі. Але я памятаю толькі два разы, як тата плакаў: калі памерла мама, і калі не стала Мележа.

Сем'ямі мы сябравалі з Русецкімі, Бачыламі, ездзілі адзін да аднаго ў госці, вельмі блізка сябравалі з рэдакцыяй «Маладосці». Гэта быў сапраўдны клуб па інтарэсах, супрацоўнікі часопіса часта збіраліся, нешта абмяркоўвалі, нават на адпачынак часам ездзілі разам з сем'ямі.

Да таты часта звярталіся маладыя і сталыя пісьменнікі, каб ён прачытаў іх рукапісы. Будучы вельмі адказным, чытаў усё дасканала, выконваў усе абяцанні. Гэтыя якасці выхаваў і ўва мне. Пры гэтым ніколі не павышаў голасу.

Вельмі плённа і адказна тата працаваў у «Маладосці», дзе быў адказным сакратаром. Чытаў рукапісы, разам з мастаком Янкам Раманоўскім, пляменнікам Янкі Купалы рабіў макеты нумароў. Выпісваў ганарары і хваляваўся, каб нікога не пакрыўдзіць, усім як мага больш заплаціць. Вельмі крыўдаваў, калі яму былі няўдзячныя. На жаль, такія выпадкі таксама здараліся. Моцна перажываў, хоць нічога не казаў.

Уладзімір Юрэвіч, 1976 г.

Ад гульні — да клуба

— Тата 40 гадоў вёў на радыё праграму «Жывое слова» — гэта рэкорд параўнальны з рэкордам Гінэса, на жаль, нікім не адзначаны. А пачаў працу ў час, калі беларуская мова не лічылася значнай. Нават мяне ў школе прымушалі адмовіцца ад вывучэння мовы. Я сядзела за адной партай з сынам Аляксея Кулакоўскага, і толькі нам дваім з класа выкладалі беларускую мову.

Спачатку «Жывое слова» было гульнёй, віктарынай, але потым вывучэнне беларускай мовы ў межах праграмы паглыблялася, склаўся цэлы клуб, што аб'аднаў дзяцей, якія любілі пісаць па-беларуску. Вельмі многім з іх тата ад клуба даваў рэкамендацыі для паступлення ў інстытуты, а пазней — для выдання кніг. Сёння многія з «жываслоўцаў» сталі вядомымі ў сваёй галіне людзьмі: пісьменнікі Алесь Бадак, Уладзімір Мазго, Анатоль Бутэвіч, Віктар Шніп, ды і ў цэлым гэтае пакаленне творцаў можа лічыцца выхаванцамі таты. Ён пра іх клапаціўся, як бацька, часта тэлефанаваў, пытаўся пра жонак і дзяцей, пра справы.

Тата любіў сваю краіну і сваю мову. Дадому ён заўсёды прыносіў стосы лістоў, што прыходзілі на радыё, я дапамагала іх чытаць, перабіраць. Не так даўно чарговы раз пераглядала: архіў усё яшчэ захоўваецца ў мяне дома.

З сябрамі клуба «Жывое слова», 1978 г.

Калі нарадзіўся ўнук

— Татавы кнігі я чытала, і густ літаратурны ў мяне сфарміраваўся дзякуючы яго ўплыву. Мы выпісвалі многія газеты і літаратурныя часопісы, тата ўвесь час чытаў «Звязду», лічыў яе грунтоўным і паважаным выданнем. Я некаторы час займалася фальклярыстыкай, разам з Міхасём Раманюком ездзіла ў экспедыцыі. Вывучала народныя строі. Бацьку гэта вельмі падабалася, ён мной ганарыўся, як і я ганаруся тым, што ў мяне такі тата.

Яго кніга «Слова роднае, жывое, гаваркое...» стала вынікам праграмы «Жывое слова», тата выбраў матэрыялы, якія могуць быць цікавыя для вывучэння. Зараз вельмі прыемна, калі ў праграме «Моўная хвілінка» на радыё спасылаюцца на гэтае выданне. У свой час кніга стала значнай падзеяй, яна вельмі хутка разышлася, у мяне самой ёсць толькі два асобнікі.

Тата пачаў пісаць дзіцячыя кнігі, калі ў яго з'явіўся ўнук Саша, сын майго брата. На мой погляд, яны вельмі добрыя, пазнавальныя, якраз тое, што патрэбна дзецям. Чытачам гэтыя творы таксама вельмі падабаліся, яны часта друкаваліся ў часопісах, на дзіцячых старонках газет, выходзілі асобнымі кнігамі, гучалі на радыё. І сёння татавы творы часта ўключаюць у анталогіі для дзяцей.

«Быў такі рытуал: калі Іван Мележ нешта новае пісаў, ён тэлефанаваў тату і чытаў. Зачыняліся дзверы ў кабінет, і гутаркі з Мележам доўжыліся гадзінамі».

Адна з сённяшніх маладосцеўцаў неяк, калі даведалася, што я дачка Юрэвіча, расказала гісторыю, што ў дзяцінстве ёй падарылі кнігу, дзе было апавяданне пра анучку. Яна і цяпер, калі мые падлогу, кожны раз успамінае той татаў твор.

Розум — аналітычны

— Ён быў вельмі назіральным чалавекам, калі мы ехалі ў лес ці проста гулялі па парку, ніводная дэталь не заставалася без яго ўвагі. Тата доўга абдумваў рукапісы, новыя творы. Меў аналітычны склад розуму, часта сам сабе задаваў пытанне: а чаму? Я таксама сёння часта задумваюся пра некаторыя рэчы і з'явы, пра этымалогію прозвішчаў, але няма ўжо бацькі, каб запытацца, абмеркаваць... Не было такога ў сям'і, што ён садзіў нас з братам і пачынаў расказваць. Ведаў: калі нешта нас цікавіць, мы самі запытаемся.

Я паступала два разы ва ўніверсітэт, і тата паставіў умову, калі на другі раз не паступлю, то іду на факультэт журналістыкі. Я заўсёды вельмі добра пісала. Але паступіла, куды планавала, стала мадэльерам-канструктарам. Тата ж хацеў, каб я была мастацтвазнаўцам, але вабіла творчая праца. Мой брат таксама не стаў літаратарам, ён фізік. Мама не працавала, выхоўвала дзяцей.

У нашым сямейным архіве — шмат фотаздымкаў з сустрэч у вёсках, бібліятэках. Тата не любіў фатаграфавацца, але вельмі любіў удзельнічаць у сустрэчах, расказваць, меў патрэбу дзеліцца. Некаторы час спрабаваў выкладаць, але нешта не склалася. Хоць некалькі пакаленняў сям'і былі настаўнікамі. У татавага дзеда вучыўся Янка Купала. У Дубраве Смалявіцкага раёна, дзе нарадзіўся, яго бацькі пабудавалі школу. На жаль, у час вайны яна згарэла, але ў пасляваенныя гады быў знойдзены фундамент, на якім мой тата, калі быў маленькі, каменьчыкамі выклаў «Юрэвіч».

***

...Галіна Уладзіміраўна распавядае, што яе тата вельмі любіў палявыя кветкі, таму на яго магілу дачка ўлетку прыносіць валошкі і рамонкі. Ды і помнік на ёй стаіць якраз такі, як хацеў сам Уладзімір Міхайлавіч — валун з яго радзімы, Смалявіччыны, апрацаваны так, нібыта ён абдымае помнік жонкі, пахаванай побач. Ён яе вельмі моцна кахаў... На жаль, гэты валун — пакуль адзіны памятны знак, што нагадвае пра выдатнага чалавека, які так шмат зрабіў для развіцця беларускай мовы і літаратуры, усё сваё жыццё прысвяціў служэнню роднаму слову. На яго доме ўсё яшчэ няма памятнай дошкі, ды і легендарная кніга «Слова жывое, роднае, гаваркое...», перавыдадзеная сёння, стала б своеасаблівым напамінам пра творцу. Яшчэ чакае сваіх пільных даследчыкаў і архіў праграмы «Жывое слова».

«Спачатку «Жывое слова» было гульнёй, віктарынай, але потым вывучэнне беларускай мовы ў межах праграмы паглыблялася, склаўся цэлы клуб, што аб'аднаў дзяцей, якія любілі пісаць па-беларуску».

Марына ВЕСЯЛУХА.
vesialuha@zviazda.by

Фотаздымкі з сямейнага архіва Галіны Юрэвіч

■

З паэтам Алесем Бачылам у рэдакцыі часопіса «Маладосць», 1970 г.

■ Прэм'ера

...І ТУТ ДАДОМУ ВЯРТАЕЦЦА ЖОНКА...

Анекдатычная сітуацыя на сцэне Маладзёжнага тэатра

Немалады мужчына прыводзіць у дом прывабную ды рэзвую дзяўчыну, якая ўвесь час імкнецца перайсці да «галоўнага» (згодна з яе ўяўленнем). Але Стэфан так адразу не можа, нават упіраецца. Нібыта адчувае, што робіць фатальную памылку. Але калі дзяўчо ўжо амаль пераадолела супраціў, раптам з'яўляецца жонка... Застаецца сказаць праўду: гэта зусім не тое, што яна падумала, гэта яго... пазашлюбная дачка, да якой ён употай шмат гадоў ездзіў з Ніцы ў іншы горад, каб спаткацца ці выправіць у школу...

О, амаль Францыя! Лёгкая інтрыжка і каханне на ўсё жыццё. Маладзенькая палюбоўніца і жанчына, якая ведае сабе цану. А яшчэ мужчына, дзеля якога варта закруціць складаную гульню і ўзяцца апякаць нібыта дачку. Ён, бедны, ужо і сам не ведае, як пазбавіцца ад дзяўчыны, што апынулася ў яго доме ўначы (чыста выпадкова!) у выніку легкадумнага адзюльтэру...

Праўда, у глядзельнай зале былі не французы, хоць публіка і старалася выяўляць тонкі французскі гумар і смяялася там, дзе не смяяцца было немагчыма. Прэм'ера спектакля «Сямейны ўікэнд» у Беларускім дзяржаўным маладзёжным тэатры адбылася ўлетку, калі віруе пачуццёвасць. І калі кожны (нават той, хто працуе і застаецца дома) жадае адпачыць. Камедыя — лепшы жанр для магчымасці разняволіцца ў тэатры. Тым больш — пад заслону тэатральнага сезона.

Малады рэжысёр Таццяна Аксенкіна (але гэта яе пятая пастаноўка ў Маладзёжным тэатры) абрала п'есу французскага акцёра і драматурга Жана Поля Пуарэ, якая прайшла праверку часам і рознымі тэатрамі, у тым ліку беларускімі. У асноўным яна запатрабаваная ў антрэпрызных камерцыйных праектах. Нездарма: гісторыя ненавязлівая, амаль бытавая (таму пойдзе ў любой краіне). Але расказвае яна пра зусім небанальныя «сямейныя разборкі», дзе адна хлусня перакрываецца іншай, кожная наступная здаецца яшчэ больш абсурднай, таму і смешнай. Інтрыга толькі ў тым, хто каго перайграе і перахлусіць. Ды толькі ў гэтым інтрыгі амаль ніякай, хоць правярай вядомую показку: не капай іншаму яму...

Інтрыгі не атрымаецца яшчэ і для тых, хто любіць старыя французскія камедыі: па ходу спектакля ўзнікаюць паралелі з фільмам «Вясёлы Вялікдзень» (паводле Жана Пуарэ), дзе галоўныя ролі выконвалі Жан Поль Бельмандо і маладзенькая Сафі Марсо. Лёгкая камедыя ў французскім стылі, дзе сюжэтная лінія была разбаўленая каскадзёрскімі трукамі, каб не зусім нагадваць анекдот. Хоць французы — майстры экранізацыі анекдотаў.

Французскі анекдот з беларускім тэмпераментам выглядае ўжо не такім лёгкім. Таму што нават у анекдотах мы ўмеем расчытаць мараль. І Стэфан — вельмі прыстойны чалавек, як яго ролю іграе артыст Яўген Іўковіч, зусім не хацеў здраджваць (мы ж бачылі на свае вочы!), ён проста паддаўся спакусе, часоваму памутненню ў галаве. У гэтым яго глыбокая чалавечая драма, што мы і назіраем, нават шкадуем героя. Хоць жанр камедыі ўсё ж бярэ сваё і згодна з яго ўмовамі заломвання рук пакрыўджанай жонкі няма: у інтэрпрэтацыі артысткі Марыі Бліновай усё ж адчуваецца вера ў тое, што яе муж зрабіў памылку. Таму яна стараецца паставіць яго ў яшчэ больш няёмкае становішча, каб пашкадаваў і ўрэшце павініўся. Але гэта робіць дзяўчына (артыстка Ганна Лаухіна). Нават неяк нечакана: увесь час яе паводзіны, міміка былі нібыта з выклікам, і ў развіцці гэтай ролі нічога не абяцала менавіта яе прызнання. Відаць, як жанчына яна зразумела другую жанчыну. Малайчына, атрымлівае пернік. Менавіта ў доме свайго так званага «таты» сустракае маладога чалавека з арыстакратычнай і заможнай сям'і Вальтэраў, якога не палохаюць эксцэнтрычныя паводзіны п'янай сапраўднай маці дзяўчыны, з'яўленне якой яшчэ больш заблытала сітуацыю. І смех, і слёзы. І ўсё ж мараль: гэта ўжо па-нашаму. Таму што там, дзе французы бачаць камедыю, нашы гледачы здольныя адчуць драму.

«Ох!..» — перажывала за сям'ю, якая развальвалася на вачах, сталая жанчына побач са мной. Рукой, шчодра ўсыпанай залатымі пярсцёнкамі, праціра вочы, мокрыя ад смеху (ці?..). І хлопала па руцэ спадарожніка — мужа, у амаль такім жа касцюмчыку, як галоўны герой. Наогул сталых людзей у Маладзёжным тэатры тым вечарам было шмат. Можа таму, што яны вельмі любяць камедыі? Яны шмат працуюць, маюць поўнае права вечарам не напружвацца ад складаных думак. Людзі з жыццёвым вопытам ведаюць, што трэба шукаць пазітыў у любых сітуацыях, яны імкнуцца адпавядаць іміджу тых асоб, у якіх усё добра. Тэатр ім патрэбны дзеля задавальнення і прыстойнага (!) баўлення часу.

Сітуацыі, падобныя на тую, што разглядаецца, яны, відаць, адчуваюць і могуць з іх пасмяяцца (але да пэўнай мяжы — у некаторыя моманты мая суседка кідала суровы погляд на спадарожніка). Акрамя таго, гэтыя людзі, як правіла, са стабільным заробкам. Што і патрабуецца даказаць і паказаць. Такія гледачы сёння вельмі патрэбныя айчынным тэатрам — запаўняючы залу, яны дапамагаюць закрываць планы. На камедыях гэта значна прасцей, чым на творах, якія патрабуюць думкі і эмацыянальнага напружання. А цяпер нашы тэатры, акрамя чыста мастацтва, павінны дбаць пра прыбытак. Камедыі — тое, за кошт чаго гэтага дасягнуць прасцей. Таму французскія і не толькі камедыі, спектаклі выключна дзеля баўлення часу і асалоды ёсць у розных нашых тэатрах. І будуць, відаць. Але добра, калі яны ўраўнаважваюцца пастаноўкамі, якія даюць глебу для роздуму. Дарэчы, ёсць такія і ў Маладзёжным тэатры — прыглядзіцеся, калі скончыцца лета.

Ларыса ЦІМОШЫК

■ На адкрытай прасторы

ВЯЧЭРА НА ТРАВЕ

Традыцыі розных стагоддзяў у гарадской культуры

Сёлета вядомы ў Еўропе латвійскі гурт Brainstorm ужо наведаў з канцэртамі безліч гарадоў у Вялікабрытаніі, Ірландыі, Эстоніі, Літве, Расіі... Нарэшце, у графіку музыкантаў значыцца мінскі Лошыцкі парк — на новым для нашай сталіцы фестывалі «A-fest», што пройдзе 13 жніўня, яны далучацца да беларускіх гуртоў J:MOPC, Navi, Ё-Гурт і Ганны Шалюцінай, каб разам разварушыць густую атмасферу. Фестываль «A-fest» — гэта спроба стварыць новую гарадскую культурную прастору, аб'яднаць традыцыі XIX стагоддзя і сучасныя павевы і ўспомніць імя знакамітага графа Чапскага, мудрагелістым чынам звязанага з сядзібай Любанскіх, што знаходзіцца на тэрыторыі Лошыцкага парка.

У свой час, дарэчы, сядзіба лічылася цэнтрам культурнага жыцця Мінска. Па адной з легендаў граф Чапскі, знакаміты мэр Мінска, што любіў бавіць час у Лошыцкім парку, адыграў у яго лёсе сумніўную ролю. Неяк Яўстафій Любанскі, уладальнік сядзібы, заспеў сваю маладую жонку Ядвігу Кяневіч у абдымках Чапскага, а тая ў сваю чаргу ўтапіла сваю ганьбу ў Свіслачы. Але гэта настолькі ж верагодная легенда, як і далёкае ад салонных драм меркаванне, што яе лодка проста перавярнулася ў той час, як плаваць пані не ўмела.

Сімвалічна «A-fest» пройдзе напярэдадні дня нараджэння графа Чапскага, бо ён зрабіў для горада шмат важнага і мадэрновага.

Тым не менш слава і ў сядзібы, і ў парка засталася, роўна як і гул ад некалі бурлівага культурнага жыцця. Таму сучасная стратэгія развіцця Лошыцкага парка, накіраваная на развіццё лесапаркавай зоны ў Еўропе, мае чым карыстацца, калі гаворка ідзе пра мінуўшчыну і традыцыі. Сімвалічна, што «A-fest» пройдзе напярэдадні дня нараджэння графа Чапскага, бо Карл Эмерыкавіч у час свайго «мэрства» зрабіў для горада шмат важнага і мадэрновага.

«Правядзенне першага фестывалю «A-fest» стане спробай стварыць у сталіцы новую традыцыю, — расказвае Ганна Губкіна, дырэктар па маркетынгу і развіцці бізнесу кампаніі «Аліварыя» — арганізатара фэсту. — І хоць рэгулярныя мерапрыемствы ў вялікай колькасці ўжо ўпісаны і ўпісваюцца ў каляндар Мінска, «A-fest» мае шэраг своеасаблівых якасцяў, здольных вылучыць гэтую падзею. Галоўная асаблівасць у тым, што фестываль будзе праходзіць на траве і не дзе-небудзь, а ў Лошыцкім парку, імя якога гаворыць само за сябе. Такі фармат для Мінска, што ні кажы, — «неабжыты». Да таго ж, фестываль пройдзе напярэдадні дня нараджэння графа Чапскага, найвыбітнейшага мэра горада, а гэта значыць, што мерапрыемства будзе сумяшчаць гісторыю і сучаснасць. Уласна мне ўжо цікава, як папулярны музычны гурт Brainstorm будзе выглядаць у спалучэнні з рэканструкцыяй адпачынку XIX стагоддзя».

З фестывалем «A-fest» мы зноў маем справу з распаўсюджаным у культурных імпрэзах міксаваннем розных часоў, можна сказаць, розных вымярэнняў. Уласна рэтра, якое ва ўсе часы выяўлялася ў калекцыянаванні, модзе, інтэр'ерах — адна з праяў цікавасці да аб'яднання старога і новага. Музычная класіка ў масавай культуры, перайначанне ўзорнага жывапісу, выступы папулярных кінаакцёраў у акадэмічных установах тыпу філармоній, аб'яднанне ў гарадскіх мерапрыемствах аўтэнтыкі з апошнімі здабыткамі — спалучэнне класічнага і масавага, традыцыйнага і сучаснага як тэндэнцыя праяўляе сябе ў сучаснай культуры даволі яскрава. Што можна ўбачыць па тым, чым насычаецца наша культурнае жыццё.

Спалучэнне класічнага і масавага, традыцыйнага і сучаснага як тэндэнцыя праяўляе сябе ў сучаснай культуры даволі яскрава.

«Я прыехала сюды працаваць з Расіі, у Мінск увогуле прыязджае адпачываць шмат людзей з-за мяжы, — працягвае Ганна Губкіна. — Вачыма старонняга назіральніка магу сказаць: галоўнае, што ўражвае наведвальнікаў горада, — вялікая колькасць паркавых ансамбляў. Такога маштабу і разнастайнасці, напэўна, няма нідзе. Як некалі граф Чапскі, мы хочам зрабіць свой унёсак у развіццё горада. Тут накоплены высокі еўрапейскі ўзровень, вялікія месцы кшталту паркаў могуць стаць пляцоўкамі вялікіх мерапрыемстваў. Мы хочам стварыць падзею, якая б пераўтварыла парк у жывое месца, каб 13 жніўня стала для людзей знакавай датай».

Надзея Ількевіч, якая разам з камандай урбаністаў працавала над стратэгіяй развіцця Лошыцкага парка і адпаведна над праектам фестывалю, кажа, што яны арыентаваліся на вопыт развіцця паркаў Еўропы, але з ухілам на культуру Беларусі. «У нас шмат традыцыйных фестываляў, але важна стварыць лакальную душэўную падзею, якая б уключала пласт беларускай культуры, чаго нам насамрэч не хапае. Фэст можа стаць папулярным турыстычным мерапрыемствам, нагодай для жыхароў больш даведацца пра сваю гісторыю».

Такое спалучэнне — сучаснасць, якая арыентуецца на даўніну, — здольна прыцягнуць вялікую аўдыторыю, што зразумела не ў апошнюю чаргу стала прычынай развіцця тэндэнцыі. Музычныя гурты, Brainstorm у якасці хэдлайнера, «Мазгабойня» і іншыя гульні, еўрапейская і беларуская кухні, парад вусачоў і барадачоў і барбер-фэст, на якім будзе вызначаны найлепшы цырульнік для барадачоў, самакаты — гэта даволі маштабная праграма і, напэўна, сапраўды нешта новае для культурнага жыцця Мінска. А яго зашмат не бывае.

Уваход на фестываль «A-fest», што будзе праходзіць у Лошыцкім парку 13 жніўня з паўдня да адзінаццаці гадзін вечара, вольны.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ. *katsyalovich@zviazda.by*

■ Дзеля памяці

СЛОВЫ ПАДАЮЦЬ НЕ НА КАМЕНЬ

Пайшоў з жыцця пісьменнік Іван Пташнікаў

У гісторыі беларускай літаратуры ёсць імёны творцаў, якія ў чытача адразу ж выклікаюць дакладныя асацыяцыі. Калі гаворка ідзе пра Івана Пташнікава, прыгадваецца вёска. І гэта не тая вясковая проза, што даўно састарэла і здаецца неактуальнай сёння, але глыбокая, густая, поўная дакладна намаляваных партрэтаў і трапных выразаў. А яшчэ — слоў і вобразаў, звязаных з роднымі мясцінамі пісьменніка — Лагойшчынай.

Дэбютаваўшы ў літаратуры як паэт, Іван Пташнікаў хутка намацаў іншую дарогу ў творчасці — прозу. Грунтоўную, сур'ёзную, класічную. Таму і не дзіўна, што хутка заваяваў любоў чытача і павагу крытыкаў. Першую аповесць пад назвай «Чачык» апублікаваў у 1957 годзе ў часопісе «Полымя», і ўжо праз два гады выйшла яго першая кніга апавяданняў «Зерне падае не на камень». Потым былі знакамітыя раманы: «Тартак», што праз некаторы час стаў тэлефільмам; «Алімпіяда», растворaны ў выглядзе тэлеспектакля; «Найдорф», які прынёс аўтару Дзяржаўную прэмію Беларусі імя Якуба Коласа.

У прозе Івана Пташнікава гучаць антываенныя матывы, бачацца трагедыі спаленых вёсак, скалечаныя лёсы простых людзей. Гаворка ідзе не толькі пра вайну, але і пра чарнобыльскую трагедыю. Гэтая катастрофа таксама не пакінула празаіка абыякавым, ён адгукнуўся страшным апавяданнем «Львы».

Яркі прадстаўнік філалагічнага пакалення айчынных пісьменнікаў. Паплечнік Уладзіміра Караткевіча, Міхася Стральцова, Вячаслава Адамчыка, Іван Пташнікаў быў і выдатным рэдактарам, доўгі час загадваў аддзелам прозы часопіса «Полымя».

Так, Іван Пташнікаў — адзін з нашых класікаў. Яго творы вывучаюцца ў школе і ва ўніверсітэтах, ды і пазней не застаюцца на паліцах, чытаюцца і перачытваюцца. А гэта значыць, што словы творцы, прамоўленыя дзесяцігоддзі таму, упалі не на камень, што і пасля адыходу аўтара ў лепшы свет яны будуць вечна жыць у нашай літаратуры, у памяці беларускіх чытачоў.

Светлая вам памяць, шаноўны Іван Мікалаевіч.

■ Зачапіла

Рэверс з сецівa

С. Барысенка. «У НАС НЕ КУРАЦЬ»

(«Звязда» за 23 ліпеня)

— Я пачаў курыць у арміі. Там без гэтага ніяк. Хочаш есці — курыш, нельга спаць — стаіш і курыш, хочаш спаць — спачатку курыш, не хочаш аб нечым думаць — таксама... Карацей, здымаеш любы стрэс. Год таму я, здаецца, кінуў. «Здаецца» — таму што спрабаваў шмат разоў, але не мог вытрымаць хоць бы два тыдні. Гэтым разам спадзяюся на поспех, бо жаданне не курыць у мяне вельмі моцнае. Два гады таму ад раку лёгкага памёр бацька. Выявілі той рак толькі на 4-й стадыі. Пачатак хваробы ніхто не заўважыў, а вось фінал... Не дай бог... Бацька курыў гадоў 40, не менш... Вы пішаце пра забаронныя меры, і я цалкам за іх. За любыя. І каб як мага больш жорсткія.

Паўмеры або нейкія сціплыя захады тут не спрацуюць. І адносна вайскоўцаў трэба занепакоіцца. Чаму там нікому няма да гэтага справы? З выпіўкай, калі зловяць, разбіраюцца на раз. Хоць, што грахі таіць, нам удавалася і выпіваць. Але адзінкавыя выпадкі — гэта адно, а масавым ні распіванне, ні курэнне быць не павінны. Як-ніяк маладыя хлопцы, яшчэ нічога толкам у жыцці не зрабілі, дзяцей не нарадзілі, а здароўе актыўна пачалі страчваць... Гэта было б выдатна, калі б у мае 19 што-небудзь сапраўды перашкодзіла маёй першай зацяжцы.

Віталь, *Валожынскі р-н.*

Т. Шчыры. «ТЭАТР ВЫРАТОЎВАЕ МАРАЛЬНА» *(«Звязда» за 23 ліпеня)*

— Дзякуючы вам я ўпершыню даведалася пра незвычайны праект «Тэатр у турме». Нават не думала, што такое можа быць! І я вельмі ўражана. Заўжды стаўлюся з павагай да тых людзей, якія ўдзельнічаюць у самадзейнасці. А да тых, хто робіць гэта ў няпростых жыццёвых умовах, у турме — тым больш. Рэжысёра Аляксея Бычкова хочацца адзначыць асобна. Праз мастацтва ён адкрывае зняволеным жанчынам новы свет, пра які многія наогул не ведалі. Спадзяюся, ім гэта дапаможа, бо, на маю думку, удзел у такіх пастаноўках — гэта сапраўдная тэрапія. Я б з задавальненнем паглядзела спектакль у пастаноўцы такой тэатральнай студыі.

Вольга, *г. Віцебск.*

Н. Лубнеўская. «НУМАРЫ ДЛЯ КАЛЯСАЧНІКАЎ І ПАНДУСЫ Ў ШКОЛАХ» *(«Звязда» за 23 ліпеня)*

— Работы тут яшчэ шмат наперадзе. Асабліва крыўдна, калі безбар'ернае асяроддзе ствараюць для галачкі. Будуюць крутыя пандусы, апускаюць бардзюр «у нуль» толькі з аднаго боку дарогі... Быццам бы і зрабілі нешта, а скарыстацца па факце гэтым немагчыма. І зноў грошы, якіх у бюджэце і так мала, патрачаны без толку. Такія прыклады сустракаюцца не толькі ў крамах, але і ў паліклініках, аптэках. Атрымліваецца, нават у сацыяльны аб'ект на калясцы без старонняй дапамогі заехаць немагчыма.

А вось ідэю прымушаць заказчыкаў перарабляць будынкі без належных умоў за свае грошы падтрымліваю. Можа, наступным разам задумаюцца, хоць бы з пункту гледжання эканоміі ўласных сродкаў.

Тым больш безбар'ернае асяроддзе патрэбна не толькі інвалідам. Пажылым людзям, мамам з каляскамі таксама зручна карыстацца пандусамі і нізкімі бардзюрамі. А ў нас пераходы і будынкі разлічаны быццам на маладога спартсмена!

Уладзімір, *Брэсцкі р-н.*

І. Сідарок. «АДЧЫНІЦЕ, ДА ВАС КАПРАМОНТ!» *(«Звязда» за 28 ліпеня)*

— Не стрымалася, каб не падзяліцца сваімі ўражаннямі пра капітальны рамонт, што здарыўся ў нашым доме два гады таму назад. Нацярпеліся мы тады. Якраз як у артыкуле напісана — рабочым таксама наша плітка ў ванным пакоі перашкаджала. Загадалі нам з мужам (гэта людзям, якім абодвум ужо па 68) яе адбіць. Я прасіла: «Хлопцы, ну вы ж маладыя, дужыя. Абабіце тую плітку ды выкіньце, а я вам заплачу». Яны — ні ў якую. І галоўнае ж, нічога ніхто не патлумачыў, не параіў. Усё моўчкі. Добра, што ў суседзяў пляменнік таксама малады — ён кувалдай і бухаў па сценах — дапамог. Потым «стаяк» запаветрыўся пасля замены, і страха падцякала, пакуль яе раскрывалі ды перанакрывалі нанова. Цярпелі, чакалі, бо не ведалі, куды званіць, хто адказны. Думалі, можа так яно і трэба?

Яшчэ б вось параіў хто, як уздзейнічаць на іншых нашых суседзяў — студэнтаў. Я разумею, маладосць, але ж гэтая музыка штодня — жудасная ды моцная... Нават мы, глухаватыя, і тое пакутуем, што ўжо казаць пра маладую пару з дзіцем, што насупраць на пляцоўцы жывуць. З міліцыі накіроўваюць званкі ў ЖЭС, адтуль — назад у міліцыю. Кажуць, «дзень на двары, а не ноч, хай іграе, а памераць, ці празмерная гучнасць музыкі, немагчыма». А навошта яе мераць, калі і так чуваць, што моцна?

Наталля Вараб'ёва, пенсіянерка. *Гомельская вобласць*

■ Жыццёвінкі

СВАЕ ЛЮДЗІ

НІНА Сцяпанаўна ўсім сваім родным і блізкім прызналася, што на ноч не зашчапляе дзверы. «А раптам што здарыцца? Мне ж ужо без трох дзевяноста. Страшна падумаць, колькі пражыла. Хоць дзе і калі што было!..»

Сёння яна ўжо не корпаецца на агародзе. Агарод аддала добрым людзям, тыя пагадзіліся ўзяць яго без лішніх слоў, бо любяць рачкаваць на зямлі, а ў Ніны Сцяпанаўны ўчастак — грэх слова кепскае сказаць: усё расце, што ні пасадзіш. А праз колькі двароў — ужо іншая глеба: жоўценькі пясочак. Тады ж чаму не знойдзецца ахвотнікаў! Уго! Праўда, некалькі градак робіць усё ж — бліжэй да хаты пакінула маленькі лапік зямлі: хай будзе хоць якая свая памідорына ці цыбуліна. «Так-сяк агараю. Не кожны ж раз у краму па яе хадзіць». Туды прывозяць сёння ўсё, нават бананы. Градкі ёй дапамагае абрабляць унук Сашка, хоць і дужа заняты, але стараецца выкраіць час: хоць сам працуе на валцы лесу і стамляецца, вядома ж. Ды і свой жа агарод мае. Чалавек сямейны. Іншы раз прыязджаюць дочкі: адна жыве ў Гомелі, другая — побач, у суседняй вёсцы. Вось і надоечы неяк патэлефанавалі, бы згаварыліся: мама, чакай! А яна якраз хварэла. Таму адразу замітусілася, пачала актыўна прымаць таблеткі, што прыпісаў мясцовы лекар, нават зазірнула ў люстэрка: ці добра хоць выглядаю? А сама, тупаючы па хаце, разважала: «Трэба патрэніравацца, каб дзеўкі не западозрылі, што кволюся. Калі ж і адна цягне да сябе, і другая. Яшчэ разарвуць. Ну як ты тут, маўляў, адна? У нас жа табе будзе лацвей. Ага, лацвей. У чужой жа хаце, дзеці мае, і на печы холадна. Ды і характар у мяне такі, што ўказваць буду, а вы гэтага не любіце. Таму вы самі па сабе, а я як-небудзь сама... А з пенсіі грошай і так дам усім вам... пароўну... Дзякуй Богу, пенсія ў мяне добрая, каля чатырох соцень, то навошта мне столькі адной?»

Яна яшчэ пэўны час тапталася перад люстэркам. Выгляд быццам добры. Ага, а дзе мая пудра? Ды і кіёк трэба схаваць пад ложак. Цяпер хай едуць дзеўкі. Не страшна.

***

ДАВОЛІ часта перамаўляюся па слухаўцы з Сяргеем Філіпчанкам. Жыве ў Хатоўні. Працуе ў мясцовым Доме культуры мастацкім кіраўніком. Бяда напаткала майго земляка і сябе — цалкам страціў зрок. Некалі сам вадзіў машыну, цяпер гэта робіць жонка Надзя. Затое можа і сёння яе адрамантаваць: хоць і не бачыць, але адчувае машыну рукамі і, вядома ж, душой і сэрцам. Выдатны музыкант і спявак, Сяргей надзвычай запатрабаваны чалавек — без яго ў раёне не абыходзіцца ніводнае свята, на якім павінна гучаць песня. Нездарма ж яго называюць рагачоўскім салаўём і залатым голасам.

Нядаўна Сяргей Філіпчанка выступаў у Лідскім замку на фестывалі «Кола часу», які праводзіла Беларускае таварыства інвалідаў па зроку. Вярнуўшыся адтуль, падзяліўся ўражаннямі. Паколькі ў Лідзе жыве сястра Таццяна, то мне гэты горад добра знаёмы. І ў замку таксама даводзілася бываць. Заўважце: замак не мае даху. Таму ў горадзе і нарадзіўся наступны анекдот. Калі выпівоху ці абібока якога пытаюць, дзе ты працуеш, ён адказвае: у замку столь фарбую. Сяргею гэтая байка спадабалася.

Папытаў, колькі ж ён песень выканаў на імпрэзе ў Лідзе? Адказаў: адну, «Калінушку». Мяне гэта, шчыра кажучы, здзівіла і ўразіла. Бо адразу ўявіў, як едзе Сяргей з вёскі ў Гомель (легкавіком кіруе, вядома ж, жонка, якая ўзяла на працы дзень за свой кошт). Потым гуртам адтуль ужо дэлегацыя ад вобласці шыбуе ў мікрааўтобусе ў Ліду, без малага 500 кіламетраў. Тая ж доўгая дарога дадому. І дзеля адной песні!

Не, не падумайце нічога кепскага: іншы раз дастаткова праспяваць і адну песню, каб у твой адрас прагучала «біс» і застацца ў памяці слухачоў. Так, спадзяюся, і было. Але мне проста прыгадалася адна гомельская паэтка, якой на вечарыне прапанавалі прачытаць усяго адзін верш — як і ўсім астатнім, каб не зацягнулася мерапрыемства — а яна абурылася: гэта што, з-за аднаго верша я сюды ішла? Потым, калі выйшла чытаць, было цяжка пасадзіць яе на месца. Дарэчы, з таго прачытанага добрага тузіна вершаў у памяці не засталося ніводнага радка.

Пра «Калінушку» Сяргея Філіпчанкі, перакананы, так не скажуць, бо некалі сам чуў яе ў выканні гэтага спевака.

Якраз той выпадак, калі і варта было ехаць дзеля адной песні!

***

МНОГІЯ здзіўляюцца, паціскаюць плячыма: і чаму Алене не жылося са сваім Міколам? Не п'е, не курыць. Гэта ж сёння золата, а не чалавек. А яна, бачце вы, дала яму ад варот паварот. Звычайна так паступаюць з выпівохамі (ну якая ад яго, сапраўды, карысць — ні грошай, ні чыстага паветра ў пакоі: перагарам толькі патыхае). Ды яшчэ з абібокамі рознага кшталту... А гэты вунь і на легкавік разжыўся. Ну чым не муж?

Паколькі Лена нікому не апавядала пра сваё сямейнае жыццё-быццё, то суседзям нічога не заставалася, як строіць розныя здагадкі. Гэта быў якраз той выпадак, калі маладая маці дваіх дзетак — сынка і дачушкі — паказала сябе даволі мужнай і рашучай жанчынай.

Адбылося вось што. Гады два назад муж Мікола узяў на працы чарговы адпачынак і паехаў у вёску да бацькоў — у тых быў свой пчальнік, і ён дапамагаў старым упраўляцца з пчоламі. У канцы агарода стаяла каля дзесятка вулляў. Мёд, адным словам, быў. А быў мёд, былі і грошы. А тут якраз так атрымалася, што захварэла дачка і на яе лячэнне былі патрэбны немалыя сродкі. Жанчына патэлефанавала мужу, растлумачыла сітуацыю, а ў адказ пачула: дзе я табе іх вазьму, грошы тыя? Няма!

Пярун бязлітасна лупіў, дзе толькі можна, у Плоскім бярозавым лесе, людзі беглі, куды вочы глядзелі: усё атрымалася знянацку і раптоўна, ніхто не чакаў такога.

Лена пабедавала ды змірылася. Можа, і сапраўды, няма. Так і жыла б. Аднак пазней, перабіраючы кнігі, выпадкова натрапіла на скрутак... з доларамі. Пералічыла. Тры тысячы. І гэта няма грошай! Ну малайчына, мужанёк! Як жа я з табой жыць буду далей? І не разумела — як. Для роднага дзіцяці грошай пашкадаваў бацька!

Жанчына, вядома ж, забрала грошы і зрабіла выгляд, што пра іх не чула і не ведала.

Яно б і нічога, можа, і змірылася б, аднак пазней Мікола ўзняў такі вэрхал, што не перадаць. «Дзе мае долары?!»— «Якія? У цябе ж не было грошай. Сам казаў, кляўся нават». Заявіў, адным словам, у міліцыю. Тая доўга абівала парогі — усё разбіралася.

Вярнула рэштку грошай ці не жанчына былому мужу, казаць не бяруся, бо не ведаю, ну а што з ім адбылося — чытайце вышэй. Прасіўся быццам Мікола назад, але яго месца было ўжо занята — Алена амаль адразу ж выйшла замуж і нарадзіла трэцяе дзіця. Хлопчыка ці дзяўчынку, не ведаю, бо возіць немаўля ў калясцы, а каляскам тым мала веры — у адной можа перакатацца ўся сям'я, не зважаючы на пол.

***

НАТАЛЛЯ ўчора звечара пералічыла ўсе падушкі, што меліся ў кватэры. Ажно восем! Нічога не скажаш — набралася. Здавалася ж, раздавала сынам і дочкам, калі тыя аддзяляліся, а іх яшчэ колькі! Хоць ты аддай каму. Яна б, можа, так і не засяродзілася на тых падушках, не стала б іх рэвізаваць, але вунь Кацька — суседка па лесвічнай пляцоўцы — учора пахвалілася, што ў «Галактыцы» адкрылася майстэрня па рэстаўрацыі падушак. «Не паверыш — як новенькія сталі! — не шкадавала кампліментаў майстэрні Кацька. — Лёгкія, мяккія. А ўяўляеш, колькі там за ўвесь час набралася розных паразітаў? Мы спім і не думаем пра іх, а яны, халера ясная, сваю гнусную справу тым часам робяць. Мо таму і хварэем без меры, а?..»

Таму і вырашыла Наталля таксама неадкладна навесці парадак са сваімі падушкамі. Колькі яны ёсць у яе, а гэта ж гадоў сорак некаторым будзе, ніводнага разу не перасыпаліся. Вунь як парыжэлі напернікі — жах! Ай-я-яй! Дзякуй, Кацька, за параду!

Назаўтра малодшы сын Наталлі адвёз усе падушкі ў майстэрню. Памяшканне майстэрні не ўразіла жанчыну. Катушок. Не павярнуцца. Маленькі стол. Машына, што мые-сушыць пяро, табурэт. Гаспадыня папярэдзіла: вы, калі ласка, сёння забярыце свае падушкі, падвечар, бо ў нас тут не павярнуцца. Бачыце, якая цесната?

Ну, забрала падушкі Наталля, і быццам настрой у яе быў добры, але ж трэба было ў той вечар патэлефанаваць сястры, якая жыве ў іншым горадзе... Разгаварыліся. І пра падушкі, вядома, успомнілі. А сястра вазьмі ды скажы: «Я ж таксама свае нядаўна здавала ў майстэрню. Пры мне хлопец уключыў тую машыну сваю, а я праз шкло назіраю, сачу...» Праз якое шкло? Пра што сястра гаманіць? Яна на свае вочы, аказваецца, сачыла за ўсім працэсам у адрозненне ад яе? Вось чаму і сапсаваўся настрой. А можа, думае жанчына, тая гаспадыня майстэрні ўзяла проста грошы, ды немаленькія, а той агрэгат і не ўключала? Паспрабуй аспрэч.

Як бы там ні было, а ў Наталлі мала радасці засталося ад той рэстаўрацыі. «Цяпер абдурыць чалавек чалавека і дорага не возьме», — уздыхае іншы раз Наталля, і падушкі тыя не здаюцца цяпер ёй такімі лёгкімі і мяккімі, як у суседкі Кацькі.

***

СЦЯПАН Пятровіч жыве адзін. У той самай вёсцы, дзе прайшло дзяцінства і маленства, адкуль выпырхнуў у свет. З гэтых мясцін была і яго жонка, Маруся, цяпер ужо нябожчыца. Вярнуўся сюды амаль адразу, як пахаваў яе. У гарадской кватэры застаўся малодшы сын Павел, а ў старэйшага, Косці, пытанне з жыллём вырашылася яшчэ ў савецкі час, калі з гэтым было не так складана: старанных працаўнікоў завод, на якім працаваў сын, забяспечваў кватэрамі стабільна. Сёння ў гэта мала хто з моладзі верыць, але ж было такое. Прыемна ўспомніць.

На пенсіі Сцяпан Пятровіч амаль дзесяць гадоў. У вёсцы яму добра. Тэлевізар ёсць, газ таксама. Згатаваць ежу — згатуе. Жыўнасці не трымае. Ну, а калі прыціснe сэрца — едзе ў горад: ён не выпісваўся адтуль, таму ідзе ў сваю паліклініку, дзе яго паслухаюць і параяць, як і чым лячыцца. Калі трэба, паляжыць у бальніцы. За хату не хвалюецца — прыгледзіць сусед.

І ўсё б нічога, але адна бяда ў старога — няма ўнукаў. Даўно хлопцы пабраліся шлюбам, а яго з Марусяй не парадавалі. Чаму так атрымалася, ён вычытаў у адным паважаным часопісе. Можа, можа такое быць. Вычытаў надоечы і прыгадаў тую даўнейшую майскую навальніцу, калі ў калгасе праводзілася маёўка з нагоды заканчэння пасяўной, і свята тады было азмрочана. Пярун бязлітасна лупіў, дзе толькі можна, у Плоскім бярозавым лесе, людзі беглі, куды вочы глядзелі: усё атрымалася знянацку і раптоўна, ніхто не чакаў такога.

Сцяпан і Маруська таксама пабеглі з лесу. Але ў той мітусні яны на нейкае імгненне згубілі адзін аднаго, і неўзабаве хлапчына — пасля чарговага ўдару з неба — пачуў: Маруську забіла!..

Старыя людзі падказалі, што дзяўчыну, якая не паказвала ніякіх прыкмет жыцця, трэба закапаць па пояс у сырую зямлю. Так і зрабілі. Дзяўчына ажыла.

Што няма сёння ў яго ўнукаў, Сцяпан Пятровіч вінаваціць тую праклятую майскую навальніцу.

«Гарэла б яна гарам!» — нярэдка думае стары, і на яго выцвілых вачах тады блішчаць скупыя мужчынскія слёзы.

Васіль ТКАЧОЎ

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

Наименование (описание) имущества и его стоимость	**Лот №1.** Автомобиль Шевроле Нива GLC 212300-55, гос.номер 3200 ВС-2, 2010 г.в., черно-синий металлик, Начальная стоимость лота – 6701 белорусский рубль 60 копеек
Собственник (владелец) имущества	ОАО «Барсучанка», УНП 300013105, юридический адрес: Витебская область, Докшицкий район, д. Барсуки, ул. Пионерская, д. 6
Местонахождение имущества	Витебская область, Докшицкий район, д. Барсуки, ул. Пионерская, д. 6. Контактные лица по вопросам осмотра имущества и получения дополнительной информации: Москаленок Сергей Федорович – директор ОАО «Барсучанка» тел.: +37533 675 35 50
Наличие обременений	Не имеется
Место (адрес), дата и время проведения торгов	Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома г. Витебск, ул. Богдана Хмельницкого, 10/1, каб. 2.5 5 сентября 2016 года в 10.00
Справочная информация об организаторе торгов	Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210015, г. Витебск, ул. Богдана Хмельницкого, д. 10/1, каб. 2.5 Судебный исполнитель Богданова Ольга Евгеньевна, тел. (0212) 62 03 40, т.м. 375-33-687-91-63 Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 61 40 15
Условия и порядок проведения торгов	1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витобласисполкома № 3642903001037 в 200 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Витебска, МФО 635, УНП 300002505 **не позднее 14.00 2 сентября 2016 года.** Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

УНП 590959404

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА Берестовицкого филиала Гроднооблпотребобщества, назначенного на 03.08.2016 г. следующего содержания

Аукцион состоится 16 августа 2016 г. в 15.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209.
Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30
Последний день приема заявлений – 10 августа 2016 г. до 15.00 **Телефон для справок: 45-05-38, 41-98-32, http://grodnoino.by/**

ОАО «Белпромтара»

УВЕДОМЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ,

которое состоится 11 августа 2016 г. в 14.00

по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 22, ком. 1.

Повестка дня:

1. Об утверждении Положения о ревизионной комиссии ОАО «Белпромтара».

2. О внесении изменений и дополнений в Устав ОАО «Белпромтара» и утверждении его в новой редакции.

3. О досрочном прекращении полномочий членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии ОАО «Белпромтара», избранных на годовом общем собрании акционеров по итогам 2015 года.

4. Об избрании нового состава наблюдательного совета и ревизионной комиссии ОАО «Белпромтара».

5. О выплате дивидендов по итогам работы ОАО «Белпромтара» за 1-е полугодие 2016 г.

УНП 100230455

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62

Продавец: ОАО «Витебскхлебпром», 210024, г. Витебск, ул. Горбачевского, 5, тел. (0212) 35-86-82
Лот №1. Изолированное помещение с инв. № 200/D-108266 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Змитрака Бядули 3-я, 27, пом. 39, площадью 174,7 кв.м, наименование: торговое помещение. Нач. цена (до/после деноминации): 140 800 / 1 408 000 000 бел. руб. без НДС. Задаток (до/после деноминации): 14 080 / 140 800 000 бел. руб.
Аукцион состоится **31.08.2016 г. в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: **с 01.08.2016 с 8.30 по 30.08.2016 г. до 17.30.** Срок заключения договора купли-продажи: 20 календарных дней со дня проведения аукциона, оплата за объект производится в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. Условие аукциона: возмещение затрат по оценке имущества, оплата НДС сверх цены продажи объекта

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по оценке имущества на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. **Задаток перечисляется на р/с 3012078870010, ЦБУ №2 ЗАО «МТБанк», г. Витебск, ул. Ленина, 17, БИК 153001117, УНП 390477566, получатель платежа ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. **Дополнительную информацию можно получить по тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Червенской СДЮШОР (продавец) проводит открытый аукцион по продаже права заключения договоров аренды объектов недвижимости:

	Лот № 1	Лот № 2
Наименование объекта	**Нежилое помещение № 24 на 1-м этаже физкультурно-оздоровительного комплекса, расположенного по адресу: Минская область, г. Червень, ул. Победы, 22**	**Часть холла (коридора) на 1-м этаже физкультурно-оздоровительного комплекса, расположенного по адресу: Минская область, г. Червень, ул. Победы, 22**
Общая площадь, кв.м	**32,5**	**2,0**
Срок договора аренды	3 года	3 года
Начальная цена права заключения договора аренды, бел. руб.	170,63 (в денежных единицах 2000 года – 1 706 300)	10,50 (в денежных единицах 2000 года – 105 000 бел. руб.)
Сумма задатка, бел. руб.	17,06	1,05
Размер ежемесячной арендной платы за сдачу в аренду Объекта	106,08 (7,8 базовой арендной величины)	16,32 (1,2 базовой арендной величины)
Целевое использование имущества	Под объект общественного питания (кафе)	Под установку кофейного аппарата

Базовая арендная величина с 01.04.2016 составляет 13,60 руб. (136 000 руб.). В соответствии с подпунктом 2.1 пункта 2 Указа Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 № 150 «О некоторых вопросах аренды и безвозмездного пользования имуществом» размер базовой арендной величины ежегодно устанавливается Советом Министров Республики Беларусь с учетом изменения индекса потребительских цен за предыдущий год по отношению к предшествующему и применяется с 1 апреля года, в котором он установлен.

Задатки в размере 10% от начальной цены объектов, перечисляются на **р/с № 3012108260016; в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан перечислить арендодателю сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.

Договор аренды имущества должен быть заключен в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона регламентирован Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049, а также иными актами законодательства. Аукцион состоится **31.08.2016** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **30.08.2016** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17, сайт в сети интернет: www.rlt.by.

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

Наименование (описание) имущества и его стоимость	**Лот №1.** Бульдозер ДТ-75, 1990 г.в., инв. № 0738. Начальная стоимость лота – 4468 белорусских рублей 30 копеек. **Лот № 2.** Трактор МТЗ-80, 1990 г.в., инв. № 5892. Начальная стоимость лота – 5067 белорусских рублей 60 копеек. **Лот № 3.** Трактор МТЗ-80, 1993 г.в., инв. № 5921. Начальная стоимость лота – 5121 белорусский рубль 40 копеек
Собственник (владелец) имущества	Браславское коммунальное унитарное предприятие мелиоративных систем «Браславское ПМС», УНП 300013105, юридический адрес: Витебская область, г. Браслав, ул. Юбилейная, д. 93
Местонахождение имущества	Витебская область, г. Браслав, ул. Юбилейная, д. 93 Контактные лица по вопросам осмотра имущества и получения дополнительной информации: Кожаронок Михаил Валерьевич – директор УП «Браславское ПМС» тел.: 8 02153 3-17-35
Наличие обременений	Не имеется
Место (адрес), дата и время проведения торгов	Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома г. Витебск, ул. Богдана Хмельницкого, 10/1, каб. 2.5 5 сентября 2016 года в 12.00
Справочная информация об организаторе торгов	Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210015, г. Витебск, ул. Богдана Хмельницкого, д. 10/1, каб. 2.5 Судебный исполнитель Богданова Ольга Евгеньевна, тел. (0212) 62 03 40, т.м. 375-33-687-91-63 Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 61 40 15
Условия и порядок проведения торгов	1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витобласисполкома № 3642903001037 в 200 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Витебска, МФО 635, УНП 300002505 **не позднее 14.00 2 сентября 2016 года.** Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

Квитанцию о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) серия СВ №0159399 страховой компании «Промтрансинвест» **считать утерянной.**

Извещение о проведении 11 августа 2016 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)					
№	**Наименование**	**Инв. номер**	**Местонахождение**	**Начальная цена без НДС, бел. руб.**	**Размер задатка, бел. руб.**
1.	зуборезный п/автомат 5С280П, год выпуска – 1980	4220623	г. Минск, ул. Социалистическая, 2	4 460 (44 600 000 бел. руб. образца 2000 года)	446 (4 460 000 бел. руб. образца 2000 года)
2.	зуборезный п/автомат 5С280П, год выпуска – 1985	4226647		7 140 (71 400 000 бел. руб. образца 2000 года)	714 (7 140 000 бел. руб. образца 2000 года)

Продавец имущества – ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск.

Организатор торгов – государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 15 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Торги проводятся **11 августа 2016 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 01.08.2016 по 09.08.2016 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:

(017)327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);

(017)217-96-37 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»).

Извещение о проведении 11 августа 2016 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)					
№	**Наименование**	**Инв. номер**	**Местонахождение**	**Начальная цена без НДС**	**Размер задатка**
1.	Теплогенератор в комплекте с КГУ-0,29 (Ж) мод. ТГ-0,29, год выпуска – 2008	4101080	г. Минск, ул. Социалистическая, 2	4 228,64 бел. руб. (42 286 400 бел. руб. образца 2000 года)	422 бел. руб. (4 220 000 бел. руб. образца 2000 года)
2.	Теплогенератор в комплекте с КГУ-0,29 (Ж) мод. ТГ-0,29, год выпуска – 2008	4101081		4 228,64 бел. руб. (42 286 400 бел. руб. образца 2000 года)	422 бел. руб. (4 220 000 бел. руб. образца 2000 года)

Продавец имущества – ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск.

Организатор торгов – государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 15 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Торги проводятся **11 августа 2016 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 01.08.2016 по 09.08.2016 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:

(017)327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);

(017)217-96-37 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»).

Усё пра Еву

■ Нататнік Яго жонкі

Святлана ДЗЯНІСАВА,
галоўны рэдактар
часопіса «Маладосць»

ЖАНЧЫНА-ТАЯМНІЦА

Больш за дзесяць гадоў прайшло з той пары, а забыць не атрымліваецца. Хоць гэта той выпадак, якіх процьма штодня здараецца і штодня забываецца, выцясняючыся з памяці іншымі, наступнымі выпадкамі. Гэты выпадак шарагова-канвеерны, я б так сказала, а не нейкі там... Не нейкі такі, што нельга яго забыць. Таму і дзіўна. Быццам чартаўшчына нейкая: размову, у якой я нават і не ўдзельнічала, а была толькі сведкай, якая мяне не датычылася, а проста канстатавала ўражальны для мяне факт, я ўсё яшчэ ўспамінаю. Вельмі часта. Невытлумачальна часта і без аніякіх нагод. Чаму? Пра тое вось і размова...

Сказаць, што мяне тыя словы неяк зачапілі, пакрыўдзілі? Ды не. Яны мяне абурылі — вось чыстая праўда. Ну, яшчэ выклікалі пэўную колькасць нейкага падабенства агіды да жанчынкі, якая іх прамаўляла. Гэта прытым, што я вельмі люблю людзей, ніколі на іх не крыўдую, заўсёды ўсіх апраўдваю, усё ўсім прабачаю. Мяне можна прыкладаць да раны, як часам кажуць. Агіда ж ад той размовы застаецца дагэтуль, разам з памяццю пра яе. Чаму?

Цалкам верагодна, што я сапраўды пакрыўджана. На яе, тую жанчынку. Але не сама, а замест яе, на яе, так бы мовіць, месцы. Моляцца ж за тых, хто ніколі не моліцца. Вось і я крыўдую за тых, каму за сябе не крыўдна. Так, напэўна, і ёсць: мне крыўдна за сваю былую супрацоўніцу і яшчэ процьму такіх самых, як яна.

Размова ішла пра вязанне кручком. Каляжанка распавядала, як паклала ў шпіталь сваю маці, і як яны абедзьве ўбачылі там «фантастычнае відовішча»: матчына суседка па палаце («Маладая ж яшчэ жанчына!») вязала карункі! Не з захапленнем тое было прамоўлена, хоць, па логіцы, якое яшчэ пачуццё можа выклікаць жанчына (любога ўзросту) з чароўнай палачкай у руках? З палачкай, якая ператварае роўную гладкую нітку ў казачныя ўзоры? Пяшчота і замілаванне найбольш адпавядалі б сітуацыі, але мая знаёмая акрэсліла яе іначай: «Я спытала ў маці: «Мо і табе купіць кручок і ніткі? Будзеш таксама, як баба старая, вязаць», а маці кажа: «Не, я да такога яшчэ не дайшла». І меўся на ўвазе не толькі ўзрост. Сказанае сведчыла — і словам, і тонам — пра грэблівасць да такога занятку і непавагу да жанчын, якія аддаюць яму свой вольны час.

Інакш кажучы, мне трэба было ціхенька маўчаць, што і я вяжу кручком, раблю гэта з ранняга дзяцінства, дагэтуль губляю рытомнасць у прысутнасці карунак ручной работы і лічу іх падставай для гонару. Я і маўчала. Толькі не з той прычыны. Проста не палічыла патрэбным нешта тут каментаваць.

...Ёсць жанчыны, якія назаўсёды застануцца для мяне таямніцамі. Назіраю за імі — і дзіву давацца не перастаю. Дзеці іх (нешматлікія, хутчэй адно) ужо выраслі, ад дома адышлі, хоць сем'яў сабе не прыдбалі (што таксама пра нешта ды сведчыць), таму ні сабою, ні ўнукамі не турбуюць. Падаконнікі ў кватэрах гэтых жанчын кветкамі не застаўлены і часу, значыць, таксама не забіраюць. Як не забірае яго гатаванне ежы: такія жанчыны і рэцэптамі не цікавяцца, і шафкі ў кухні формамі для выпечкі не абцяжараны. Яны, таксама заўважана, па тэатрах і музеях не ходзяць, багемны лад жыцця не вядуць. І не з'яўляюцца працагалічкамі: на працы да ночы не прападаюць, а так — абы дзень да вечара. І вось што яны робяць, прыйшоўшы дамоў?! Таямніца, якую не разгадаць!

■ Паміж намі

НУ, НЕ АПАЛОН...



ВОСЬ так заўсёды. Калі ты ні з кім не хочаш размаўляць, з табой чамусьці хочуць усе. Разгар працоўнага дня, чарговы тэлефонны званок... Здымаю трубку і чую:

— Выходзь за мяне замуж!

Ну канешне, як я магла забыць? Пасля апошняй зробленай падобным чынам прапановы прайшоў амаль што год. Усяго іх (прапаноў) было, здаецца, пяць. Без уліку сённяшняй, зразумела.

— Не магу.

— Чаму?

— Таму што, па-першае, я цябе не кахаю. А па-другое, у мяне ўжо ёсць муж, і ты пра гэта цудоўна ведаеш.

— Ведаю. Пашанцавала ж мярзотніку!

— Чаму мярзотніку?

— Таму што гэта не я.

...Колькі гадоў мы паўтараем гэту бессэнсоўную размову.

— Калі я магу патэлефанаваць табе зноў?

— Праз год.

— У мяне з'явіцца шанц?

— Надзея памірае апошняй, — адказваю я і кладу трубку.

Трэба ж быць такім настырным! Хаця... Хіба раней ён паводзіў сябе інакш?

...СТАЯЎ не па-асенняму цёплы верасень. Народ па вечарах высыпаў на вуліцу ў шортах і майках, а на кожным рагу цалаваліся закаханыя парачкі.

На задняй пляцоўцы аўтобуса было малалюдна. Я павярнулася спінай да праходу і ўставілася ў акно. Праз пару хвілін увагу прыцягнуў дзіўны аб'ект — чорны «фольксваген».

У самім аб'екце, праўда, нічога незвычайнага не было. Дзіўным падалося тое, што «фольксваген» увесь час ехаў непасрэдна за аўтобусам, паўтараючы яго маршрут і прытарможваючы на прыпынках. Раптам аўто міргнула фарамі. Потым яшчэ і яшчэ раз...

На прыпынку я выйшла, краем вока заўважыўшы чорны аўтамабіль, у якім ужо адчыняліся дзверкі.

— Вы заўсёды імкняцеся збегчы ад лёсу?

Ён дагнаў мяне і пайшоў побач. «На маньяка не падобны», — падумала я з палёгкай. Аднак да Алена Дэлона майму спадарожніку таксама было далёка. Невысокі, грузнаваты, лысаваты, з жывоцікам... Пасля вымушанай прабежкі яго твар пачырваненаў і пакрыўся кропелькамі поту. Мужчына папрасіў прабачэння, дастаў насоўку і пачаў выціраць твар... Я пашкадавала яго і збавіла хуткасць.

Ён быў роўна на дваццаць пяць гадоў старэйшы за мяне. І імя такое старамоднае — Міраслаў.

— Я ні на што не прэтэндую, — сказаў сур'ёзна. — Проста мне хацелася б, каб мы хоць зрэдку бачыліся.

— А як жа ваша жонка? — пацікавілася я проста так.

— Мы разышліся тры гады таму. Яна пайшла да іншага мужчыны, дзеці жывуць асобна. Так што я — зайздросны халасцяк з жылплошчай.

Я паглядзела на яго са шкадаваннем, падумаўшы, што ні кватэра, ні іншыя атрыбуты не дапамогуць яму дабіцца пастаўленай мэты. Праўда, адчуваць яўную сімпатыю і нават захапленне з боку мужчыны, які тое-сёе пабачыў у жыцці, было ўсё ж прыемна. І калі ён дастаў сваю візітную картку, я, доўга не думаючы, узяла яе і паклала ў сумачку, у патайную кішэньку.

Урэшце, што я страчвала? Муж ужо цэлы год круціў раман з дваццацігадовай студэнткай, не надта абцяжарваючы сябе прыдумляннем больш-менш праўдападобных версій сваёй пастаяннай адсутнасці. А мне... Мне да смерці хацелася закахацца, я не магла жыць паўнацэнным жыццём, не адчуваючы сябе камусьці патрэбнай. І час ад часу ціхенька прасіла ў таго, хто распараджаецца лёсамі і пачуццямі: «Гасподзь, ну пашлі мне хоць каго-небудзь, каб свет не здаваўся такім шэрым!»

Між тым даўно заўважана: калі прасіць аб чым-небудзь вельмі шчыра і вельмі заўзята, то, хутчэй за ўсё, жаданае атрымаеш. Іншая справа, што, можа, не адразу атрымаеш, а крыху пазней (пакуль там, у нябеснай канцылярыі да цябе чарга дойдзе!..) Ты, можа, і забыцца паспееш пра сваё жаданне, а яно — раз! — і спраўдзіцца. І ўжо быццам бы не патрэбна табе тое, без чаго раней жыць не мог, а ўсё роўна будзь ласкавы — вазьмі. Можа, у наступны раз тройчы падумаеш, перш чым заказы наверх пасылаць.

ЗДНЯ гэтай сустрэчы маё жыццё перамянілася. Я ператварылася сама меней у багіню. Кожную раніцу Міраслаў (ці проста Слава) адвозіў мяне на працу і кожны вечар адтуль забіраў. Па дарозе, калі ў мяне былі час і жаданне, мы заязджалі кудынебудзь павячэраць — у піцэрыю ці невялікі рэстаранчык. Міраслаў баяўся, што я буду з ім сумаваць, і стараўся забаўляць мяне з усіх сіл. Купляў білеты на канцэрты заезджых «зорак», прывозіў з камандзіровак кнігі навамодных аўтараў, а часам проста вазіў па вячэрнім горадзе, расказваючы цікавыя гісторыі пра вулачкі і завулкі свайго (чаго грахі таіць — далёкага) юнацтва.

Я разумела: ён хоча мяне прыручыць. Павольна і паступова, дзень за днём, крок за крокам запаўняючы сабой маё жыццё, парушаючы мае правілы, навязваючы мне ўласны расклад.

Ён не патрабаваў удзячнасці, хоць відавочна чакаў яе. А я рабіла ўсё для таго, каб адцягнуць момант расплаты. І кожны дзень прачыналася з надзеяй, што, магчыма, сёння ў маім сэрцы праклюнуцца кволыя парасткі закаханасці.

Дарэмна... Сэрца ніяк не хацела рэагаваць на заклікі розуму, а без гэтага маё цела заставалася «мёртвым». Адданасць, закаханасць свайго прыяцеля я магла ўсяго толькі ацаніць. Адказаць жа на іх, на жаль, была не ў стане.

Ён успрымаў мае пастаянныя адмовы на дзіва спакойна (уяўляю, чаго яму гэта каштавала). У нашых адносінах нічога не мянялася. Слава служыў мне, як верны васал сваёй гаспадарыні, просячы толькі аб адным — не пакідаць яго, прымаць як данасць, дазваляць яму няньчыцца са мной заўсёды, калі мне гэтага захочацца (у яго ж гэтае жаданне не знікала ніколі).

...АДНОЙЧЫ, калі мы без усялякай мэты блукалі па вуліцы і ён цярпліва тлумачыў мне, як трэба разумець сэнс рамана Маркеса «Сто гадоў адзіноты», у мяне нечакана зламаўся абцас. Нядоўга думаючы, мой спадарожнік падхапіў мяне на рукі і, не звяртаючы ўвагі на здзіўленыя позіркі прахожых, панёс да бліжэйшай майстэрні. Там, аддаўшы боцікі ў тэрміновы рамонт, пасадзіў мяне ў крэсла і ўхутаў ногі сваім шалікам.

Што павінна была зведаць пасля ўсяго гэтага жанчына? Правільна, пачуццё пяшчоты і ўдзячнасці. Я ж адчула толькі віну за тое, што не магу адказаць яму чымсьці падобным. Магчыма, ён памылкова прыняў маю вінаватасць за нешта большае, таму што на вуліцы спыніў таксі і сказаў вадзіцелю свой адрас. Мне ж было няёмка адмаўляцца...

Па сённяшні дзень адганяю ад сябе ўспаміны пра той вечар. Хоць нічога страшнага не адбылося. Ён паставіў на стол вазачку з цукеркамі, адкаркаваў бутэльку марціні. Папрасіў прабачэння, што не падрыхтаваўся да майго візіту па поўнай праграме — так нечакана ўсё атрымалася. Паставіў дыск з неназойлівай музыкай і... пачаў раздзявацца. У гэты кароткі прамежак часу я паспела падумаць пра адну вельмі цікавую рэч. Чаму ў жаночай дылеме — што лепш: кахаць ці быць каханай — заўсёды перамагае жаданне быць каханай? Першы ж псіхатэрапеўт скажа, што гэта сведчыць аб нізкай жаночай самаацэнцы і закамплексаванасці. Ды і з пункту гледжання фізіялогіі пры такой раскладцы вельмі няпроста дайсці да найвышэйшай кропкі самааддачы...

Ці варта казаць, што гэта было наша першае і апошняе блізкае спатканне? Вельмі хутка адносіны — па маёй ініцыятыве — увогуле звяліся да тэлефонных званкоў. Сяброўка спрабавала пераканаць мяне, што, калі б Міраслаў быў Апалонам Бельведэрскім, усё магло б скончыцца не так бяздарна. Маўляў, я не ацаніла яго шырокую натуру, таму што мне была патрэбна прыгожая абалонка.

Вось тут яна якраз памыляецца. Апалон не Апалон... Для закаханай жанчыны яе мужчына — нават самы апошні заморак — лепшы не тое што за Аполона, а нават за акцёра Дамагарава ці таго ж Роберта дэ Ніра. Калі ж не распаліўся ў жаночым сэрцы пажар, тут ужо ніякія формы і канфігурацыі не выратуюць.

І яшчэ. Каханага мужчыны ў нашым жыцці павінна быць роўна столькі, колькі мы самі можам яму дазволіць. І ні ў якім разе не больш. Інакш наступіць стойкая перадазіроўка.

...ЦЯПЕР на маім асабістым фронце ўсё ў поўным парадку! На работу і з работы езджу на грамадскім транспарце, абутак у рамонт нашу сама, за абеды ў кавярні разлічваюся з уласнай кішэні. І паверце, адчуваю сябе абсалютна шчаслівай. Святы ў асабістым жыцці, вядома, здараюцца, але не так часта, каб надакучыць. Зрэшты, гэта ўжо зусім іншая гісторыя.

Ала БЫВАЛАВА

■ З канверта

«СВАЯЦКІ» ТРОХКУТНІК

«Замуж я вышла, як мне здавалася, па каханні. Муж прывёў мяне ў трохпакаёвую кватэру, дзе, акрамя бацькоў, жыў яшчэ і яго старэйшы брат. Цэлы год усё ішло проста цудоўна, а потым Валеру (мужа) забралі на зборы. Па вечарах я сядзела дома, чытала ці вязала, а потым заходзіла ў пакой да яго брата, каб паглядзець які-небудзь фільм па камп'ютары (уласнага ў нас яшчэ не было).

Алег ласкава называў мяне сястрычкай, цікавіўся справамі на працы ды і ўвогуле даваў карысныя парады. Ён шмат дзе пабываў, многа бачыў, шмат чытаў. Дзяўчаты званілі яму кожны дзень, прыходзілі ў госці, але ніводная не затрымлівалася надоўга. У параўнанні з маім мужам ён здаваўся вельмі дарослым, самастойным. Не браў у бацькоў грошы на цыгарэты, не патураў капрызам маці...

Аднойчы Алег прапанаваў мне схадзіць з ім у кіно — проста так, па-сяброўску. Мы і бацькам пра гэта сказалі — што тут дрэннага? А калі ў зале выключылі святло, ён узяў мяне за руку і дзве гадзіны трымаў яе ў сваёй... Па дарозе дадому мы амаль не размаўлялі...

Калі ішла на вакзал сустракаць мужа — плакала. І потым усё валілася з рук. Трэба было гатаваць святочную вячэру, сядзець побач з Валерам за сталом, усміхацца... А я думала толькі пра адно — як цяпер будзе? Ці зможам мы з Алегам сустракацца па-за межамі дома? Як? Дзе?

З таго часу мінуў год... У нашых з Алегам адносінах нічога не змянілася. Калі ўсе дамашнія вяртаюцца з работы, мы іграем ролю «сваякоў», а як толькі ўсе за парог — кідаемся адно да аднаго ў абдымкі. А Валера ні аб чым не здагадваецца...

Часам мне становіцца брыдка ад самой сябе, ад нашага «сваяцкага» трохвугольніка. Але разарваць адносіны з Алегам не магу — ён стаў для мяне ўсім. Прызнацца мужу — значыць назаўсёды пасеяць паміж імі варожасць і недавер... Што рабіць — не ведаю...»

Юлія С., *г. Гомель*

■ У калектыве

ТОЛЬКІ ПРА ГЭТА — НІКОМУ!

Напэўна, кожнай з нас знаёмая сітуацыя, калі пры тваім з'яўленні на парозе кабінета калегі, якія толькі што гучна балбаталі, раптам спыняюць гаворку. Інтуітыўна ты пачынаеш думаць: напэўна, гэтыя людзі гаварылі пра мяне, а значыць, нешта са мной не так... Вядома, становіцца непрыемна. Іншая справа, калі на іх месцы знаходзішся сама: няма ж нічога дрэннага ў гутарцы з сяброўкай або знаёмай! Звычайны абмен інфармацыяй!

Цікавасць да людзей, што знаходзяцца побач з намі, цалкам натуральная, і мы хочам быць у курсе таго, што і з кім адбываецца. Да таго ж усіх і заўсёды нязменна прыцягваюць сакрэтныя рэчы, закрытыя і вельмі асабістыя тэмы. Плёткі па сваёй сутнасці — дзіцячая гульня ў сапсаваны тэлефон. Самае цікавае, што больш за ўсё станоўчых эмоцый выклікае няправільнае, моцна зменены слова ў канцы «звяна». Вось так і з інфармацыяй: пакуль яна перадаецца дакладна — гэта навіна, а як толькі мы прыўносім суб'ектыўныя дэталі — усё, можна лічыць, што пачатак плёцы пакладзены. Далей плётка абрастае як снежны ком, бо ўсім важныя падрабязнасці і дэталі. Дададзім яшчэ асабістую прадузятасць да пэўнай тэмы або персоны. На справе ўсё проста, як дзень: плёткі надаюць нашым зносінам жывасць, робяць іх больш яркімі і маляўнічымі.

Вядома ж, адно з месцаў, дзе плеткары і плёткі часта канцэнтруюцца ў вялікіх колькасцях, — гэта офіс. Новая сімпатычная (калі пляткараць мужчыны) ці «так, нічога асаблівага» (калі пляткараць жанчыны) супрацоўніца ў суседнім аддзеле, светлыя (ці не вельмі — гэта ўжо як вам пашанцавала) перспектывы кампаніі, чарговыя «геніяльныя» ідэі шэфа... Па большай частцы плёткі ў офісе — гэта падстава для камунікацыі і спосаб стварэння даверальных адносін. Яны запаўняюць інфармацыйны вакуум, а ў часы сур'ёзных змен накшталт скарачэння штату або змены кіраўніцтва служаць у літаральным сэнсе «энергетычным падсілкоўваннем» для супрацоўнікаў.

Што часцей за ўсё абмяркоўваюць на працы? Даследаванні выявілі лідараў «рэйтынгу». Аказваецца, мы не можам спакойна ўспрымаць:

ляноту калег;

тых, хто заўсёды трымаецца асобна;

кіраўнікоў, якія не могуць нармальна арганізаваць працу/своечасова выплаціць заробак/ацаніць таленты падначаленых (яшчэ 1000 пунктаў);

асабістыя адносіны на працы, прычым большасць жанчын лічаць, што асабістая тэма — самая «гарачая» для абмеркавання.

Дарэчы, для ўмелага і вопытнага кіраўніка плёткі — гэта крыніца інфармацыі аб пачуццях і думках радавых супрацоўнікаў. Для звычайнага ж супрацоўніка гэта асабісты офісны «радар», які здольны папярэдзіць пра важныя перамены на месцы працы яшчэ да таго, як пра іх стане вядома з афіцыйных крыніц. Зразумела, нельга ўспрымаць інфармацыю, якая перадаецца такім чынам, літаральна. Плётка — гэта намёк. Не прымушэнне да дзеяння, але сігнал аб магчымай небяспецы або, наадварот, спрыяльнай сітуацыі.

Калі плётка можа нашкодзіць? Як правіла, тады, калі гэтага хочуць самі плеткары. У такім выпадку нечая падмочаная рэпутацыя — гэта толькі вяршыня айсберга. Непрыемныя плёткі раз'ядноўваюць калектыў і руйнуюць тое, што могуць умацаваць плёткі незласлівыя — атмасферу даверу. Часам некаторыя плёткі могуць стаць нават падставай для звальнення. Так што будзьце асцярожныя. На ўсялякі выпадак прывядзем некалькі парад адносна таго, як пляткарыць «бяспечна»:

калі ўжо ў вас ёсць цяга да абмеркавання іншых людзей і іх учынкаў, рабіце гэта час ад часу, але не занадта часта і не з кім папала;

не пераказвайце занадта часта плёткі, якія даўно ўжо шпацыруюць па офісу, інакш вас могуць прыняць за іх аўтарку;

можаце слухаць тое, што кажуць калегі, але самі па магчымасці гаварыце мала; прытрымвайцеся прынцыпу: усё, што вы скажаце, можа быць паўторана, таму памятайце пра наступствы;

перш чым пераказаць плётку, задумайцеся аб матывах таго, хто яе пусціў;

ніколі не распаўсюджвайце агідныя звесткі, інфармацыю, якая ганьбіць і прыніжае;

калі неасцярожнае слова пакрыўдзіла вашу калегу, лепш адразу шчыра прызнайцеся, што незнарок прамовілі яго менавіта вы, і папрасіце прабачэння.

Псіхолагі высветлілі, што існуюць прафесіі, у якіх лёгка перайсці тонкую мяжу паміж працай і пляткарствам. У групе рызыкі апынуліся настаўнікі, урачы, журналісты, сацыёлагі, а ў першую чаргу — самі псіхолагі. Калі вам пашчасціла быць прадстаўніцай адной з названых прафесій — не страчвайце пільнасці: магчыма, у гэты самы момант ваша калега дадумвае нешта цікавае пра вас...

Міра КРАВЕЦ

■

Увага, вы ў пастцы!

10 прычын, якія не павінны ўтрымліваць жанчыну ў нешчаслівым шлюбе

На жаль, не заўсёды людзей аб'ядноўвае каханне. Не менш моцныя пачуцці, якія збліжаюць, — страх, карыслівасць, няўменне жыць у адзіночку, залежнасць ад бытавога камфорту. Але шчаслівай сям'і на такіх пачуццях не пабудуеш. Адчуваеце, што гэта пра вас? Набярыцеся смеласці пачаць жыццё нанова: хутчэй за ўсё, вы і самі ўжо зразумелі, што рана ці позна давядзецца гэта зрабіць, але яшчэ чакаеце цуду!

1. Усё не так ужо і дрэнна

У адносінах шмат што неадназначна — інакш рашэнне аб сыходзе было б вельмі проста прыняць. Але што пераважвае — станоўчае ці адмоўнае? Калі вы фармулюеце сітуацыю менавіта як «Не так ужо і дрэнна», хутчэй за ўсё, справы ідуць кепска, проста яшчэ «не настолькі». Многія людзі, асабліва жанчыны, вельмі цярплівыя, таму «настолькі» надыходзіць ужо ў крайнім выпадку — напрыклад, калі справа даходзіць да хатняга гвалту. «Не так ужо і дрэнна» азначае, што вы яшчэ ўкладваеце жыццёвыя сілы ў цярпенне.

2. Уся справа ў грошах

Грошы, бадай, ключавая з прычын, якія ўтрымліваюць людзей разам літаральна сілай: тых, хто зусім не блізкія адно аднаму, тых, хто даўно разлюбілі, хто расчараваўся ў адносінах і наогул у самой ідэі сям'і. Ці сапраўды людзі пры гэтым атрымліваюць больш, чым страчваюць? Сужыццё з нялюбым чалавекам дзеля грошай — гэта пастаянны стрэс, які адбірае душэўныя сілы нават у самага беспрынцыпнага цыніка. Вядома, каб адмежавацца ад фінансавай падтрымкі і знайсці шляхі забяспечваць сябе самастойна, давядзецца і папрацаваць, і пацярпець нястачы — а гэта таксама стрэс. Але ён не будзе бясконцым: рана ці позна вы знойдзеце спосаб забяспечыць сабе тое жыццё, якое хочаце. А нервовае і маральнае знясіленне ад жыцця з нялюбым (а яшчэ горш — абрыдлым) не скончыцца ніколі: яно будзе толькі ўзмацняцца і ўрэшце прывядзе да нянавісці.

3. Хоць вы і не шчаслівыя, але вам камфортна

«На свеце шчасця няма...» — жанчыны здольныя паўтараць гэта самі сабе гадамі, але, на жаль, у гэтым радку гаворка ідзе зусім не пра адносіны. Сэнс і мэта адносін зусім не ў тым, каб сумесна выжываць у жорсткім свеце і спраўляцца з бытавой руцінай. Зразумела, гэта нядрэнна, але толькі калі вы шчаслівыя. Калі вы не адчуваеце ні намёку на шчасце і вас утрымлівае толькі бытавы камфорт — не старайцеся захаваць усё як ёсць. Жыццё кароткае, і час не вярнуць назад: праз шмат гадоў вы выявіце тое ж самае — вам жывецца камфортна, але вы нешчаслівыя. Вось толькі з гадамі такое ўсведамленне становіцца ўсё больш і больш горкім.

4. Разам дзеля дзяцей

Безумоўна, «дзіцяці патрэбен бацька». Але сучаснасць бярэ сваё: сёння развод — не жахлівая рэдкасць, а разнавіднасць нормы. І многія дзеці, якія выраслі ў няпоўных сем'ях, так расказваюць пра сваё сталенне: «Так, мне не хапала бацькі (або маці), і ўсё ж у мяне было шчаслівае дзяцінства: я быў акружаны клопатам і любоўю аднаго з бацькоў, і гэта было значна лепш, чым назіраць сваю поўную сям'ю да разводу — вечныя скандалы, крыкі, слёзы». Падумайце, што больш патрэбна вашаму дзіцяці: галачка насупраць пункта «поўная сям'я» ва ўяўнай анкеце дасягненняў ці ўсё ж спакойнае дзяцінства без пастаяннага стрэсу?

5. Мяне ніхто ніколі не пакахае

Нізкая самаацэнка — адна з самых папулярных прычын, якія ўтрымліваюць разам пары, якім даўно варта расстацца. Калі вашы адносіны доўжацца ўжо шмат гадоў, вам можа здавацца, што вы, як ніколі, далёкія ад свету знаёмстваў, флірту і какецтва — асабліва на фоне праблем і канфліктаў у адносінах. І сапраўды, знаёміцца з новымі людзьмі будзе спачатку крыху дзіўна. Але не больш за тое. Вы самі здзівіцеся, як хутка вам зноў стане цікава з людзьмі, вернецца адчуванне ўласнай прывабнасці.

6. Вы баіцеся жыць самастойна

Яшчэ адна вельмі распаўсюджаная прычына, якой людзі часта тлумачаць сваё знаходжанне ў нешчаслівым шлюбе, — боязь адзіноты. Замест таго, каб заахвочваць свой страх і факусавацца на адмоўных баках адзіноты, падумайце лепш пра тое, якую палёгку вы адчуеце, і пра ўсе тыя рэчы, якія можа сабе дазволіць чалавек, калі ён адзін! Толькі ўявіце: нарэшце вы будзеце жыць з чалавекам, які заўсёды і ва ўсім згаджаецца з вамі — з самой сабой!

7. Вы баіцеся рэакцыі партнёра

Заставацца ў адносінах толькі таму, што ваш партнёр можа раззлавацца і прычыніць вам (ці самому сабе) шкоду — само па сабе ўжо зразумелы сігнал, што вы ў пастцы і трэба з яе неяк выбірацца. Чым даўжэйшымі будуць гэтыя адносіны, тым горш яны закончацца для вас. Баіцеся за сябе? Сыходзьце раптам, без папярэджання, і не сустракайцеся пасля з пакінутым партнёрам сам-насам. Баіцеся, што гэты чалавек нанясе шкоду сам сабе? Папярэдзьце членаў яго сям'і перад сваім адыходам.

8. Вы не хочаце пазбыцца былога каханага

Здараецца, што мы шчыра клапоцімся аб кімсьці і зычым яму толькі дабра, але ўсё ж не хочам працягваць з ім адносіны. Гэта складаная сітуацыя, і сыходзіць у такіх абставінах вельмі цяжка. Але варта падумаць і пра асабістае шчасце: хто паклапоціцца аб ім, акрамя вас?

9. Ваш саюз ухваляюць усе навакольныя, і вы не адважваецеся пярэчыць

Складана бывае пайсці насуперак грамадскай думкі: усе кажуць, што ён добры, значыць, можа, я памыляюся? Вашы родныя і вашы сябры могуць мець рацыю, але вы зусім не абавязаны з гэтым цудоўным чалавекам жыць! Стараннія людзі бачаць толькі вонкавы бок характару, і яны проста не могуць аб'ектыўна ацаніць тых прычын, па якіх ваш саюз прыйшоў да непазбежнасці разрыву. Таму не варта кіравацца іх думкамі. Жыццё ж ваша, і каму, як ні вам, ведаць, чаму ўсё складаецца менавіта так і што з гэтым рабіць.

10. «Ён зменіцца»

Такая ўстаноўка прымушае нас дзесяцігоддзямі чакаць цуду — і адчуваць спусташэнне, бо цуд раз за разам не адбываецца. У чым жа справа? Яму ж варта толькі зразумець, якая вы няшчасная праз яго паводзіны, і ён адразу стане іншым чалавекам, каб вас ашчаслівіць! На жаль, гэта не дзейнічае. Насамрэч ваш партнёр усё цудоўна бачыць і разумее. Ён проста не можа змяніцца: ён такі, які ёсць, такім і застанецца. Калі разумееце, што ніколі з гэтым не зміры цеся — значыць, у такіх адносінах вы толькі марнуеце свой час.

Вера ФЕМІНА.

Суботнік з ВОЖыкам

Каб хацеў, не прыдумаеш

Кірзавыя боты — твар салдата!

Дарэчы, усе паперы вы складаеце з граматычнымі памылкамі. Думаеце, калі я сам не разбіраюся, дык не ведаю? Мне іншыя гавораць!

(З выступленняў).

У нашай краме вялікі выбар аксесуараў для валасоў ручнога вырабу.

Прадаецца натуральнае футра жонкі з капюшонам.

(З аб'яў).

Выдзеліць грошы для асвятлення вуліц, аб'ектаў і іншых мерапрыемстваў.

(З пастановы).

За работу вас чакае ўзнагароджанне. Калі не фінансавае, то ў выглядзе прызнання ў каханні.

(З гараскопа).

Каб не выходзіць з хаты з пустымі рукамі, ён прыхапіў шафу, ложак, стол і два крэслы.

(З пратакола).

З 90-годдзем, дарагая бабуля! Зычым, каб збыліся ўсе мары тваіх любімых унукаў!

(З віншавання).

Запісаў Міхась СЛІВА, *г. Рагачоў.*

Ліст шчасця

Гісторыйка

Генадзь, вопытны электроншчык, ехаў раз на сваёй машыне праз тунэль, у якім былі ўсталяваны камеры фотафіксацыі парушэнняў хуткаснага рэжыму. Мужчына пільна сачыў за спідометрам і «трымаў стрэлку» нават ніжэй дазволенага значэння. Але мінаючы пункт фіксацыі, ён заўважыў зыркае святло фотавыбліску. «Як жа так! — уголас здзіўлена прамовіў Генадзь. — Як яны абсталяванне наладжваюць? Ну, я ім зараз пакажу!»

Мінуўшы тунэль, мужчына вырашыў вярнуцца на зыходную пазіцыю. На гэты раз ён праехаў каля камеры на хуткасці ўжо на дзесяць кіламетраў у гадзіну ніжэйшай за максімальна дазволеную. І зноў убачыў фотаўспышку!

Нервова зарагатаўшы, Генадзь паўтарыў манеўр, праехаўшы міма камеры з хуткасцю дваццаць кіламетраў у гадзіну (дазволена было, дарэчы, утрая больш). Але зноў убачыў выбліск. Ён вырашыў не марнаваць свой час, супакоіўся і накіраваўся дадому. Усю дарогу ўяўляў, як абсмяе тых «даішнікаў», што будуць штрафаваць яго па выніках няякаснай фотафіксацыі.

...Генадзь быў вельмі збянтэжаны, калі праз некалькі тыдняў да яго прыйшоў «ліст шчасця». У ім прапаноўвалася аплаціць ажно тры штрафы за тое, што ён не карыстаўся рэменем бяспекі...

Сяргей ЛАПЦЁНАК, *г. Мінск.*

Сямейны дэтэктыў

Жонка кажа:
«Так хацела б
Ведаць я, Вадзім,
Чым займаешся ты
дома
Без мяне, адзін?
Сябрукі твае —
ні слова,
І сусед маўчыць...
Давядзецца мне
за праўду
Кумцы заплаціць».
— «Без
праблем! —
ідзе ў атаку
Муж на гэта сам. —
Даставай з кішэні
грошы —
Я і перадам!»

Рыгор ЕЛІШЭВІЧ.

АНЕКДОТЫ

Траўматолагі вельмі любяць спорт. За выключэннем хіба толькі шахмат.

* * *

— Мама, я пайшоў гуляць у футбол з сябрамі.

— Толькі праз мой суп!

* * *

Спорт не для мяне. Учора падчас гульні ў шахматы вывіхнуў сабе запясце, рэзка зрабіўшы ход канём.

* * *

— Любы, вазьмі нашага сына на футбол!

— Куды, ён жа яшчэ зусім маленькі...

— Ну дык навошта яму крычаць проста так?

* * *

— Ты гэты футбол любіш больш, чым мяне...

— Затое я люблю цябе больш, чым бабслей, мастацкую гімнастыку, сінхроннае плаванне і фігурнае катанне разам узятыя.

Пародыі

Я і ты

Я на цябе глядзеў,
Ты на мяне глядзела.
Нечага я хацеў,
Нечага ты хацела.

Янусь МАЛЕЦ.

Я цябе абдымаў,
Ты мяне абдымала.
Нечага я чакаў,
Нечага ты чакала.
Я цябе цалаваў,
Ты мяне цалавала.
Любай цябе называў,
Ты мяне не назвала.
Я маўкліва застыў,
Толькі ты
не маўчала:
— Хіба зусім забыў?
Я не Люба, я Ала!

Анатоль ЗЭКАЎ.



Малюнак Анатоля ВАСІЛЕНКІ («Перац», 2004 г.).

— А чаму начальства ездзіць за чорным шклом?
— Каб ні вёскі, ні нас, ні праблем не бачыць!

Нічыпар ШЭРАНЬКІ

Кангрэс

Байка

Авечку нейк у лес
Пазвалі на кангрэс.
Кангрэс той быў не
просты —
міжнародны.
Вучоныя мужы —
Ваўкі, Мядзведзі, Лісы ды
Вужы —
Павінны гаварыць былі
пра час, ва ўсім
выгодны
Для існавання тых,
Чыя адвеку доля
Закускай на стале быць,
І не болей.
А для чаго Авечка
прыдалася?
Каб ціхая пакорная, яна
На форуме высокім
паклялася,
Што ўсцешаная доляю
спаўна,
Што ёй ад нараджэння
гэтак любы
І кіпцюры драпежнікаў,
і зубы.
Воўк, мадэратар, калі ўсё
звяр'ё
Сказала пра балеснае
сваё,
З усмешкаю Авечку
прыгадаў
І ёй, душэўна-чулай,
слова даў.
Ды тая з апантанасцю,
запалам
Распавядаць крытычна
пачала
Пра тое, колькі ёй
прынеслі зла
Клыкі Ваўкоў.
Кампанія такога
не чакала.
І хоць Авечка з'едзена
была,
Ды моцна зграі нервы
патрапала.

г. Мінск.

АМАЛЬ З НАТУРЫ

Навігатар

Глухая вёска. Па разбітай дарозе паўзе джып. Мінае апошнюю, скасабочаную хату, парослую мохам, упіраецца ў паркан, за якім яр, ды замірае.

Дзве бабулькі сядзяць наводдаль на бервяне.

— Бач, Міхайлаўна, яшчэ адзін з навігатарам!

Выгада

Калі вы прачыталі аб'яву «Купляйце зараз! Выгада — 10 тысяч», то памятайце: гаворка ідзе не пра вашу выгаду.

Алег ДУБІНКА,
г. Дунаеўцы,
Хмельніцкай вобласці.

Пераклад з украінскай Ганны КІСЛУШЧАНКІ.

Извещение о проведении 30 августа 2016 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Минскремстрой»

Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение продаваемого имущества)	«Административно-хозяйственное здание Литер А 1/к» общей площадью 612,4 кв. м (инв. номер в ЕГРНИ 500/С-8620; назначение – здание административно-хозяйственное), теплосети (инв. №300992), электросети (инв. №300994), водопроводные сети (инв. №300995), канализационные сети (инв. №300993), асфальтовая площадка (инв. №200997)
Местонахождение предмета торгов	г. Минск, ул. Гикало, д. 22Б
Сведения о земельном участке	Кадастровый номер 500000000008000726, площадь – 0,1002 га; назначение – эксплуатация и обслуживание административно-производственного здания
Сведения о продавце	ОАО «Минскремстрой», ул. Интернациональная, 5, 220030, г. Минск, телефон (017) 226-41-15
Сведения об организаторе торгов	Государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, телефон (017) 327-05-62
Начальная цена предмета торгов с учетом НДС	1 125 591,20 белорусских рублей (11 255 912 000 белорусских рублей образца 2000 года)
Условие торгов	Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию документа, подтверждающего внесение задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в торгах.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **30 августа 2016 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 04.08.2016 по 26.08.2016 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 200-99-78, (029) 350-46-23 (ОАО «Минскремстрой»).

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	**ОАО «Реммех»,** 220024, г. Минск, ул. Бабушкина, 48. Тел: +375 (17) 291-83-47

Предмет аукциона

Транспорт, спецтехника и оборудование, расположенные по адресу: г. Минск, улица Бабушкина, 48, в составе:

Номер лота	Инв. номер	Наименование	Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС	Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС
1	5844	**Автомобиль МАЗ-54328**	1 507,20 (15 072 000)	76,00 (760 000)
2	596	**Автомобиль МАЗ-6422 А5-322 (рег. Знак АК 3197-7), 2010 г.в.**	12 069,60 (120 696 000)	650,00 (6 500 000)
3	579	**Автомобиль MD 1042 (рег. Знак АК 4469-7), 2008 г.в.**	4 588,80 (45 888 000)	230,00 (2 300 000)
4	595	**Автомобиль Skoda Superb (рег. Знак 9359 МІ-7), 2010 г.в.**	15 446,40 (154 464 000)	775,00 (7 750 000)
5	5817	**Автомобиль ГАЗ-3110**	259,20 (2 592 000)	13,00 (130 000)
6	5723	**Полуприцеп APS 552600 (рег. Знак А 9664 А-7), 2012 г.в.**	13 299,60 (132 996 000)	665,00 (6 650 000)
7	4696	**Прицеп 2ПТС-4 (рег. Знак МЮ 0038), 1989 г.в.**	1 246,80 (12 468 000)	63,00 (630 000)
8	11023	**Автопогрузчик**	3 218,40 (32 184 000)	161,00 (1 610 000)
9	-	**Трактор Т-170Б**	29 500,00 (295 000 000)	1500,00 (15 000 000)
10	4027	**Комплект вытяжных устройств «Лиана»**	608,40 (6 084 000)	31,00 (310 000)
11	5125	**Ножницы гильотинные НК 3121**	4 974,00 (49 740 000)	250,00 (2 500 000)
